№ 39 (397) 22 кастрычніка 2004 www.nn.by

Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

Бутафорскі рэфэрэндум
«Тут 1428 і там 1428». старонка 5

Выйдуць ці ня выйдуць
Таемныя спружыны 17 кастрычніка. старонка 6

«Столькі было й ня трэба»
Фарс замест падліку галасоў. старонка 4

Прозьвішча «Рамашчанка»
я запомню назаўсёды. Спорт. старонка 11

Славамір Адамовіч
Памяці Івана Шамякіна. старонка 9

PHOTO.BYMEDIA.NET

Ня згінем

Максім Танк

Ня плач

Ня плач, наш дзень настане,
Хоць адступілі ўчора.
Зацісьні моцна рану!
Хай не сьмяецца вораг!

Выходзьце на дарогу,
Ў паход шчыльней радамі!
Ты ведай, перамога
Ужо не за гарамі.

І вер, што блізка мэта,
Удары грому спынім.
Ня згінулі дагэтуль —
І ў бітве мы ня згінем!
1936

Спаўзаньне ў Азію

Ад Рэдакцыі

17 кастрычніка паказала, што беларусы ня нацыя рабоў. Людзі думалі, перш чым галасаваць, грамадзтва палітызавалася і мабілізавалася. Яно прагна цікавіцца нацыянальнай палітыкай. Але з нацыі падманутых лёгка ператварыцца ў нацыю падманшчыкаў.

Выбараў больш ня будзе. Маралі ў палітыцы ня будзе. Спадзеваў на Расею ня будзе. Усё гэта зразумела было ад 1996 году. Ня ўсім, на жаль.

Магчыма, прэзыдэнт насамрэч праўдамі і няпраўдамі дабіўся таго, што большасьць прагаласавала «за». Але пасьля 17 кастрычніка ў гэта не паверыць і частка тых, хто вывеў «за» — прынамсі 70 тысяч сяброў выбарчых камісій. Беларусь разьвіталася з ілюзіямі аб дэмакратыі і з ілюзіяй, што маем няхай грубае і неталенавітае, але самае сумленнае кіраўніцтва ў СНД. Адгэтуль улада будзе трымацца на дубінках «амонмакутаў». Людзей ужо запалохваюць пра запас (пра падзеі 19 кастрычніка — **старонкі 3, 7**).

17 кастрычніка быў дзень разьвітаньня з надзеямі на паступовае набліжэньне Беларусі да стандартаў эўрапейскай дэмакратыі. Так раней праходзілі выбары толькі ў Азэрбайджане. Здаецца, у вялікіх гарадах і галасоў не лічылі. Не дапамог бы ні байкот, ні ўдзел, вось у чым пятрушка. Толькі выхад людзей на вуліцы мог ураўнаважыць псыхалягічны ціск на сяброў камісій з боку ўлады. Але беларусы рэдка выходзяць на вуліцы… Мы хатняя нацыя… І сытуацыя ў грамадзтве не рэвалюцыйная.

Працяг на старонцы 2.

Што зараз будзе і што рабіць

Адказваюць палітыкі і дзеячы культуры

Зянон Пазьняк, старшыня Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ: Трэба доўгая асьветная праца

Што цяпер? Першае. Трэба хутка сабраць усе факты парушэньняў закону і прадставіць у міжнародныя арганізацыі, якія назіралі за галасаваньнем. Важна, каб міжнародная супольнасьць не прызнала рэфэрэндуму. Другое. Не дапусьціць міжнароднай ізаляцыі Беларусі. Трэба прапанаваць плян ізаляцыі рэжыму, але ня нашай краіны.

Працяг на старонцы 3.

Дык падпісвайся

«Наша Ніва» — незалежная крыніца інфармацыі і грунтоўны аналітык беларускага жыцьця на 16 старонках. Атрымлівай газэту сваёй душы, газэту без чужога слова штотыдзень. Падпісны індэкс 63125. Цана падпіскі на месяц — 2700 рублёў на поштах або 1500 рублёў на шапікі «Белсаюздруку» ў Менску.

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

21 кастрычніка ў Палацы культуры вэтэранаў (Я.Купалы, 21) — вялікі сольны канцэрт Зьмітра Вайцюшкевіча «Лепшыя і новыя песьні». Пачатак а 19-й.

Спаўзаньне ў Азію

Працяг са старонкі 1.

Палітыкаў у краіне засталося больш, чым палітыкі. Адны праціўнікі Лукашэнкі далёка бачаць, другія добра выступаюць, трэція маюць сувязі зь бізнэсам, а чацьвертыя валодаюць замежнымі мовамі. Каб усё разам, такога няма. Таму ў наступныя гады больш будзе залежаць ад стойкасьці дзесяці тысяч сьмелых, а не ад палітыкі.

Людзі пачуваюцца прыніжанымі і бясьсільнымі. Але падумайце: упершыню махляры вымушаныя былі пайсьці на масавыя фальсыфікацыі.

У грамадзтве з двайной маральлю, у якім ня веюць вятры свабоды, лёгка заводзіцца іржа. З нацыі падманутых лёгка ператварыцца ў нацыю падманшчыкаў. Перад нацыянальнай інтэлігенцыяй устае задача, вышэйшая над палітычнаю — захаваньне маральнае і эстэтычнае альтэрнатывы.

Гэта нашы першыя высновы, у наступным нумары дамо слова палітычным аналітыкам.

Не засталося ілюзій, ня трэба і дэпрэсіі. Рэдакцыі «Нашай Нівы» аптымізму надало тое, што на нашу просьбу аб падтрымцы адгукнулася аж 47 чалавек і арганізацый, ня ўсім зь якіх выпадала падзякаваць. Яшчэ раз нізка схіляемся перад імі. Радыя паведаміць, што 1 студзеня 2005 году газэта пачне выходзіць на 24 старонках штотыдзень.

Скасаванае рашэньне па «Рэгіянальнай газеце»

Міністэрства інфармацыі аднавіла выхад маладачанскай «Рэгіянальнай газэты». Рэдактар маладачанскага выданьня зьвязвае гэта зь дзясяткамі чытацкіх лістоў, адпраўленых на адрас Мінінфа.

А вось галоўны рэдактар ваўкавыскай «Местной газеты» Андрэй Шантаровіч 20 кастрычніка абвясьціў галадоўку, пратэстуючы супраць прыпыненьня на 1 месяц свайго выданьня. Шантаровіч кажа, што ў Мінінфармацыі яму абяцалі скараціць тэрмін прыпыненьня, калі ён напіша «пакаянны ліст».

АШ

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

Народны збор грошай на помнік Васілю Быкаву

2 лістапада а 17-й гадзіне на Ўсходніх могілках адбудзецца адкрыцьцё помніка Васілю Быкаву. На могілках будуць таксама збіраць сродкі на помнік. Пакуль яшчэ не хапае 1 млн 700 тыс. рублёў, каб кампэнсаваць затраты на дастаўку і ўстаноўку.

Сустрэча беларускай моладзі ў ЗША

У праграме эксклюзіўны канцэрт Лявона Вольскага. Любімыя і новыя песьні, задушэўныя размовы.

Папярэдняя рэгістрацыя абавязковая. У лісьце на электронны адрас lobay@tut.by пазначце імя, прозьвішча, тэлефон для сувязі і горад, дзе жывяце.

МУЗЫКА

«Бумэранг» забароненых

Напярэдадні рэфэрэндуму ў Менску зьявіўся дыск, аздоблены ў стылістыцы сац-арту, на якім сабраны песьні беларускіх гуртоў, што падпалі пад забарону ў роднай краіне. Назва сымбалічная — «БУМэранг». Рокеры стварылі Беларускую унію музыкаў і распаўсюдзілі адкрыты ліст, у якім выказалі абурэньне з нагоды забаронаў: «Мы адчуваем сябе так, нібыта нам зьвязалі рукі, паставілі «на пальчыкі» і накінулі на шыю пятлю. Нібыта і не павесілі, але і жыцьцём гэта не назавеш», — заявілі Алег Хаменка, Філ Чмыр, Лявон Вольскі, Аляксандар Кулінковіч.

Першы наклад у 2000 асобнікаў прывёз з Масквы журналіст Павал Шарамет. Грошы на выданьне сабралі хутка — за два тыдні дыск ужо быў выдадзены на сродкі маскоўскіх беларусаў.

На дыску 14 трэкаў, пераважна вядомыя творы — «Тры чарапахі» «N.R.M.», «Скрыпка дрыгвы» «Нэйра Дзюбелю», «Цуд на Каляды» Памідорава і інш. Альбом уключае адкрыты ліст музыкаў, хроніку забаронаў, караценькую гісторыю гуртоў з фатаздымкамі.

Гэты наклад можна лічыць «сыгнальным»: плянуецца, што выйдзе складанка, дапоўненая іншымі трэкамі і мультымэдыя-кантэнтам.

Сяргей Будкін

Гутарка зь Лявонам Вольскім — **старонка 7**. Гутарка з Аляксандрам Кулінковічам — **старонка 12**.

Каго любіш?

Віцебская фабрыка «КІМ» сёлета выпусьціла некалькі новых саколак з малюнкамі патрыятычнага зьместу. Адны зь іх маюць стылізаваны надпіс «Я люблю Беларусь» на фоне абрысаў нашае краіны, на другіх прыведзены словы з клясычнага твору «Сымон-музыка», на трэціх — словы «Купляйце беларускае», «Made in Belarus» ды інтэрнэт-адрас прадпрыемства. Напачатку дзеля выказваньня патрыятычных ідэй віцебскія дызайнэры абышліся без выкарыстаньня колераў цяперашняга сьцяга, але потым выява абрысаў Беларусі на адной з новых мадэляў раптам стала зялёнай. Іншыя паведамленьні з усёй краіны — старонка 11.

СЯРЖУК СЕРАБРО

IN MEMORIAM

Уладзімер Міхнюк

Пра Ягоную сьмерць мне паведаміў адзін гісторык і палітык у дзень рэфэрэндуму. Я прапанаваў быў гэтаму чалавеку пабіцца аб заклад, што на выбарчыя ўчасткі «прыйдзе» 80% надзеленых правам голасу грамадзянаў і 75% зь іх «прагаласуюць» за папраўку ў канстытуцыі. А палітык сказаў, што я недаацэньваю ўладу, і назваў большыя лічбы. Я мусіў згадзіцца зь ім. Мы сьмяяліся: якая яна, улада, прадказальная. А потым палітык агаломшыў мяне весткаю пра сьмерць др. Уладзімера Міхнюка. Я не паверыў яму. Патэлефанаваў яшчэ аднаму гісторыку. І той сказаў: праўда, памёр на канфэрэнцыі ў Берасьці. У аўторак — 12 кастрычніка — адбылося пахаваньне. На гістфаку БДУ сабралася шмат гісторыкаў, каб правесьці Яго ў апошні шлях.

...Маё знаёмства з гісторыкам Міхнюком пачалося зь Ягонае трэцяе кнігі — пра станаўленьне і разьвіцьцё гістарычнае навукі Савецкае Беларусі ў даваенны час. Памятаю ўражаньне ад трэцяе кнігі: шмат недагаворак. Зрэшты, на той час я ўжо разумеў: каб быць сумленным гісторыкам у СССР, трэба было ўвесь час карыстацца гэтым прыёмам, маючы на ўвазе знакамітае sapienti sat. Разумны, чытаючы, прыкладам, што на пачатку і ў другой палавіне 1930-х у БССР не хапала дасьледчыкаў і выкладчыкаў гісторыі, ведаў адказ на пытаньне: чаму?

І наступныя Ягоныя працы (дзьве — у суаўтарстве) былі прысьвечаныя гісторыі гістарычнае навукі.

У.Міхнюк, мусіць, так і застаўся б гісторыкам гісторыі, калі б ня новыя гістарычныя варункі: і архівы пачалі адкрывацца, і для публікацый зьявіліся ўмовы. А што можа быць саладзейшае для гісторыка за дасьледаваньне, камэнтаваньне і публікацыю дакумэнтаў мінуўшчыны? Вось гэтай працы і аддаўся У.Міхнюк. Сам ці ў суаўтарстве з калегамі Ён друкуе ў газэтах і часопісах ды асобнымі кніжкамі матэрыялы да біяграфій Канстанціна Езавітава і Аркадзя Смоліча, Вацлава Ластоўскага і Антона Сокал-Кутылоўскага, верш «Пасеклі наш Край папалам» Алеся Дудара і ўдакумэнтаваны нарыс пра яго, удакумэнтаваную біяграфію Браніслава Тарашкевіча і тэкст Уладзімера Пракулевіча пра Слуцкае паўстаньне. Дзякуючы Яму дадаліся новыя матэрыялы да біяграфій Максіма Гарэцкага, Уладзімера Дубоўкі, Язэпа Пушчы ды іншых пісьменьнікаў. Шмат працуе Ён для «Энцыкляпэдыі гісторыі Беларусі».

Сярод Ягоных публікацыяў асаблівае месца займае кніга «Антон Луцкевіч: Матэрыялы сьледчай справы НКУС БССР», падрыхтаваная з суаўтарамі. Гэтае вымоўнае сьведчаньне пакутаў і нязломнасьці бацькі беларускае дзяржаўнасьці ўбачыла сьвет асобнаю кнігаю, якая выйшла ў... 20 асобніках (у выходных зьвестках пазначана, што асобнікаў сто). Не знайшлося ні на Бацькаўшчыне, ні ў дыяспары дабрадзея, якога б зацікавіла гэтая праца...

Гэта была не адна непрыемнасьць, якую зьведаў Уладзімер Мікалаевіч. Ён надта цесна сутыкаўся з уладаю і ў часы БССР, і ў часы РБ, каб ведаць яе цынізм, яе жаданьне бачыць гісторыю ў якасьці служанкі і сродку задавальненьня славалюбства.

На пачатку гэтага году я прысутнічаў на абароне дысэртацыі Ягонага асьпіранткі пра Канстанціна Езавітава сёлета ж «зарэзала» Вышэйшая атэстацыйная камісія: «ня тая» тэма дасьледаваньня. Вэтэрынары, якія спрабуюць камандаваць гістарычнаю навукаю, зноў хочуць вызначыць кола забароненых тэм і забароненых імёнаў. Др. Міхнюк чакаў вынікаў апэляцыі...

Адно накладалася на другое. Праф. Міхнюка ня раз называлі кандыдатам на пасаду дырэктара Інстытуту гісторыі. Яму нават прапанавалі прынесьці адпаведныя дакумэнты, а праз колькі дзён сказалі гэтыя дакумэнты забрасць. У той жа час адзін ня надта шанаваны грамадою гісторыкаў аўтар дапаможніка з гісторыі Беларусі напісаў на Яго данос «куды трэба».

Мала таго, што ўсе гэтыя гадасьці адрывалі ад працы, — яны падрывалі здароўе.

А ў праф. Міхнюка было шмат плянаў. Працуючы зь Ім у адной чытальнай залі Нацыянальнае бібліятэкі, я ведаў, што Ён зьбірае матэрыялы для кнігі пра Беларусь у міжнародных дачыненьнях: як глядзелі на нашу краіну ў 1918-м і наступных гадох вялікія і суседнія дзяржавы, як вырашаўся яе лёс. Аднаго разу Ўладзімер Мікалаевіч разгарнуў перада мною мапу ў адной савецкай кнізе канца 1920-х. На гэтай мапе было паказана, як выглядацьме Заходняя вобласьць Расеі пасьля далучэньня да яе БССР. Шкадую: я не запісаў ні загалоўку гэтае кнігі, ні году выданьня. Думаў: сустрэну др. Міхнюка і спытаюся. І вось — такая навіна па тэлефоне...

Анатоль Сідарэвіч

Іван Шамякін

Іван Шамякін нарадзіўся на паўстагодзьдзя раней за мяне, у год майго нараджэньня яму далі званьне народнага пісьменьніка Беларусі. Мая маці, настаўніца беларускай літаратуры, прызнавалася, што апрача Шамякіна й Мележа яна зь «беларусоў» нікога для сябе й не чытае. Жанчыны любяць чытаць Шамякіна й да цяпер — ён вельмі просты й псыхалягічны, уважлівы да жыцьцёвых дробязяў, як жанчына.

Літаратурныя героі бываюць жывейшыя і цікавейшыя за рэальных людзей. А ў беларускай літаратуры савецкіх часоў бальшыня герояў былі мёртванароджаныя. Я прыдумала для іх Авалён — як для загубленых эмбрыёнаў. На Авалён адпраўляюцца чаўны, поўныя мёртванароджаных людзей белсаўліту. Калі я спрабавала піхнуць у той човен героя Шамякіна, яны сталі супраціўляцца. Гэта жывыя людзі, у кожнага ёсьць гісторыя разьвіцьця сэрца й розуму, каханьне й сьмерць.

Камуністычны прысмак у творах Шамякіна моцны, ды не фатальны. Але: каб не было гэтай беларускай супэрпаслухмянасьці й этатызму, Шамякін мог бы стацца раманістам сусьветнага ўзроўню. А так ён проста наш, і нашаму літпрацэсу давядзецца ягоную творчасьць пракаўтнуць і пераварыць — з карысьцю для арганізму.

Ева Вежнавец

Рэпартаж з пахаваньня — **старонка 9**.

Арыштаваны Афнагель

20 кастрычніка быў затрыманы каардынатар «Зубра» Яўген Афнагель. Аўтамабіль, у якім ён ехаў, у раёне вул.Чырвонай блякавалі машыны з танаванымі вокнамі. Чацьвёра ў цывільным вывезьлі «зуброўца» ў невядомым кірунку. Старшыня КДБ Л.Ерын заяўляў, што на Я.Афнагеля заведзеная крымінальная справа. Выглядае, аднак, што затрымалі яго, каб пазбавіць вулічную акцыю завадатара. Сьпіс астатніх затрыманых 20 кастрычніка «НН» зьмесьціць у наступным нумары.

«Рэспубліка» эмігруе

Дэпутат Сяргей Скрабец заявіў, што «рэспубліканцы» маюць прасіць палітычнага прытулку ў Расеі. С.Скрабец кажа, што для іх гэта магчымасць выжыць — не патрапіць за краты і мець працу. Калі ў Расеі голас «Рэспублікі» не пачуюць, дэпутаты маюць эміграваць на Захад.

Новае кіраўніцтва «Свабоды»

Аляксандар Лукашук сыходзіць з пасады дырэктара Беларускай рэдакцыі радыё «Свабода» ў сувязі з прызначэньнем дырэктарам Аўганскае рэдакцыі радыё. Часова кіраваць будзе Багдан Андрусішын (Данчык).

Смаўжы на экспарт

Пачаўся пэрыяд збору вінаградных смаўжоў. На рынку смаўжоў у Беларусі лідзіруе гарадзенская фірма «Мока»: сярод ейных тавараў «Смаўжы па-французску» (мяса смаўжа, масла, часнык, кроп) і «Смаўжы па-каралеўску» (мяса смаўжа, масла, часнык, папрыка, прыправы). Прамысловыя запасы вінаградных смаўжоў у Беларусі складаюць 700—800 т.

ППК для лідэраў прадпрымальнікаў

Калегія па крымінальных справах Гарадзенскага аблсуду пакінула ў сіле прысуд Валер'ю Леванеўскаму і Аляксандру Васільеву. Днямі кіраўнікоў страйкаму прадпрымальнікаў перавядуць з Гарадзенскай турмы ў папраўчапрацоўную калёнію.

Сьпікер парлямэнту супраць фальсыфікацыяў

Сьпікер парлямэнту Казахстану Жармахан Туякбай адмовіўся ад сваёй пасады. Гэтак ён запратэставаў супраць фальсыфікацыяў падчас апошніх парлямэнцкіх выбараў. Туякбай лічыць, што парлямэнт трэба распусьціць і абвясьціць новыя выбары.

Зноў Мірон

Перад рэфэрэндумам у Віцебску зноў аб'явіўся легендарны Мірон. На апоры лініі электраперадач напругай у 35 тысяч вольт быў вывешаны велізарны бела-чырвона-белы сьцяг. Да дзяржальна сьцяга была прымацаваная цыдулка: «Байкот — гэта выратаваньне гонару нашай радзімы. Мірон».

Больш ён не таварыш

«Беларускі Дом друку» скасаваў дамову з рэдакцыяй газэты «Товарищ», заснаваную ЦК ПКБ. Гендырэктар «Дому друку» Раман Алейнік патлумачыў: выдавецтва «па тэхнічных прычынах… ня ў стане друкаваць малатыражныя газэты».

АШ, ВК; БелаПАН, svaboda.org, gazeta.pl

Пяць тысяч сьмелых

Шматлюдных вулічных акцый Менск ня бачыў некалькі гадоў. Тым дзіўней, што 18 кастрычніка на Кастрычніцкую плошчу сабралося каля 5000 чалавек. У горадзе напярэдадні амаль не было відаць афішак, а незалежная прэса баіцца друкаваць абвесткі, каб не зачынілі. Застаецца Інтэрнэт. Таму сярод удзельнікаў акцыі пераважалі маладыя твары — тыя, хто не баіцца дубінак і мае альтэрнатыўныя БТ крыніцы інфармацыі. Зьяўленьне Лукашэнкі на вялізным экране, усталяваным на плошчы, і расповед пра «ашаламляльныя вынікі» выбараў і рэфэрэндуму выклікалі выбух абурэньня. Спроба прарвацца да рэзыдэнцыі скончылася затрыманьнямі: амапаўцы запоўнілі маладымі людзьмі два аўтобусы. Зрэшты, гэтым сілавыя акцыі 18-га й скончыліся. Потым быў мітынг на Кастрычніцкай, дзе рэй вёў Павал Севярынец, а ня лідэры партый. Пасьля мітынгу — паход да КДБ. Старшыня гэтай арганізацыі Леанід Ерын сам выйшаў да мітынгоўцаў і па выніках размовы выпусьціў затрыманага «зуброўца» Яўгена Афнагеля.

Акцыя 19-га праводзілася яшчэ больш спантанна, чым папярэдняя. Толькі МУС абвесьціў, што мае сілы для «навядзеньня парадку». Вядома, 19-га гэта зрабіць было лацьвей: міжнародныя назіральнікі ўжо паразьяжджаліся. Аднак некалькі сотняў чалавек ізноў прыйшлі на Кастрычніцкую. Для разгону дэманстрантаў прыгналі ня толькі міліцыянтаў і амапаўцаў. За Палацам Рэспублікі стаялі яшчэ й 20 грузавікоў з салдатамі ўнутраных войскаў. Разганялі бязьлітасна. Білі й затрымлівалі журналістаў. У аўтобус з затрыманымі запхнулі 11-гадовага хлопчыка: калі ён паспрабаваў выскачыць, амапавец кінуў яго на падлогу аўтобуса. Толькі пазьней яму ўдалося высьлізнуць. Амаль усе затрыманыя былі асуджаны на «суткі» арышту — ад 3 да 15, некаторым выпісвалі велізарныя штрафы — па 40—50 б.в.

Аркадзь Шанскі

Беларуская апазыцыя «адмаўляецца ад правядзеньня вулічных акцый і пераходзіць на новую стратэгію барацьбы з уладай». Пра гэта заявіў на прэс-канфэрэнцыі лідэраў «Пяцёркі+» Сяргей Калякін: «Відавочна, што шляхам вулічных акцый пакуль мы не гатовыя зьмесьці існую ўладу». Ён падкрэсьліў, што «лідэры апазыцыі ня могуць ісьці на тое, каб кідаць маладых людзей пад дубінкі». Як паведаміў Калякін, «апазыцыя заклікае грамадзянаў перайсьці на актыўнае палітычнае супрацоўніцтва з апазыцыяй і сабраць сілы для будучых выступаў».
Аднак, як стала вядома «НН» у сераду, моладзь мае намер працягваць акцыі пратэсту на Кастрычніцкай плошчы Менску супраць фальсыфікацыі вынікаў галасаваньня ў традыцыйны за апошнія дні час — пачынаючы з 18.00.

PHOTO BYMEDIA.NET

Што зараз будзе і што рабіць

Адказваюць палітыкі і дзеячы культуры

Працяг са старонкі 1.

І трэцяе. Беларускаму грамадзтву цяпер трэба зразумець, што пэрыяд усялякай выбарчай барацьбы з рэжымам скончыўся канчаткова. Прэзыдэнцкія выбары 2006 г. будуць копіяй учарашняга рэфэрэндуму.

Цяпер неабходна ўсеагульная барацьба з рэжымам на іншым узроўні, разьлічаная на працяглы час. Перш за ўсё, неабходна нацыянальна-культурная і нацыянальна-палітычная асьвета грамадзтва. І ёсьць людзі, якія могуць гэта рабіць.

Андрэй Казакевіч, палітоляг: Будзе дэлегітымізацыя рэжыму

— Рэжым дасягнуў ступені кансалідаванага аўтарытарызму, і сур'ёзных зьменаў у краіне чакаць ня варта. Адно што ўзровень фальсыфікацый на гэтых выбарах быў відавочны для саміх прадстаўнікоў улады, таму будзе адбывацца дэлегітымізацыя рэжыму. Вынікі парлямэнцкіх выбараў — ня дужа дрэнныя: уладам не ўдалося правесьці гэтую кампанію гэтак жа чыста, як у 2000 г. 108 дэпутатаў, выбраных у першым туры, ды яшчэ каб за іх прагаласавалі па 70—80% — гэта нерэальныя лічбы!

Цяпер ня той час, каб праводзіць вулічныя акцыі: ня тая энэргетыка ў людзей, няма такога запалу, як у 96—97-м гадах. Найбольш рацыянальна — працягваць удзел у палітычных кампаніях (выбарчых і інш.), весьці адкрытую палітычную дзейнасьць. А вось палітыку і культурную дзейнасьць трэба разводзіць. Палітыкам ня трэба займацца асьветніцкай дзейнасьцю, для гэтага ёсьць грамадзкія арганізацыі і культурныя ініцыятывы.

Аляксандар Вайтовіч, акадэмік, кіраўнік грамадзянскай ініцыятывы «За справядлівыя выбары»: Будзе жорстка

— У цэлым у краіне нічога не памяняецца — дыктатура ёсьць дыктатура! Хіба што, карыстаючыся аб'яўленымі вынікамі (хоць яны і непраўдзівыя), дыктатура будзе больш жорстка абыходзіцца з апанэнтамі. Найбольш абуральны такі прыклад — выпадак з Шараметам.

Цяпер настаў момант, калі апазыцыйныя сілы павінны сабрацца разам і выпрацаваць стратэгію і тактыку сумеснага дзеяньня. Выбары ў такім выглядзе не нясуць ніякіх стратэгічных зьменаў: прэзыдэнт загадзя дае ўстаноўку, як павінна прайсьці кампанія. Але вырашаць пра ўдзел ці няўдзел апазыцыі ў такіх кампаніях варта не за год-паўтара, а бліжэй да саміх выбараў.

Уладзімер Колас, старшыня Рады інтэлігенцыі: Я дакажу, што перамог

— Выбары паказалі, што прасьвятленьне ўжо прыйшло і народ усё разумее. У нас у краіне ўсё павінна быць добра, калі мы зробім сваю справу, за якую ўзяліся. Калі не — значыць, намі і надалей будуць кіраваць людзі, у якіх і семкі на базары нельга купляць.

Асабіста я маю намер сабраць подпісы тых людзей, якія за мяне галасавалі, і даказаць, што я перамог. Па-другое, сам Лукашэнка ўжо казаў: выйдзе 100 тысяч на вуліцу — і яго няма. Калі тыя, хто за гэта браўся, няздольныя добра зрабіць справу, хай саступяць іншым.

Аляксей Янукевіч, намесьнік старшыні Партыі БНФ: Трэба пераконваць людзей

— Выбары не зьмянілі сытуацыі. Мы атрымалі той вынік, якога чакалі: улады праігнаравалі волю народу, а народ абыякава да гэтага паставіўся.

Трэба пераконваць людзей, што яны могуць жыць істотна лепей, чым цяпер. Важна знайсьці схему данясеньня інфармацыі да вялікай масы людзей.

Уладзімер Кобец, каардынатар «Зубра»: Будзем рабіць тое, што і рабілі

— Цяпер людзі ведаюць, на што ідуць, калі выходзяць на вуліцу. Але грамадзтва гатовае да перамен.

Просты ўдзел у выбарах ня дасьць выніку. Мы яшчэ год таму дамагаліся стварэньня адзінага дэмакратычнага блёку. На жаль, мы гэтага ня ўбачылі. Да выбараў 2006 г. ёсьць два гады, і мы працягнем патрабаваць ад палітыкаў стварэньня магутнага блёку, які б здолеў заклікаць людзей на абарону вынікаў выбараў. Мы ж будзем рабіць тое, што і рабілі.

Аляксандар Дабравольскі, намесьнік старшыні АГП: «Пяцёрка+» захаваецца

— Будзе вялікае расчараваньне. Людзі яшчэ ня ведаюць сапраўдных вынікаў, але хутка даведаюцца. Члены камісій ня скажуць іх афіцыйна, але будуць расказваць пра іх сваім знаёмым. Грамадзтва даведаецца праўду без усякага радыё і тэлебачаньня, і будзе грамадзкі пратэст.

Трэба павярнуць грамадзкі пратэст у патрэбнае рэчышча, каб ён прывёў да зьменаў у краіне. Нашы праціўнікі, чынавенства, працуюць сыстэмна, спрабуючы насадзіць страх у грамадзтве. Мы таксама мусім працаваць разумна і прафэсійна, прапанаваць людзям альтэрнатыву і ў пэўны час — пэрсанальную альтэрнатыву. Мы плянуем масавую грамадзкую кампанію для вылучэньня адзінага кандыдата ў прэзыдэнты. Проста ўдзел у выбарах выніку ня дасьць, мы мусім знайсьці эфэктыўныя мэханізмы, каб атрымаць масавую грамадзкую падтрымку — і праз палітычную, і праз адукацыйную працу. Цяпер мы будзем вывучаць грамадзкую думку і карэктаваць нашу тактыку. Адзінства «5+» захавалася. Мы будзем імкнуцца да яшчэ большай кансалідацыі, далучэньня тых сілаў, якія яшчэ не ўваходзяць у «Пяцёрку».

Сяргей Калякін, старшыня ПКБ: Будзе тое, што і было

— Будзе тое, што і было, — дыктатура.

Трэба працаваць зь людзьмі, расказваць пра тое, што адбываецца, арганізоўваць людзей у структуры грамадзянскай супольнасьці. Прычым не агулам: павінен быць адрасны падыход, адрасная праца з рознымі катэгорыямі насельніцтва.

Уладзімер Арлоў, пісьменьнік: Ня плакаць, не сьмяяцца, але разумець

— У гэтыя дні я часта прыгадваю выслоўе Сьпінозы: «Ня плакаць, не сьмяяцца, але разумець». Ніякай катастрофы не адбылося. Толькі вельмі наіўныя людзі маглі спадзявацца, што апазыцыі ўдасца выйграць гэты рэфэрэндум ці правесьці ў парлямэнт нейкую бачную няўзброеным вокам колькасьць дэмакратычных дэпутатаў. Я лічу, што памылкай апазыцыі было ня зьняць усіх дэмакратычных кандыдатаў перад выбарамі. Мы жывём у дынамічным сьвеце, нават у Беларусі, дзе час, як здаецца, застыў. Узгадайма рэфэрэндум аб захаваньні СССР. Тады ў яго хуткі скон ня верылі нават заходнія саветолягі, якія зараблялі сабе на хлеб прадказаньнямі гэтага скону.

Палітычнай апазыцыі трэба займацца сваёй справай — палітыкай. Асьветнай працай павінны займацца прафэсіяналы. Каб адбыцца на вуліцы, рэвалюцыя павінна адбыцца ў галовах. Няўхільна працягвае расьці крытычная маса людзей, у чыіх галовах гэтая рэвалюцыя ўжо адбылася.

Апытваў Алесь Пяткевіч, словы Зянона Пазьняка цытуюцца паводле радыё «Свабода»

А потым пералічылі як трэба

У Воршы некаторыя сябры камісій адмовіліся падпісваць фальшывыя пратаколы

На 100% выканала аршанская вэртыкаль патрабаваньні кіраўніка дзяржавы, каб у парлямэнт прайшлі жанчыны ды адданыя ўладзе палітыкі папярэдняга скліканьня. У Аршанскай гарадзкой акрузе №26, паводле апошніх зьвестак гарадзкой выбарчай камісіі, з вынікам 60,23% перамагла Людміла Анікеева, начальніца гарадзкога аддзелу адукацыі. Другім да фінішу прыйшоў прадстаўнік АГП, выдавец забароненых газэт «Время» і «Неделя» Генадзь Ананьеў, які набраў 17,8% галасоў. Праўда, спачатку карціна была іншая: пасьля падліку галасоў на выбарчых участках Анікеева мела 34%, Ананьеў 32% і сябар ПКБ Мікалай Дзямідаў 20%. Пасьпяшаліся нават абвясьціць, што адбудзецца другі тур. Але потым галасы «пералічылі» так, як трэба.

Незалежныя назіральнікі і актывісты апазыцыйных партый сьведчаць пра тое, што рэальныя вынікі выбараў і рэфэрэндуму значна адрозьніваліся ад абвешчаных. Нават у СШ №30, дзе месьціўся штаб кандыдаткі ад улады, у раёне, дзе яна жыве і дзе працягвае выкладаць у гэтай жа школе, за яе прагаласавалі 600 выбарцаў з 2752, што ўзялі ўдзел у галасаваньні, за Ананьева — 530.

Большасьць участкаў для галасаваньня месьцілася ў школах, а камісіі складаліся з настаўнікаў-кантрактнікаў (праўда, некаторыя зь іх казалі, шо будуць галасаваць за сваю начальніцу, якую за вочы клічуць «маці», абы яна хутчэй зьехала з Воршы, бо асаблівай павагай сярод падначаленых не карыстаецца).

Як і паўсюль, у Воршы ды навакольлі ледзь не бізуном гналі працаўнікоў, асабліва бюджэтнікаў, на датэрміновае галасаваньне (трэба сказаць, што на некаторых участках былі і «пернікі»: так, у ПТВ №40 дзяўчаты — будучыя цырульніцы — бясплатна стрыглі тых, хто прагаласаваў датэрмінова). Такім чынам, паводле афіцыйных зьвестак, у Воршы датэрмінова прагаласавалі 30% выбарцаў, на некаторых участках больш за 50%. Маральны ціск на выбарцаў, у першую чаргу кіраўнікоў прадпрыемстваў ды арганізацый, з боку гарвыканкаму быў як ніколі моцны. Як паскардзілася адна дырэктарка, такога яна яшчэ ня бачыла і дай бог пайсьці на пэнсію да выбараў 2006 г.

Мясцовае, як бы «прыватнае», тэлебачаньне ледзь не праз паўгадзіны нагадвала гледачам, што трэба абавязкова ісьці на датэрміновае галасаваньне, каб зэканоміць бюджэтныя сродкі, ды ўсім прагаласаваць «за стабільную Беларусь». Цікава ведаць, ці плаціў ідэалягічны аддзел гарвыканкаму за гэтую рэкляму па 440 рублёў за слова? Дый у дзень галасаваньня мясцовы тэлеканал паказваў ход выбараў не як адказнае палітычнае мерапрыемства, а як сапраўднае сьвята, што праходзіла зь песьнямі і танцамі. Што да галасаваньня, дык на некаторых участках увесь дзень на поўную моц працавалі тэлевізары, з экранаў якіх магутнай плыньню лілася агітацыя за рэфэрэндум.

У знак пратэсту супраць шматлікіх фальсыфікацый пры падліку галасоў выбарцаў па выбарах у ПП ды рэфэрэндуме адмовіліся падпісаць выніковыя пратаколы сябар гарадзкой камісіі па правядзеньні рэфэрэндуму Алесь Шутаў, сябры Аршанскай гарадзкой выбарчай камісіі па 26-й акрузе Васіль Кабачэўскі ды Станіслаў Храпавіцкі. Таксама адмовіліся падпісаць пратаколы на ўчастках для галасаваньня №13 ды №35 і некаторыя сябры ўчастковай камісіі ў сувязі з тым, што канчатковыя лічбы ў пратаколах адрозьніваліся ад вынікаў падліку галасоў. «Для сёлетняй выбарчай кампаніі, — кажа Станіслаў Храпавіцкі, — характэрны грубыя парушэньні заканадаўства як на стадыі агітацыі, так і ў ходзе саміх выбараў. Частка пратаколаў, якія старшыні выбарчых камісій з участкаў усю ноч здавалі ў гарадзкую выбарчую камісію, была запоўнена алоўкам, мела выпраўленьні і да т.п.»

Яўген Жарнасек, Ворша



WWW.SVABODA.ORG

На выбарчым участку ў СШ №4 г.Менску падчас датэрміновага галасаваньня пэнсіянэрцы выдалі... ужо запоўнены бюлетэнь. Жанчына стала зьдзіўляцца. У гэты час на ўчастку быў фотакарэспандэнт. Пакуль сябры камісіі ў разгубленасьці супакойвалі жанчыну, фотакарэспандэнт пасьпеў заўважыць і сфатаграфаваць стос бюлетэняў, ужо запоўненых «за», на стале, пасьля чаго ўцёк. Сэрыя здымкаў выстаўлена ў Інтэрнэце.

Фарс замест падліку галасоў у Гомелі

Ю. у пару свае маладосьці была актыўнаю ўдзельніцаю «трэцяга сэктару», стварыла зь сябрамі ў свой час адну з наймацнейшых у горадзе маладзёжных арганізацый. Пасьля пайшла працаваць у школу, якая паглынула яе з галавою…

Школа, як маглі заўважыць беларусы на працягу апошніх гадоў, гэта ня толькі месца, дзе вучаць, але і дзе галасуюць. Таму Ю. па волі лёсу давялося апрача сваіх беспасярэдніх узваліць на сябе груз новых «грамадзкіх» абавязкаў: зноў хадзіць па кватэрах, але ўжо ня клікаць гамяльчан на ачыстку Кагальнага рову, а зьвяраць сьпісы выбарцаў (пасьля працы, у выходныя), арганізоўваць само галасаваньне, лічыць бюлетэні, адказваць перад законам, перад апазыцыяй, перад уладаю, перад міжнароднаю супольнасьцю за лічбы, магчымыя парушэньні — за ўсё, урэшце (за гэта яна атрымае ад дзяржавы 23 тысячы рублёў за ўсю работу).

- Перад гэтым мы бачылі амаль роўныя стосы «за» і «супраць», раскладзеныя нашымі рукамі, і раптам — 90% «за»!

Ю. са сваймі калегамі сумленна правяла выбары і рэфэрэндум. Прынамсі, у тым, што ад яе залежала. У надомным галасаваньні не было ніякіх падтасовак. На ўчастку не прымала чужых пашпартоў (старшыня камісіі цісьнуў: «Бяры», — а яна толькі гаварыла: «Гэта Крымінальны кодэкс», — і пашпарты самі вярталіся ў кішэні «руплівых» сваякоў сапраўдных уласьнікаў дакумэнтаў: яны думалі, што гэта іх тычыцца кодэкс, а адказвае насамрэч па кодэксе член камісіі). Дарэчы, удзел грамадзян у выбарах і рэфэрэндуме ў Гомелі быў высокі, сапраўды «ашаламляльны».

Пасьля «ўсяго» Ю. патэлефанавала мне а трэцяй ночы. Яна не магла стрымаць сьлёз:

— Калі пачаўся падлік бюлетэняў, стосы «за» і «супраць» пытаньня рэфэрэндуму расьлі раўнамерна: іначай кажучы, людзі галасавалі пароўну за і супраць прапановы Лукашэнкі! На выбарах жа дэпутатаў «сьвяціўся» другі тур… Нельга сказаць дакладна, колькі дакладна было «за» і «супраць», што пераважала, бо не пасьпявалі мы раскласьці ўсе бюлетэні, як іх забіралі сакратары і пераносілі на свае сталы… Мы ж працягвалі мэханічна раскладваць і ціха радавацца: «за», «супраць», «за»… Пасьля таго як мы расклалі бюлетэні, я зь некалькімі калегамі пайшла курыць у прыбіральню — парушаць дырэктыву №1. Настрой мы мелі ўзьнёсла-нэрвовы, расказвалі показкі кшталту: «Паважаныя выбарцы! Той, хто прагаласаваў, можа апусьціць рукі ды адысьці ад сьценкі». Калі мы вярнуліся ў фае падпісваць пратаколы, настаўніца, зь якою мы толькі што палілі, раптам зьніякавела ды прашаптала мне: «Перагарні паперу, паглядзі, што мы падпісваем!» Я перагарнула і ўбачыла лічбы: на нашым участку было пад 2500 чалавек, у выніковым пратаколе было пазначана: «за» — амаль 2000, «супраць» — прыблізна паўтараста, крыху больш за дзесяць сапсаваных. Перад гэтым мы бачылі амаль роўныя стосы «за» і «супраць», раскладзеныя нашымі рукамі, і раптам — 90% «за»! Наш радасны настрой зьнік незваротна. Калі мы запакоўвалі бюлетэні ў паперу, залівалі шпагат сургучом, ставілі пячатку, усё адпавядала пратаколу: «за» — амаль 2000… Куды падзеліся бюлетэні «супраць», адкуль узяліся бюлетэні «за»?! (Званок «адкуль трэба» нядоўга быў для нас сакрэтам.)

Старшыня і сакратар камісіі паехалі з пакункамі бюлетэняў у адміністрацыю раёну, а мы — ніхто ня мае права пакідаць участак, пакуль тыя ня вернуцца, — пайшлі ў сталоўку ды прадоўжылі парушэньне дырэктывы №1. Мы парушалі дырэктыву моўчкі, ня гледзячы адно аднаму ў твар.

Старшыня і сакратар вярнуліся праз гадзіну — маўклівыя, нэрвовыя ды змучаныя. Дахаты ў той дзень мы пайшлі а другой ночы, сябры выбарчай камісіі — настаўнікі, якім заўтра на працу…

Паводле Інстытуту Гелапа, на Гомельшчыне «за» выказаліся 62,2%, паводле ЦВК — 83% выбарцаў.

В.Ко-т, Гомель

Брыдка

Ліст члена выбарчай камісіі пра тое, як гэта было

Паважаная рэдакцыя «НН»!

Пішу, каб падзяліцца з Вамі сваім досьведам апошніх дзён. Маючы няшчасьце працаваць настаўніцай у цяперашняй сыстэме адукацыі, вымушана была, як і тысячы маіх калег па ўсёй краіне, браць непасрэдны ўдзел у выбарчай камісіі. Ня буду называць якой.

Не зважаючы на ўсе мае спробы ўхіліцца ад гэтага пачэснага абавязку, старшыня камісіі (дырэктарка нашай школы) усё ж пакінула мяне ў яе складзе. Хутчэй за ўсё, разьлічвала на маю талерантнасьць, маладосьць і адвечны страх перад начальствам.

Прыгоды пачаліся ў маё першае дзяжурства на датэрміновым галасаваньні 12 кастрычніка. На працягу трох гадзін прыйшло 20 чалавек. Задаволеных сваім зьяўленьнем тут было няшмат. Людзі наракалі на прымус з боку начальства. У 18.30 старшыня камісіі (дырэктарка) прынесла стос сьвежых бюлетэняў на рэфэрэндум і загадала як мага хутчэй падпісаць іх з адваротнага боку. За паўгадзіны агульнымі намаганьнямі мы падпісалі каля 500 асобнікаў.

Ужо ў нядзелю, непасрэдна на выбарах, я адмыслова назірала за тымі бюлетэнямі, якія прыносіліся. На іх маіх подпісаў не было. Мне стала зразумела, што ўжо тады яны былі падрыхтаваныя як належыць: «за Беларусь».

За некалькі хвілін да адкрыцьця выбарчага ўчастку нам прынесьлі лісты паперы, на якіх былі пазначаны некаторыя дамы і парадкавыя нумары пэўных асоб, і загадалі паведамляць старшыні камісіі, ці яны прагаласавалі.

У сьпісах, па якіх я выдавала бюлетэні, значыўся інтэрнат. Ужо каля 11-й завітала камэндант з патрабаваньнем паведаміць ёй колькасьць тых, хто прыняў удзел у выбарах. Я адмовілася гэта зрабіць, чым выклікала нездаволенасьць, і накіравала яе да старшыні камісіі. Тая ёй не адмовіла і на працягу цэлага дня паведамляла неабходныя зьвесткі.

Увогуле галасавалі хто хацеў, як хацеў, па чым хацеў і нават за іншых сваякоў. Шмат асоб увогуле не былі ўнесены ў сьпісы, хоць яны адзначалі, што іх прозьвішчы былі зьвераны загадзя.

Аднак самае цікавае пачалося пасьля закрыцьця выбарчага ўчастку. Нам было загадана разьмеркаваць бюлетэні на рэфэрэндум і на выбары. Бюлетэні на рэфэрэндум адразу забрала старшыня і не дазволіла нам да іх нават наблізіцца.

Працяг на старонцы 10.

Бутафорскі рэфэрэндум

Я на тыповым выбарчым участку ў Менску, ва Ўруччы. Мяне сустракаюць без асаблівай радасьці, але ветліва. «Назіральніку трэба было рэгістравацца ўчора, а сёньня вы ня можаце быць назіральнікам». — «Я даверaная асоба кандыдата ў дэпутаты». Нарэшце ўладкоўваюся. Побач стары ад Беларускай патрыятычнай партыі.

Галасаваньне пачынаецца. Першы ж чалавек зьвяртаецца да мяне з пытаньнем: «Дзе тут бюлетэнь папалам разарваць, як Ярмошына сказала?» Ад патоку агітацыі на тэлеканалах у людзей памяшалася ў галаве.

«Колькі ўсяго чалавек на выбарчым участку, згодна са сьпісамі?» — пытаюся я ў старшыні камісіі. «Даведаецеся пасьля галасаваньня. Ад 1500 да 2000», — усьміхаецца ён.

Бабулька пытаецца, дзе тут паставіць «за Лукашэнку» і ўголас абвяшчае пра свой выбар. Але гэта адзіны выпадак за ўвесь час. Гаваркія прыхільнікі нешматлікія, але надзвычай упартыя. У акрузе балятуецца Алесь Міхалевіч з партыі БНФ. Наконадні яго выкрасьлілі. І прыкладна кожны пяты пытаецца: «А дзе Міхалевіч?» — «Пазбавілі рэгістрацыі». Старая інтэлігентнага выгляду не вытрымліва: «Вось сволачы!»

Прадстаўнік Патрыятычнай партыі дакарае мне і Ірляндыі за двайныя стандарты: на рэфэрэндуме тамтэйшыя жыхары галасуюць два дні. Таксама прыходзіцца выслухаць абурэньне архаічнай выбарчай сыстэмай Злучаных Штатаў.

Нарэшце, падлік галасоў. Хоць крыху наблізіцца да сталоў анікому з назіральнікаў не дазваляюць. Але пакой, дзе адбываецца падлік галасоў, невялічкі, і я ўсё ж такі магу бачыць, што адбываецца на сталах.

Датэрміновае галасаваньне. Дзьве маленькія скрыні, забітыя пад завязку. Ідзе сартаваньне аркушаў — за ці супраць пытаньня, вынесенага на рэфэрэндум, за таго ці другога кандыдата. У датэрміновым галасаваньні стос аркушаў «за», здаецца, пераважвае галасы «супраць», але гэтыя паперкі хуценька спакоўваюць. Лічбы ціхенька паведамляюць старшыні, але іх не чуваць.

Самае галоўнае. Высыпаюць аркушы зь вялізных скрыняў. Тут агляд пагоршыўся.

«Лукашоў, Лукашоў, яшчэ раз Лукашоў», — гучыць прозьвішча кандыдата ад «Маладой Беларусі». Прозьвішча праўладнага кандыдата так і не называецца, але я магу заўважыць на стале стос папер — пачак за праўладнага кандыдата крыху танчэйшы за пачак прыхільнікаў «Маладой Беларусі».

Нарэшце, у стосе рэфэрэндумных аркушаў я бачу галачку «супраць». Пачак «супраць» не занадта тоўсты, але таўсьцейшы, чым стос «за». І калі ўважліва прыгледзецца, то суадносіны прыкладна 60/40 — у лепшым для ўлады выпадку 55/45. І гэта ўчастак, дзе шмат пэнсіянэраў!

Але пасьля спакаваньня аркушаў чаканьне і доўгія, надзвычай доўгія падлікі.

Празь дзьве гадзіны жвавы і здаволены старшыня абвяшчае вынікі: лічбы фантастычныя. Усяго выбарнікаў 1889, галасавалі на рэфэрэндуме 1661, 1345 за і ўсяго 285 — супраць. Нават сябар Патрыятычнай партыі зьдзіўлены. З кандыдатамі карціна адпаведная — зь перавагаю ў паўтара разу перамагае кандыдат ад улады.

Праўда, нават у афіцыйных лічбах памылачка: дэмакратычны кандыдат, які ва ўсіх улётках заклікаў галасаваць на рэфэрэндуме супраць, набірае 625 галасоў, а супраць на «рэфэрэндуме» сказалі нібыта толькі 285 выбарцаў. Але для «правільнай і элегантнай» кампаніі — дробязі.

Цішыня ў пакоі. Сябры камісіі (усе яны з заводу, у службовай залежнасьці ад старшыні) хаваюць вочы.

«Паслухайце, я бачыў тут на стале зусім іншыя вынікі. Што вы самі на гэта скажаце?» — «Я нічога ня ведаю, я ня бачыла», — чырванее жанчына, якая перадавала старшыні гатовыя стосы з галасамі.

«Вы самі ўсё бачылі? Бачылі. А што я магу зрабіць? Я маленькі чалавек», — нэрвова паліць сакратарка. На пасяджэньні камісіі яна, як і ўсе, прамаўчала. «Але ж вы самі бачылі, што Лукашэнка прайграе?!» — «І што? Што з таго?»

Дыктатура — гэта ня лічбы, не паперы, не асобныя правілы, гэта людзкі паралюш.

Андрэй Расінскі



WWW.PBNF.ORG

Паводле зьвестак Сяргея Калякіна, наклад агітацыйнага нумару «Советской Белоруссии» за 14 кастрычніка, які бясплатна раскідалі ў паштовыя скрынкі, склаў не 800 тыс., як было пазначана, а 3 млн. 400 тыс. асобнікаў. Друкавалі газэту чацьвёра сутак безь перадыху, што выклікала абурэньне супрацоўнікаў Беларускага Дому друку.

Фальсыфікацыі ў Сухараве

Я, Міронаў Канстанцін, быў даверанай асобай кандыдата ў дэпутаты па 102-й выбарчай акрузе Анатоля Лябедзькі. Праводзіў назіраньне ў дзень «выбараў» на 328 выбарчым участку, што ўваходзіць у 102-ю округу. Ён разьмешчаны па адрасе: вул.Адзінцова, 32, Менск. Кандыдатамі былі Лябедзька (АГП), Аляксашына (работніца Менгарвыканкаму, ад улады, яна і «перамагла») і Лагвінец (беларускамоўны выкладчык ЭГУ). Усяго колькасьць выбарцаў — 2022 чалавекі.

Датэрмінова прагаласавалі, згодна зь зьвесткамі камісіі, 206 чалавек. Дома прагаласавала 35 чалавек.

Да назіральнікаў падчас выбараў было самае прыязнае стаўленьне. Выбарчую камісію ўзначальвала жанчына, якая першы раз брала ўдзел у выбарах. Без пашпартоў галасаваць не дазвалялі. Падчас галасаваньня выбарчае заканадаўства ў цэлым выконвалася.

Агулам прагаласавалі 1656 чалавек. Чыстых бляннкаў галасаваньня на рэфэрэндуме было (паводле слоў старшыні) атрымана ўсяго 2000, а галасаваньня на выбарах — 1900. Тым ня менш, пагашана пасьля заканчэньня галасаваньня было аж 395 бляннкаў рэфэрэндуму і 245 бляннкаў выбараў дэпутатаў.

Пасьля заканчэньня выбараў былі ссунуты сталы і на іх выгружаліся сьпярша бляннкі датэрміновага галасаваньня, а потым бляннкі з асноўных скрыняў. Назіральнікі былі на адлегласьці каля 6 мэтраў. Пачалося ўсё з таго, што старшыня дастала аднекуль бляннкі галасаваньня на рэфэрэндуме (на выгляд 200—300 штук) і паклала іх разам з бляннкамі, якія падлічваліся. Думала, што я не заўважу. Але я заўважыў. На пытаньні яна адказваць адмовілася.

У выніку (паводле падлікаў камісіі) «за» было пададзена 1215 галасоў, а «супраць» — 456 галасоў. Але ў старшыні камісіі было кепска з матэматыкай. Калі скласьці лічбы «за» + «супраць» + пагашаныя бляннкі, то атрымліваецца лічба, большая за 2000, а менавіта столькі, паводле слоў старшыні камісіі, было атрымана чыстых бляннкаў рэфэрэндуму перад выбарамі.

Пры падліку галасоў на выбарах дэпутатаў камісія адразу абвясьціла, што за Аляксашыну было пададзена 990 галасоў, за Лябедзьку — 346 і за Лагвінца — 245. Пачак бляннкаў за Аляксашыну павінен быў быць у тры разы таўсьцейшы за астатніх. Але было ня так. І мы з назіральнікам ад Лагвінца папрасілі пералічыць бляннкі. Старшыня камісіі нечакана пагадзілася, але некуды пабегла званіць. Хутка мы пачулі іншыя лічбы. За Аляксашыну — 593, за Лябедзьку — 563 і за Лагвінца — 450.

Пратакол вынікаў галасаваньня паказаны ня быў. Нават паводле зьвестак камісіі ў галасаваньні на рэфэрэндуме ўзяло ўдзел болей бляннкаў, чым атрымала камісія.

Усё гэта было паведамлена мной у перадвыбарны штаб Лябедзькі. І я гатовы падаць скаргу ў пракурату, хаця мяркую, што гэта дасьць мала плёну.

Канстанцін Міронаў

Па студэнцкім білеце

На выбарчым участку ў Маскве на беларускім рэфэрэндуме прагаласаваў расейскі грамадзянін. Студэнт заявіў, што згубіў пашпарт, і прад'явіў студэнцкі білет. Па гэтым дакумэнце яму ахвотна выдалі бюлетэнь. Насамрэч гэтага хлопца, грамадзяніна Расеі, узялі з сабой беларускія студэнты, якія паставілі сабе на мэце выявіць фальсыфікацыі.

25% датэрміновага галасаваньня па краіне

На акрузе С.Багданкевіча (Менск) у інтэрнаце Пэдагагічнага ўнівэрсытэту датэрмінова прагаласавалі 66%. Кандыдат У.Аляксеенка (Віцебск): округа ўключае ў сябе інтэрнаты Вэтэрынарнай акадэміі і Мядычнага інстытуту — датэрмінова прагаласавалі каля 50%. У В.Смольнікавай у Буда-Кашалёўскім раёне сельскія жыхары, якія прагаласавалі датэрмінова, складаюць каля 70%. Для чаго было заганяць людзей галасаваць датэрмінова?

Прагаласавала 140%

На ўчастку №510 Усходняй выбарчай округі №107, дзе балятуецца Вінцук Вячорка, паводле падлікаў назіральнікаў, яўка склала блізу 140% ад колькасьці выбаршчыкаў у сьпісах.

Фокусы на ўчастках

Падчас падліку галасоў стосы зь бюлетэнямі «супраць» упіхваліся ў сярэдзіну кіпы «за». Назіральнікі гэта бачылі, але нешта зрабіць ня мелі права. Сябар Партыі БНФ Віктар Мязяк дык наогул пасьля таго, як усе бюлетэні былі зашыты ў мех і апячатаны, знайшоў у шафцы ў кабінцы для галасаваньня тры бюлетэні з пазнакай «за» ды запытаўся ў старшыні камісіі, ці супадае ў яго «дэбэт» з «крэдытам». Тыя бюлетэні былі адразу ж забраныя міліцыянтамі. Нічога іншага ў Баранавічах і не чакалі.

Акадэмік Вайтовіч: Былі цыркуляры

«Паводле зьвестак, якія мы маем, на ўсе выбарчыя ўчасткі Беларусі паступілі цыркуляры ад выканаўчай улады пра неабходныя вынікі галасаваньня», — заявіў акадэмік Аляксандар Вайтовіч 19 кастрычніка ў Маскве на прэс-канфэрэнцыі для расейскіх журналістаў. «Калі Расея будзе й надалей падтрымліваць Аляксандра Лукашэнку, гэта, на вялікі жаль, прывядзе да нагнятаньня ў Беларусі антырасейскіх настрояў», — сказаў навуковец.

Тут 1428 і там 1428

— У нядзелю за дзьве гадзіны перад сканчэньнем галасаваньня людзі з каманды Вінцука Вячоркі далі мне атрыманыя ад некага ў камісіі будучыя вынікі выбараў і рэфэрэндуму на ўчастку нумар 495 округі №106 у Менску, — расказвае Азгар Ішкільдзін, расейскі журналіст. — Я паехаў на гэты ўчастак і чакаў на абвяшчэньне вынікаў. А 21-й старшыня камісіі абвесьціў, што ў рэфэрэндуме ўзяло ўдзел 1428 чалавек. Гляджу на картку, а там таксама 1428. За — 1096 выбарцаў. У мяне таксама. Супраць — 224, і ў мяне 224. Вынікі выбараў у парлямэнт таксама амаль ідэальна такія самыя. Розьніца толькі ў выніку кандыдата ад ЛДПБ. Старшыня зачытаў, што атрымаў ён 152 галасы, а мая картка абяцала 82. Але старшыня папрасіў прабачэньня за памылку і прачытаў, што ўсё ж 82, — сьмяецца Ішкільдзін.

Праняло і Уту

Кіраўніца рабочай групы па Беларусі ПА АБСЭ, вядомая сваёй прымірэнчай да А.Лукашэнкі пазыцыяй, Ута Цапф, якая прыбыла ў Менск у пятніцу ў якасьці афіцыйнай назіральніцы за выбарамі ў Беларусі, у часе спробы наведаць адзін зь мясцовых выбарчых участкаў была літаральна выкінутая за дзьверы старшынёй выбаркаму. Пра гэты інцыдэнт спадарыня Цапф паведаміла прадстаўнікам нямецкіх СМІ. Паводле словаў нямецкай парлямэнтаркі, яна і яе калегі, назіральнікі АБСЭ, сутыкнуліся ўчора таксама і зь нежаданьнем сяброў выбаркамаў адказваць на іхныя пытаньні.

Цалкам задаволеныя выбарамі былі толькі браты па розуме з СНД і адзінкавыя назіральнікі з заходніх краінаў, запрошаныя самімі ўладамі Беларусі. Менавіта яны выступалі на БТ.

Між тым назіральнікі ад Эўрапарлямэнту Богдан Кліх і Барбара Кудрыцка заявілі, што паставяць пытаньне аб пашырэньні забароны на ўезд у краіны Эўропы для сяброў Цэнтральнай выбарчай камісіі і спн.Ярмошынай.

Паводле БелаПАН, svaboda.org і ўласных карэспандэнтаў

«Столькі ўжо было й ня трэба»

Змаганьне ішло не за галасы выбарцаў, а за тое, каб выбарцы выйшлі ці ня выйшлі на вуліцы

Шматлікія паказальныя экзэкуцыі дэмакратычных кандытаў падчас выбарчай кампаніі — 120 адмоваў у рэгістрацыі, 10 кандыдатаў, зьнятых у часе кампаніі, прымус да датэрміновага галасаваньня — былі ня столькі адсячэньнем пэрспэктыўных кандыдатаў (усё роўна прызначана 108 з 110 па сьпісе), колькі псыхалягічным цискам. Каб кожны з выбарцаў, ідучы на ўчастак, ведаў: дэмакратычная апазыцыя бясьсільная, а вынік прадвызначаны.

Тэлебачаньне таксама ня столькі агітавала «за», колькі стварала псыхалягічную глебу для апраўданьня «намечаных вынікаў». У дзень выбараў у сюжэтах беларускіх тэлеканалаў прадстаўнікі ўсіх сацыяльных груп, узростаў, прафэсій і тэмпэрамэнтаў тлумачылі, чаму яны галасуюць «за Беларусь». Назіральнікі ад СНД, Лігі арабскіх краін, польскай «Самаабароны» й Лібіі захапляліся бездакорнай арганізацыяй выбарчага працэсу.

Экзыт-пол закончаны а 10-й ранку

Вынікі «апытаньняў» службы «Экаом» агучваліся на прэс-канфэрэнцыях ЦВК і ў тэлебачаньні ад 11-й гадзіны.

Вынікі экзыт-пулаў Інстыту Гелапа, паводле якіх Лукашэнка рэфэрэндум прайграў, былі абвешчаны, натуральна, толькі пасьля заканчэньня галасаваньня, позна вечарам. На працягу дня назіральнікаў гэтай службы затрымлівала міліцыя і выганялі з участкаў чальцы камісіяў. Каб паралізаваць працу апазыцыйнага штабу, выкарыстоўваліся прывычныя ўжо дробныя паскудзтвы. Ад ранку і да ночы былі заблякаваныя сайты радыё «Свабода», «Хартыі-97», праваабарончага цэнтру «Вясна». Адразу пасьля заканчэньня галасаваньня былі адключаны тэлефоны інфармацыйнага агенцтва «БелаПАН», а мабільны дырэктара агенцтва Алеся Ліпая быў адключаны ўвесь дзень — усё з «тэхнічных прычын». Адключаліся таксама тэлефоны праваабарончага цэнтру «Вясна». У офісах АГП і БНФ адрубілі сьвятло.

- Станіслаў Шушкевіч: Зьмяніць сытуацыю ў Беларусі мэтадам выбараў больш немагчыма

Усё гэта паралізавала здольнасьць людзей атрымліваць інфармацыю з альтэрнатыўных крыніц. Заставаўся канал «Лад», які ад ранку паўтараў, што за Лукашэнку прагаласавала 82% выбарцаў. А ўжо ўвечары Лідзія Ярмошына пасьпешліва знаёміла з «папярэднімі вынікамі галасаваньня» тады, калі ўчастковыя камісіі толькі сканчалі гасіць нявыкарыстаныя бюлетэні.

Інфармацыйная блякада трывала да ранку, каб расчараваныя праціўнікі прэзыдэнта праігнаравалі акцыю пратэсту ў панядзелак вечарам.

PHOTO:BYMEDIA.NET

Лідзія Ярмошына здолела падлічыць 50% галасоў ужо да 23-й гадзіны. «Ярмошыну да адказу!» і «Праўду!» — скандавалі 5000 чалавек, што сабраліся на мітынг пратэсту 18 кастрычніка на Кастрычніцкай плошчы.

Апазыцыя ня выйшла з кута

Лідэры «5+» ня толькі расказвалі пра назойлівую «наружку», але і дэманстравалі яе журналістам. Пасьля вечаровай прэс-канфэрэнцыі машына, у якой ехаў Сяргей Калякін, колькі разоў аб'ехала вакол трамвайнага прыпынку, і гэтыя манэўры на невялікай адлегласьці ад аўто Калякіна паўтаралі «жыгулі» зь пяцьцю мажнымі мужыкамі. Але больш за апэляцыю да сусьветнае супольнасьці лідэры «Пяцёркі» зрабіць не маглі.

На выніковай прэс-канфэрэнцыі ў панядзелак лідэрам «Пяцёркі» заставалася толькі канстатаваць, што выбараў не было, затое атрыманы вялікі матэрыял для роздуму. Станіслаў Шушкевіч не хаваў раздражненьня ды некалькі разоў паўтарыў, што зьмяніць сытуацыю ў Беларусі мэтадам выбараў больш немагчыма. Аднак ні ён, ні хто іншы не адказаў на пытаньне, якім чынам гэта магчыма. Пра паловы парваных бюлетэняў, якія меліся быць доказам фальсыфікацыі, ня згадвалі — гэтым спосабам, відаць, скарысталіся вельмі нямногія, бо прапанова прагучала запозна.

«Кааліцыя «5+» давяла сваю эфэктыўнасьць, — даказваў Анатоль Лябедзька. — Незалежна ад афіцыйных вынікаў удзел апазыцыі ў выбарчай кампаніі апраўдаў сябе, бо даваў магчымасьць легальнай працы з выбарцамі. У бальшыні акругаў, дзе рабіліся незалежныя экзыт-пулы, павінен быў адбыцца другі тур выбараў. У некаторых акругах, паводле экзыт-пулаў Інстытуту Гелапа, дэмакратычныя кандыдаты атрымалі большасьць у першым туры — Уладзімер Колас у Старавіленскай акрузе, Мечыслаў Грыб у Кастрычніцкай». У фальсыфікацыях Лябедзька ўбачыў і пазытыў: «У апазыцыі зьявіўся шанец здабыць прыхільнасьць тых людзей, якія ўчора былі абыякавыя да палітыкі».

Ад назіральнікаў прыходзілі цудоўныя зьвесткі: на двух участках, у Баранавічах і ў менскай Старавіленскай акрузе, са скрынак вывальваліся пачкі бюлетэняў «за», перавязаныя гумкай. «Ну і правакатары ў апазыцыі!» — не разгубіўся старшыня менскай камісіі.

Замежныя журналісты не маглі ўцяміць, чаму беларусы не выходзяць на вуліцу. «Большасьць ня верыць, што яна большасьць», — адказаў Вінцук Вячорка.

Апазыцыя вымусіла ўлады ўжыць надзвычайныя меры для здабыцьця перамогі, але прадэманстравала сваю бяспраўнасьць перад падманам. Палітолягі будуць спрачацца, слушнейшай была стратэгія байкоту ці падману, але расчараваньне застанецца на гады. Паўтарыўся 1995-ы, 1996-ы, 2001-ы.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

У якасьці сымбалічнай ахвяры быў абраны кіраўнік АГП Анатоль Лябедзька. Зьбіты АМОНам 19 кастрычніка, ён трапіў у больніцу з гематомай ныркі, пераломам рэбраў і чэрапна-мазгавой траўмай. На фота: з жонкай Сьвятланай і сынам Арцёмам у шпіталі хуткай дапамогі.

Праца дзеля будучыні

Фройдаўскую агаворку Аляксандра Лукашэнкі паказалі расейскія тэлеканалы: «Вынікі ашаламляльныя. Столькі ўжо было й ня трэба».

Уранку ў панядзелак расейскія тэлеканалы, якія маглі расказаць пра намеры апазыцыі аспрэчыць вынікі, ня дзейнічалі. Сапраўды, большасьць тых, хто галасаваў «за», выходзіла на працу ў перакананьні, што ініцыятыву прэзыдэнта падтрымалі 87% іхных суайчыньнікаў.

Вечаровую акцыю пры назіральніках не разганялі. Юры Пракопаў на БТ пераключыўся на дыскрэдытацыю тых, хто выйшаў пратэставаць. Тры коратка стрыжаныя малойцы ў навінах расказвалі, як ім «тыкалі грошы, каб яны далучыліся да акцыі апазыцыі». Іншыя малойцы з пляшкамі піва чапляліся да асобных дзеячоў апазыцыі і пазіравалі перад расьцяжкамі, а за імі хадзілі тэлеапэратары.

19 кастрычніка амон-макуты ўжо працавалі «на будучыню». Разгон удзельнікаў акцыі быў асабліва жорсткі. Таксама былі адмыслова зьбітыя тэлежурналісты, каб да публікі дайшло галоўнае пасланьне: кожнага, хто наважыцца выйсьці на вуліцы ў 2006 ці 2011 гадах, будзе жорстка зьбіты.

Алесь Пяткевіч, Мікола Бугай

На шляху да «дэмакратыі»

Вынікі незалежнага перападліку галасоў далі б ашаламляльныя вынікі.

Расейскія назіральнікі, якім ужо з самага ранку можна было прапаноўваць жуйку, каб зьняць водар моцных напояў, былі ў захапленьні ад «дэмакратычнасьці» беларускіх выбараў. Такое сьвята! Такая арганізацыя! Такая яўка!

Сапраўды, лічба яўкі на апошніх выбарах імкліва ідзе да 100%. Спачатку гэтая лічба была дасягнута на асобных вясковых участках у 2001 г. Потым яна стала дасягальнай на большасьці іх з адхіленьнем у 3—5 чалавек, якіх камісіі ня здолелі знайсьці ў дзень выбараў па месцы жыхарства. Цяпер да гэтых лічбаў накіраваліся ўчастковыя камісіі райцэнтраў, якіх пасьля інструктажу у старшынь райвыканкамаў ратуе толькі карвалол.

На выбарах 2006 г. за такія лічбы наведваньня, магчыма, ужо будуць ляцець галовы асобных старшынь у абласных гарадах, бо кіраўніца Цэнтравыбаркаму са скрухай адзначыла, што ў дзень выбараў камісіі ня здолелі даехаць да ўсіх грамадзян, што пажадалі прагаласаваць дома. Часу не хапіла. І хутка новапалатачнікаў, хутчэй за ўсё, чакае чарговае заданьне па «дэмакратызацыі» ВК — дазволіць зьбіраць галасы выбаршчыкаў на даму датэрмінова.

Гэтая кампанія стоадсоткавага ахопу выбаршчыкаў галасаваньнем дае часам кур'ёзныя вынікі, бо на ўчастках з'яўляюцца асобы, якія галасуюць упершыню. У нас у гарадку малады чалавек каля 30 гадоў, атрымаўшы бюлетэнь, надоўга застаўся ў кабіне для галасаваньня, а потым шпарка пакінуў памяшканьне. Камісія, пасьля сэкунднага зьдзіўленьня, накіравала за ім наўздагон свайго члена. Малады чалавек у разгубленасьці пачаў тлумачыць, што ён ужо прагаласаваў, пакінуўшы бюлетэні ў тумбачцы. І сапраўды, у верхняй шуфлядцы ляжалі два запоўненыя бюлетэні, якія выбаршчык урэшце ўрачыста апусьціў у скрыню для галасаваньня. «Вось гэта дэбютант! — сьмяялася потым камісія. — Шуфляду моцна заклеілі скотчам, дык ён яго ўвесь адарваў!» І каб больш не было кур'ёзаў, тумбачкі павярнулі ў кабінках тыльным бокам.

Асаблівасьць сёньняшняга руху Беларусі да «дэмакратыі» палягае ў тым, што ўлада сама выбірае сябе. Спачатку стварае ўсю вэртыкаль выбарчых камісій, дзе няма ніводнага рэальнага апазыцыянэра. Потым усёй моцай дзяржаўных СМІ, выканаўчых структур, наймальнікаў выклікае ў выбарцаў страх і заганяе праз датэрміновае галасаваньне на ўчасткі трэць насельніцтва. Яшчэ адну траціну пасіўнага насельніцтва прыганяюць на ўчасткі ў дзень выбараў. Свабода і закон пры гэтым адпачываюць. Калі і гэта для гарадзкіх выбарцаў не спрацоўвае, то пачынае дзейнічаць славуты прынцып: «Галоўнае не як галасуюць, а як лічаць».

Як лічылі 17 кастрычніка, вядома ўсім дэмакратычным кандыдатам. Зьвяртацца са скаргамі не было сэнсу. Але калі б засталося крыху сумленьня ў выканаўцаў такога падліку галасоў — моўчкі складваць стосы бюлетэняў зь невядома якімі вынікамі і абвяшчаць канчатковы пратакол, — то можна было б арганізаваць незалежны перападлік галасоў на некалькіх участках па кожнай акрузе. Вынікі незалежнага перападліку былі б сапраўды «ашаламляльныя». Не на карысьць уладаў.

Міхась Лагор, Гарадок

Вэнэрычны «Славянскі базар»

У Віцебску медыкі б'юць у званы з прычыны росту вэнэрычных захворваньняў. На мясцовым тэлебачаньні нават паказалі адмысловы рэпартаж, у якім доктарка зь Віцебскага скурна-вэнэралягічнага дыспансэру Людміла Забалоцкая скардзілася на выбуховы рост колькасьці вэнэрычных захворваньняў штогод пасьля «Славянскага базару». Узрост хворых — ад 12 да 93 гадоў, найчасьцей (у 80% выпадкаў) хваробу падчэпліваюць у нецьвярозым стане.

Расейцы крадуць машыны

Найбольш папулярныя сярод аўтазлодзеяў нямецкія аўтамабілі. Пра гэта гаварылі ў Віцебску на апэратыўнай нарадзе ў абласным упраўленьні ўнутраных справаў з удзелам міністра ўнутраных справаў У.Навумава. Паводле прыбытковасьці, крадзяжы аўтамабіляў займаюць у крымінальным сьвеце трэцяе месца пасьля гандлю зброяй і наркатрафіку. У гэтым годзе на Віцебшчыне былі пададзены заявы аб крадзяжах 108 аўтамабіляў, але толькі пятая частка зь іх была знойдзена. Міністар унутраных справаў сярод крымінагенных фактараў назваў блізкасьць Віцебшчыны да Расеі і адсутнасьць мяжы з гэтай краінай.

Каб дзеці ўбачылі гукі

Каталіцкае дабрачыннае таварыства «Карытас» перадало Віцебскай школе-інтэрнату для дзяцей з парушэньнямі слыху адмысловае абсталяваньне, якое дазваляе займацца з выхаванцамі школы разьвіцьцём маўленьня. Абсталяваньне ўяўляе сабой кампутарны праграмна-апаратны комплекс, распрацаваны фірмай «IBM». Сродкі на яго набыцьцё (тысяча эўра) былі сабраны каталікамі Паўночнае Аўстрыі.

Практыкаваньні па разьвіцьці і карэкцыі маўленьня, якія дазваляе праводзіць гэты комплекс, маюць выгляд кампутарнай гульні, а асаблівасьці гучаньня голасу трансфармуюцца ў выявы на экране. Віцебская школа-інтэрнат — найбуйнейшая ў краіне, у ёй жыве і вучыцца 270 дзяцей.

Крадуць мабільнікі

Крадзяжы мабільнікаў сталі на Віцебшчыне масавымі: за адзін апошні тыдзень іх адбылося больш за дваццаць, на працягу нядзелі — адзінаццаць. Найбольш крадуць мабільных тэлефонаў у Віцебску і буйных гарадах. Шлях крадзяжу элемэнтарны — зладзеі просяць дазволу патэлефанаваць з чыйгосьці мабільніка, а атрымаўшы яго, кідаюцца наўцёкі.

Кампутары прымуць экзамэны

У Віцебскім унівэрсытэце ўводзіцца новая мэтодыка правядзеньня іспытаў, якая грунтуецца на выкарыстаньні кампутараў. Рэктар ВДУ Аркадзь Русецкі лічыць, што з дапамогаю кампутараў можна выключыць любы суб'ектывізм з боку выкладчыкаў падчас здачы іспытаў.

Міхал Чарвінскі, Віцебск

Пярэпалах у гарадзкіх школах

Жанчына-прадпрымальніца, небаякавая да адраджэньня беларускай мовы, яшчэ на пачатку жніўня выпісала на верасень у бібліятэкі ўсіх трынаццаці сярэдніх школ і трох прафтэхвучэльняў Слуцку па асобніку газэт «Народная воля» і «Наша слова» ў надзеі, што газэты прачытаюць ня толькі дырэктары і іх намесьнікі, а і настаўнікі, вучні старэйшых клясаў. На такі крок жанчыну падштурхнула вестка, што для школ і прафтэхвучэльняў грошы выдзяляюцца толькі на дзяржаўныя газэты.

Праз пэўны час жанчына задумала прасачыць, ці даходзяць выпісаныя ёю выданьні да адрасатаў. Завітала ў найбліжэйшую ад яе дому сярэднюю школу, у кабінэт дырэктара. А ён на яе запыт аж ускіпеў ад гневу: «Не нужны мне еці вашы газеты! Можаце забраць іх сабе!» У другой школе рэакцыя дырэктара была таксама адмоўнай, толькі ў больш ветлівай і тактоўнай падачы: маўляў, праз вашу «Народную волю» можна мець непрыемнасьці, так што прабачце, не жадаю атрымліваць яе. Яшчэ адзін дырэктар сам пазваніў у гарадзкое паштовае аддзяленьне пасьля атрыманьня першых нумароў тых газэт і катэгарычна заявіў, каб болей яму іх не прыносілі — быццам газэты выпісвалі не на бібліятэку. На тэлефонныя званкі ў іншыя школы адказы былі спалучэньнем страху, трывогі за месца работы і адмовай нават ад такой патрэбнай выкладчыкам беларускай мовы (якая захавалася толькі як прадмет) газэты «Наша слова». Толькі з адной школы жанчына-спонсар пачула прызнаньне, што ад выданьня Таварыства беларускай мовы там не адмаўляюцца, тое самае сказаў і адзін з дырэктараў прафтэхвучэльняў.

Можна неяк зразумець (не апраўдаць!) стаўленьне дырэктараў да адзінай у рэспубліцы штодзённай незалежнай газэты «Народная воля» — яны палохаюцца за свой імідж у вачох мясцовай «вэртыкалі», кіруюцца даўно вядомым прынцыпам «як бы чага ня выйшла». Але каб ігнараваць газэту «Наша слова», якая да ўсяго зьяўляецца карысным дапаможнікам настаўнікам беларускай мовы, — на такі крок могуць сёньня пайсьці толькі людзі, варожыя свайму народу.

Дзявочая «начная варта»

15-гадовая выхаванка Ш. з гарадзкой школы-інтэрнату выршыла «пабалдзець» на начных вуліцах пасьней, чым належыць згодна з раскладам дня гэтай установы для дзяцей-сірот пры жывых бацьках-алькаголіках. І ў дзьве гадзіны ночы, сустрэўшы 29-гадовага грамадзяніна Б., сарвала ў яго сотавы тэлефон «Сымэнс-А-60» коштам 200 тысяч рублёў. Малады дужы мужчына не пасьпеў ачомацца ад нечаканага нападу дзяўчаці-падлетка. У выніку апэратыўна-вышукавай работы супрацоўнікаў міліцыі юная рабаўніца прызнала сваю віну. Бліскучыя мабільнікі на грудзях амаль у кожнай другой дарослай гарадзкой дзяўчыны не спакусілі на грэх, за які давядзецца адказваць.

На кніжных паліцах філіялу — багатае папаўненьне

Бібліятэка-філія №1 ад цэнтральнай гарадзкой бібліятэкі існуе ўжо 37 гадоў і дзякуючы высілкам яе загадчыцы Галіны Сасіновіч стала ня толькі зьбіральніцай і захавальніцай кніжных скарбаў, а і месцам сустрэчаў. Тут часьцяком у чытальнай залі ладзяцца сустрэчы зь беларускімі пісьменьнікамі. Кніжны фонд бібліятэкі налічвае 27 тысяч кніг і пэрыядычных выданьняў. А нядаўна ён за кошт сродкаў, выдзеленых адміністрацыяй аднаго з рэнтабэльных прадпрыемстваў гораду, папоўніўся 117 кнігамі, набытымі ў менскай кнігарні «Сьветач» выдавецтва «Мастацкая літаратура». Завезьлі нядаўна выдадзеныя творы Янкі Брыля, Ніла Гілевіча, Васіля Быкава і іншых аўтараў.

Міхась Кутнявецкі, Слуцак

Каляніяльнае мастацтва

Старшыня Клюбу спраўных кабет Беларусі Т.Сафроненка ў супрацы із швэдзкімі аднадумкамі зьніцыявала стварэньне тэатру ў гомельскай папраўча-працоўнай калёніі №4. Рэжысэрам дзеля разнастайнасьці і зьдзіваваньня мае быць мужчына — швэдзкі актор, літаратар ды рэжысэр Ён Ёнсан.

Зялёныя палітыкі

Гомельскі ідэалягічны афіцыёз улучна з адпаведным аддзелам гарвыканкаму, таварыствам «Веды» і БРСМ заклаў клюб маладых палітыкаў. Не хаваецца, што мае адбыцца скіраваньне маладзёнаў, ахвотных да палітыкі, у «слушнае рэчышча». Для членаў клюбу будуць ладзіцца разматыя сэмінары й лекцыі па паліталёгіі, правазнаўстве й іншых разумных штуках.

Каралу не ставала

Беларускі віцэ-прэм'ер Уладзімер Дражын прэзэнтаваў гомельскаму краязнаўчаму музэю 20-кіляграмовы кавалак ціхаакіянскага каралу. Гэта першы падарунак для нядаўна адкрытай марской экспазыцыі музэю. Такое ў азёрна-лясным краі краязнаўства.

Сяргей Балахонаў, Гомель

Мытнікі пакляліся

14—15 кастрычніка ўпершыню прымалі прысягу мытнікі. На Полацкай мытні на ўрачыстасьці прысутнічаў начальнік упраўленьня па барацьбе з кантрабандай Дзяржаўнага мытнага камітэту Андрэй Міхалькевіч. Мытнікі кляліся аддана служыць Радзіме, надзейна ахоўваць эканамічныя інтарэсы краіны, не парушаць Канстытуцыі, быць сумленнымі і дысцыплінаванымі.

Напісаў гісторыю свайго мястэчка

У полацкім выдавецтве Алеся Судніка выйшла кніга ветрынскага краязнаўца Віктара Карасёва «Мая любоў — Ветрына. Гістарычныя нарысы». Ад агульных 312 старонак больш за сто займаюць фотаматэрыялы. Сярод іх малюнак сямейнага касьцёлу Козел-Паклеўскіх у вёсцы Быкаўшчына або здымак сямейнай царквы Рымскіх-Корсакаў на могілках у вёсцы Мышчына — ёй пашчасьціла захавацца да сёньня.

ВК, Полацак

ХРОНІКА СУПРАЦІВУ

Актывісты ЗБС Сяржук Семянюк і **Васіль Лепеш** затрыманы 11 кастрычніка за распаўсюд улётак. 12 кастрычніка іх, а таксама **Віталя Каратыша**, **Алену Талапілу** і **Паўла Батуева** затрымалі на выхадзе зь сядзібы Згуртаваньня беларускіх студэнтаў, у пастарунку канфіскавалі матэрыялы супраць пажыцьцёвага прэзыдэнцтва. 15 кастрычніка кандыдату ад ПБНФ **Аляксею Янукевічу** акруговая камісія скасавала рэгістрацыю. **Вольга Завадзкая** 12 кастрычніка атрымала з суду Цэнтральнага раёну Менску адмову: яна скардзілася на Пракуратуру Беларусі, якая ня хоча аднавіць сьледзтва. У Мяжэвічах (Слонімскі раён) міліцыянты затрымалі сябра БНФ **Уладзімера Бруцкага** й канфіскавалі ўлёткі. У Горадні **Генадзь Скрабоўскі** 13 кастрычніка атрымаў 7 сутак арышту за несанкцыяваны пікет. Актывіст АГП **Андрусь Козел** (Менск) быў затрыманы падчас расклейкі плякатаў і пакараны 4 суткамі арышту. **Івана Каратчэню** й **Віктара Ахрэмчука**, давераных асобаў кандыдата ад ПБНФ Віктара Раманішкі, затрымалі ў Сьветлагорску падчас разьвешваньня ўлётак. У Добрушы затрымалі і аштрафавалі на 100 тыс. руб. даверaную асобу кандыдата ад АГП Алеся Карніенкі **Артура Цурбакова**, які перавозіў газэту «Неделя» і ўлёткі. У Менску 13 кастрычніка міліцыянты блякавалі ў двары аўтамабіль **Віталя Рымашэўскага** зь перадвыбарнымі ўлёткамі, адпусьцілі яго пасьля пагрозы, што надгляд аўтамабіля адбудзецца толькі ў прысутнасьці журналістаў. Актывіста «Вясны» **Міхаіла Паўлава** затрымалі ў Віцебску падчас распаўсюду ўлётак. У давераных асобаў кандыдата ад ПБНФ **Аляксея Лапіцкага** (Жодзіна), **Сьвятланы Лапіцкай** і **Тацяны Сабалеўскай** 13 кастрычніка міліцыянт падчас раздачы каля «БелАЗу» выраваў улёткі. Праваабаронца **Алесь Яўсеенка** атрымаў папярэджаньне ад адміністрацыйнай камісіі: яго затрымалі пры перавозцы 30-тысячнага накладу інфармацыйнага бюлетэню. У Менску ў штабе кандыдата ад АГП **Івана Анташкевіча** быў наладжаны ператрус, 15 кастрычніка яму скасавалі рэгістрацыю. Здымачная група польскіх журналістаў на чале з **Агнешкай Рамашэўскай-Гузы** затрымана 14 кастрычніка ў Баранавічах пасьля сустрэчы зь мясцовымі актывістамі дэмарганізацый. У Менску акруговая камісія скасавала рэгістрацыю актывіста АГП **Аляксандра Цынкевіча** і сябра БСДГ **Алега Волчака**. Давераныя асобы кандыдата ад КПБ, «аўганца» Уладзімера Шокава зьбілі старшыню міжнароднай дабрачыннай арганізацыі «Ў дапамогу дзецям-сіротам» **Вячаслава Давідовіча** пасьля заўвагі, што яны парушаюць Выбарчы кодэкс. «Беларускі Дом друку» адмовіўся друкаваць наклад перадвыбарчага нумару газэты **«Товарищ»**. На актывістку Беларускай асацыяцыі журналістаў, назіральніцу на выбарах **Ірыну Макавецкую** (Гомель) участковая камісія склала акт, затрабаваўшы адключыць мабільны тэлефон і дыктафон. Мініфармацыі адмяніла загад аб прыпыненьні на 3 месяцы недзяржаўнай **«Рэгіянальнай газеты»** (Маладэчна). Акруговыя камісіі пазбавілі рэгістрацыі кандыдатаў ад ПБНФ **Алеся Міхалевіча** (Менск) і **Зьмітра Шыманскага** (Берасьце). У Смаргоні міліцыянты прымушалі валянтэраў кандыдаткі Зінаіды Бандарэнкі **Андрэя Масевіча**, **Зьмітра Доброха**, **Аляксея Бурдастых**, **Сяргея Мікуліча** даць паказаньні, што яны працуюць за грошы. На студэнта **Паўла Драніцу** (Менск) на выбарчым участку за парваны рэфэрэндумны бюлетэнь склалі пратакол пра псаваньне дзяржмаёмасьці. У Горках адмовілі ў рэгістрацыі назіральніцы **Ларысе Самсонавай**. Выхад недзяржаўнай **«Местной газеты»** (Ваўкавыск) Мініфармацыі прыпыніла на месяц. Падчас расклейкі плякатаў 15 кастрычніка былі затрыманы **Юры Чавусаў**. **Міхаіл Марыніч** адмовіўся ад мэдэкспэртызы: ён лічыць гэта спосабам зацягнуць сьледзтва. У Горадні былі затрыманы **Аляксей Салей**, які праводзіў апытаньне выбарцаў на выхадзе з участку. Старшыня наваполацкай філіі БСДГ **Ігар Валяеў** быў затрыманы за распаўсюд улётак. **Уладзімер Плешчанка** і **Барыс Хамайда** зь Віцебску атрымалі па 10 сутак арышту за пэрформанс супраць рэфэрэндуму. 16 кастрычніка невядомыя ў цывільным запатрабавалі ад чэскага журналіста **Міраслава Карася** сьцерці відэастужку з матэрыяламі, датычнымі рэфэрэндуму. Расейскі журналіст **Павал Шарамет** быў зьбіты й затрыманы. Падчас флэшмобу «Нас хвалюе лёс Беларусі» ў Менску затрыманыя **Алег Ларычаў** і непаўналетні **Макар Ваўчок**. З участку №530 Усходняй выбарчай акругі выгналі давераных асобаў Вінцука Вячоркі — **Тамару Мацкевіч** і **Леанарду Мухіну**. Увечары 17 кастрычніка аўтамабіль лідэра ПКБ **Сяргея Калякіна** патрапіў у спраўкаванае ДТЗ. Актывіст ПКБ **Уладзімер Падалян** (Магілёў) 18 кастрычніка быў вымушаны звольніцца з працы. На 10 сутак арышту асуджаны 18 кастрычніка за расклейку ўлётак **Аляксей Ляўковіч**. У Менску падчас акцыі пратэсту затрыманы **Наста Азарка**, **Алег Мяцеліца**, **Алесь Каліта**, **Зьміцер Кальхо**, **Максім Дварэцкі**, **Дзяніс Крываносаў**. Каардынатар «Зубра» **Яўген Афнагель** быў затрыманы, але ўвечары адпушчаны. Старшыня КДБ Леанід Ерын заявіў, што на Афнагеля завялі крымінальную справу. 19 кастрычніка калегія Гарадзенскага абласнога суду пакінула ў сіле прысуд **Валер'ю Леванеўскаму** і **Аляксандру Васільеву**, не задаволіўшы касацыйнай скаргі. Акцыя 19 кастрычніка скончылася затрыманьнямі дзесяткаў чалавек, многія зь іх былі асуджаны 20 кастрычніка. Сярод іх **Дар'я Малдаванава** (10 сутак), **Павал Юхневіч** (10 с.), **Маргарыта Анціпеўская**, **Тацяна Елавая** (5 с.), **Натальля Ушко**, **Павал Хівук** (5 с.), **Аляксей Мікуловіч**, **Міхаіл Кандрашоў** (10 с.), **Сьвятлана Неціпькова**, **Максім Вінярскі**, **Андрэй Баранаў** (50 б.в.), **Марыя Ганцэўская** (5 с.), **Артур Фінькевіч** (15 с.), старшыня «Маладога фронту» **Павал Севярынец** (15 с.), кіраўнік БСДП (НГ) **Мікола Статкевіч** (10 с.), **Андрэй Дубоўскі**, **Васіль Парфянкоў**, **Сяргей Міхаленка**, **Юры Фабішэўскі**, **Яраслаў Навуменка**, **Міхаіл Кузьняцоў**, **Павал Вішнеўскі**, **Зьміцер Захарка** (50 б.в.), **Аляксандра Пахніна**, **Уладзімер Шыдлаў**, **Арцём Воранаў**, **Дзяніс Арцюшкевіч** (5 с.), **Аляксандар Каліта** (10 с.), **Кацярына Бондарава**, **Юлія Альшэўская**, **Сяргей Андросенка**, **Алег Радзівонаў**, **Мікалай Арцюхоў** (40 б.в.), **Зьміцер Пазьняк** (50 б.в.), **Канстанцін Екель** (50 б.в.), **Сяргей Рылькоў** (3 с.), **Ігар Хадкоўскі** (40 б.в.), **Дзяніс Лашчынскі**, **Сяргей Малькевіч**, **Зьміцер Талькоў**, **Аляксандра Геўская**, **Сяргей Красоўскі** (20 б.в.), **Ірына Пярвойкіна**, **Яўген Валкавец**, **Аляксандар Валчанін** (трапіў у больніцу), **Руслан Харкевіч** (10 с.), **Зьміцер Чарткоў**, прэс-сакратарка АГП **Кацярына Ткачэнка**, **Аляксандар Цынкевіч** (15 с.), **Мікалай Ганчароў** (3 с.). Кіраўнік АГП **Анатоль Лябедзька** быў зьбіты АМАПам у рэстарацыі «Патыё-піца» й трапіў у больніцу з гематомай ныркі, пераломам рэбраў і чэрапна-мазгавой траўмай. Фотажурналіста «Associated Press» **Сяргея Грыца** затрымалі, але неўзабаве адпусьцілі, апэратара НТВ **Канстанціна Марозава** зьбілі й разьбілі яму тэлекамэру, былі зьбітыя **журналісты «RenTV»**. Карэспандэнта радыё «Свабода» **Юр'я Сьвірка** супрацоўнік службы ахоўы прэзыдэнта ўдарыў у жывот пасьля просьбы пракамэнтаваць сытуацыю. Тэлежурналістам Латвіі, Расеі, Чэхіі не давалі магчымасьці перадаць відэаматэрыялы за мяжу Беларусі.

Зьвесткі пра затрыманьні і перашкоды дзейнасьці давераных асобаў кандыдатаў, назіральнікаў і сацыёлягаў 11—17 кастрычніка няпоўныя. Агульная колькасьць назіральнікаў, якіх сілаю выгналі з участкаў, і сацыёлягаў, якіх затрымлівалі за правядзеньне экзыт-пулу, вымяраецца дзясяткамі чалавек. Агульная лічба затрыманых даверaных асобаў кандыдатаў, якія распаўсюджвалі перадвыбарныя матэрыялы, вымяраецца сотнямі чалавек.

АШ

Мы граем кожны канцэрт як апошні

Лявон Вольскі, саліст «NRM»: Галоўнае — не баяцца зараз

«НН»: Якімі будуць наступныя сем гадоў?

Лявон Вольскі: Яшчэ сем?.. Я пра эміграцыю сур'ёзна ня думаў. Але ў мяне гадуецца дачка, і я не хацеў бы, каб яна была піяніркай. Гэта і трагічна, і камічна, фарсам патыхае, і вельмі непрыемна. Калі гэта будзе, я ў піянеры сваіх дзяцей аддаваць не зьбіраюся. То бок давядзецца ехаць кудысьці, дзе існуе беларускамоўная адукацыйная прастора.

Як толькі будуць адбывацца нейкія працэсы, будзем рэагаваць. Мы ўсё-такі дзяржава — маю на ўвазе «N.R.M.», — мы цяпер праводзім рэфэрэндум на сайце, будзем прымаць тытулы для міністраў, мой тытул будзе «мудры кіраўнік, шчасьця будаўнік». Потым будзем ствараць моладзевую суполку НРСМ.

«НН»: Апошні твой канцэрт — што б ты сказаў людзям?

Л.В.: Мы граем кожны канцэрт цяпер як апошні, бо кожны можа быць апошнім… Вы ня ведаеце, напрыклад, што расейскі «Ленинград» зьняты з продажу ўвесь. Забаронены канцэрт «Cannibal Corpse» у «Рэактары». У любы момант могуць забараніць любы канцэрт, і любы выхад можа быць апошні ў гэтым месяцы, гэтым годзе, таму мы граем цяпер з максымальнай аддачай. Што б я крыкнуў краіне… а нашто крычаць? Яна жыве сваімі законамі. Па вялікім рахунку, ідэя нацыянальная і адраджэнская — неўміручая, што паказваюць апошнія стагодзьдзі. І што б тут ні адбывалася, у кантэксьце гістарычным 10—20 гадоў нічога не вызначаюць. Нацыянальная ідэя — гэта адзінае, на чым можна нешта грунтаваць.

На цяперашні пэрыяд магу маладым людзям сказаць: галоўнае — не баяцца зараз.

Гутарыў Сяргей Харэўскі



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

КАЛЯНДАР

Лістапад

5 — **Хадасевіч (Лежэ) Надзея** (1904, Докш. р-н — 1983), французкая мастачка, грамадзкі дзеяч — 100 год з дня нараджэньня.

5 — **Алоўнікаў Ігар** (1954, Менск), піяніст, арганіст, пэдагог, народны артыст Беларусі, ляўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі — 50 год з дня нараджэньня.

11 — **Сушчэня Леанід** (1929, Баранав. р-н), вучоны ў галіне заалёгіі, акадэмік НАН Беларусі і Расейскай АН, замежны член Польскай і Літоўскай АН, заслужаны дзеяч навукі Беларусі — 75 год з дня нараджэньня.

12 — **Бальзукевіч Баляслаў** (1879, Вільня — 1935), скульптар — 125 год з дня нараджэньня.

12 — **Бурш Яша** (сапр. Анісяровіч Янка; 1929, Баранавічы), беларускі паэт і мастак, які жыве ў Польшчы, — 75 год з дня нараджэньня.

20 — **Аляксандар** (у сьвецкім жыцьці Шалай Аляксандар; 1879, Слуцак — 1937), протаярэй, новапакутнік Менскай япархіі — 125 год з дня нараджэньня.

20 — **Кошаль Антаніна** (1954, Смалявічы), спартсмэнка (спартыўная гімнастыка), трэнэрка, майстарка спорту СССР міжнароднае клясы, заслужаная майстарка спорту СССР, заслужаная трэнэрка Беларусі — 50 год з дня нараджэньня.

20 — **Снапкоўская Сьвятлана** (1954, Менск), вучоная-гісторык, пэдагог — 50 год з дня нараджэньня.

24 — **Каменскі Міхал** (1879, Магілёў. губ. — 1973), польскі астраном, стваральнік польскай камэтнай школы, член-карэспандэнт Польскай АН — 125 год з дня нараджэньня.

27 — **Рандаў Норбэрт** (1929), нямецкі перакладчык, літаратуразнавец, адзін з прапагандыстаў беларускай літаратуры ў Германіі — 75 год з дня нараджэньня.

Іскрынкі забавы на шэрых старонках

Ягор Конеў. Нямігі берагі. Аповесьць // «Маладосць», №7.

Злучыць разам старажытную ведзьму, эсэсаўцаў і Нямігу — гэта яшчэ трэба прыдумаць. Даўно ўжо стагналі, што ў нас няма масавай культуры. **Ягор Конеў (на фота)** спрабуе адказаць на гэты выклік. І хаця індустрыя, здольная такое чытво выбраць, падрэзаць, якасна спакаваць і распаўсюдзіць, у нас яшчэ пакуль не паднялася на ногі, высілкаў творцаў нельга не вітаць.

Конеў шукае забаўляльнасьці ў беларускай гісторыі і ў цудоўным. То сябар гаваркога ката распавядае страшныя гісторыі (**«Вартавыя»**), то Напалеона спыняе скамарох і ягоны вучань-мядзьведзь (**«Смаргонскі настаўнік і вучань»**), то тата жадае зарэзаць свайго сына і амаладзіцца — але сам трапляе пад нож (**«Рытуалы акультнай магіі»**).

Кірмашовая змрочнасьць кампэнсуецца адмысловай дасьціпнасьцю («Ня быць алькаголікам у Беларусі — значыць кідаць выклік грамадзтву»).

Высокая літаратура абвінаваціць Конева ў невыноснай павярхоўнасьці пэрсанажаў, якія зь лёгкасьцю перасковаюць з аднаго стану ў другі. Але такая *павярхоўнасьць* для масавай літаратуры звычайная, бо галоўнае — эфэкт. У Конева ён дасягаецца сьмехам і павучальнай маральлю.

Беларуская масавая літаратура прарастае. Аматарам яе варта зьвярнуць увагу і на творы Конева.

Андрэй Расінскі

НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

Гарачка У. **Даты: Вершы.** — Менск: Мастацкая літаратура, 2004. — 62 с. — (Дэбют). 1000 ас.

Пасьля супрацы з І.Логвінавым пралетарскі паэт «дэбютуе» яшчэ адным зборнікам у дзяржаўным выдавецтве. Шукайце выданьне ў «Кнігарні пісьменьніка».

Гужалоўскі А. **Музэі Беларусі (1941—1991).** — Менск: НАРБ, 2004. — 218 с.: іл. 100 ас.

Аўтар манаграфіі прасочвае лёс музэйных калекцый у ваенныя гады. Большасьць з 50 надрукаваных у кнізе фатаздымкаў публікуецца ўпершыню. У «Акадэмкнізе» цана 7850 руб.

На зямлі Залатавуста: Тураўшчына літаратурная: проза, паэзія, публіцыстыка / Рэд. У.Мазго. — Менск: Мастацкая літаратура, 2004. — 300 с.: іл. 1500 ас.

Побач са «Словам на Вялікдзень» Кірылы Тураўскага друкуюцца ўрыўкі зь «Песьні пра зубра» М.Гусоўскага й «Пана Тадэвуша» А.Міцкевіча, вершы У.Дубоўкі ды У.Караткевіча й інш. Уласна аўтары-тураўчане — Г.Дашкевіч, В.Папок, М.Клімковіч, А.Клімковіч — на такім тле губляюцца.

Полацак=Polatsk=Polazk: Фотаальбом / Аўт. тэксту і ўклад. І.Каліноўскі. — Менск: Беларусь, 2004. — 136 с. 3000 ас.

Наддзьвінскі горад-легенда з вышыні птушынага палёту й зблізу. Фатаздымкі дапаўняюцца ўрыўкамі зь вершаў, прысьвечаных гораду. Тэкст выданьня — на беларускай, ангельскай і нямецкай мовах. Цана 10710 руб.

Самусік А. **Помнікі гісторыі й культуры Беларусі: Вуч. дапам.** — Менск: БДЭУ, 2004. — 209 с.: іл. 500 ас.

Цана ў «Акадэмкнізе» 8620 руб.

Маніторынг парушэньняў правоў чалавека ў Берасьцейскай вобласьці: 2003—2004 гг. / Берасьц. абласн. аддзяленьне ГА «Праваабарончы цэнтар «Вясна». — Берасьце, 2004. — 98 с.

Тацяна Вабішчэвіч

Манэта з Чарадзеем

Нацбанк мае ў 2005 г. выпусьціць сэрыі манэт «Гарады Беларусі», «Помнікі архітэктуры Беларусі», «Сьвяты і абрады беларусаў», а таксама спартовую сэрыю і сэрыю ў гонар 60-годзьдзя Перамогі. Сэрыю «Ўмацаваньне і абарона дзяржавы» распачне манэта з выявай легендарнага полацкага князя Ўсяслава Чарадзея. У сэрыю «Заказьнікі Беларусі» ўвойдуць манэты з выявамі жывёл.

Меч за «Вайну»

На II Міжнародным фэстывалі ваеннага кіно імя рэжысэра Юр'я Озерава (Расея) прыз за найлепшы рэжысэрскі дэбют «Залаты меч» атрымаў беларус Пятро Крывастаненка. Ягоная кінастужка «Яшчэ пра вайну» атрымала таксама дыплём «За найлепшую песьню да фільму» (музыка Алега Елісеенкава, словы Алены Туравай).

Кніжная прэмія Бэн Ладэну

На прэстыжную амэрыканскую кніжную прэмію «National Book Award» вылучаны 567-старонкавы даклад незалежнай камісіі па расьсьледаваньні тэрактаў 11 верасьня. Даклад выйшаў у сьвет сёлета ў ліпені й быў прададзены ў колькасьці 1 млн асобнікаў. Ляўрэаты будуць названыя 17 лістапада. З 20 фіналістаў намінацыі «дакумэнтальная літаратура» 4 атрымаюць прэміі па 10 тыс. даляраў, астатнія — па 1 тыс.

Новы альбом «Рамштайну»

Нямецкі рок-гурт «Rammstein» выпусьціў новы альбом «Reise, Reise», куды ўвайшлі 11 кампазыцый. Гэта першы дыск гурту за апошнія 3 гады. Запісалі яго ў Гішпаніі пры суўдзеле сымфанічных аркестраў і хораў. З новым альбомам музыкі адправіліся ў турнэ.

Горад літаратуры

ЮНЭСКА ўпершыню ўвяла тытул «горад літаратуры»: на 2005 г. ім прызнаная сталіца Шатляндыі Эдынбург. У падтрымку гэтага рашэньня выступілі такія пісьменьнікі, як Джаан Роўлінг, М'юрыэл Спарк, Ен Рэнкін.

Шварцэнэгер №4

У 2005 г. пачнуцца здымкі чацьвёртай часткі «Тэрмінатара». Удзел у ёй клясычнага выканаўцы ролі Арнольда Шварцэнэгера пакуль пад пытаньнем: перамовы зь ім вяліся, але толькі наконт выканаўня эпізадычных роляў. Паводле чутак, аўтары маюць увесьці ў фільм новую мадэль кібарга.

Гамбровіч у Вашынгтоне

Вашынгтонскі тэатар «Scena» паставіў п'есу Вітальда Гамбровіча «Івона—прынцэса Бургундзкая». Гэтую ж п'есу абраў для сёлетняй пастаноўкі і наш Купалаўскі. Пасьля дваццаці паказаў у Вашынгтоне тэатар мяркуе паехаць з спэктаклем у Польшчу, каб паказаць яго на Гамбровічаўскім фэстывалі ў Любліне.

АВ; БелаПАН, Gazeta.pl

Пахаваньне пад фанфары рэфэрэндуму

За 10 мэтраў ад Васіля Быкава на Ўсходніх могілках 15 кастрычніка лёг яшчэ адзін народны пісьменьнік — там знайшоў вечны спачын Іван Шамякін.

ВІКТАР ШНІП

Пахаваньне адбылося напярэдадні рэфэрэндуму ціха і незаўважна: без рэпартажаў па тэлевізіі, без асаблівых абвестак на радыё. Пісьменьніка, які апошнім часам найбольш з усіх вядомых беларускамоўных выступаў у падтрымку ўлады, хавалі гэтыя самыя ўлады.

Шамякін падтрымліваў уладныя прапановы зь перакананьняў, але і таму, што, як сам прызнаваўся, баяўся памерці ў беднасьці. У пэртурбацыях пачатку 90-х «згарэлі» ягоныя ашчаджэньні: на кніжцы ў банку ляжала 90 тыс. савецкіх рублёў. Перамен Іван Шамякін не прыняў. Згадвалі, як на адзін зь пісьменьніцкіх зьездаў ён прыйшоў з атрыманым ганарарам: пачкі грошай за новы раман, складзеныя ў «авоську», пісьменьнік трымаў у сябе на каленях, усеўшыся на першы шэраг.

Нават рэфэрэндум 1995-га Іван Шамякін праглынуў як належнае. Адно што напісаў у другой палове 90-х два лісты на адрас Лукашэнкі зь мяккімі дакорамі: маўляў, галасавалі за дзьвюхмоўе, а атрымалі перавагу адной мовы. Адказаў на свае лісты Іван Пятровіч не атрымаў, чым гучна абураўся на Радзе Саюзу пісьменьнікаў: на звароты народных пісьменьнікаў хаця б адпіскамі заўжды адказвалі першыя сакратары ЦК КПБ. Але Лукашэнка, як выявілася, не Машэраў…

Для Шамякіна гэта быў шок. У сваёй апошняй кнізе мэмуараў «На апошнім перагоне» ён рэзка й крытычна выказаўся на адрас цяперашняга рэжыму. Ці толькі таму Лукашэнка не прыйшоў на пахаваньне народнага пісьменьніка? Напэўна, не. Само існаваньне літаратуры на беларускай мове падрывае ідэалягічныя пастуляты цяперашняга рэжыму.

Для арганізацыі пахаваньня была створана дзяржаўная камісія на чале зь віцэ-прэм'ерам Уладзімерам Дражыным. Саюз пісьменьнікаў быў адсунуты ад арганізацыі пахаваньня: «родная» арганізацыя Шамякіна, у кіраўніцтве якой ён займаў не апошнія пасады, выглядае задужа крамольнай пасьля народнага пахаваньня Быкава. Ад усяго Саюзу пісьменьнікаў дазволілі выступіць толькі старшыню Алесю Пашкевічу — і то адно на могілках. Нават праводзіць грамадзянскую паніхіду ў Доме літаратара дзяржкамісія не захацела, каб сытуацыя ня выйшла з-пад кантролю, як з Быкавым, — абралі Дом афіцэраў. Нагул, уся цырымонія выглядала кепскай пародыяй на быкаўскае пахаваньне: задачу «дагнаць і перагнаць» улады выконвалі ўсімі магчымымі сродкамі.

Перад пачаткам разьвітаньня зь пісьменьнікам каля Дому афіцэраў было малалюдна: прыйшло з паўтузіну пісьменьнікаў ды дзясяткі два студэнтак-філялягінь. Адам Мальдзіс гучна ганіў СМІ, якія абвясьцілі, што пачатак разьвітаньня будзе ў 10.30, а яшчэ ў 11 гадзін так нічога й не пачалося. Прычына затрымкі стала відавочнай на пачатку 12-й: да Дому афіцэраў пачалі аўтобусамі прывозіць школьнікаў і студэнтаў. За якія паўгадзіны ў сквэрыку зьявілася велізарная чарга, а ў навакольных прадавачак зьніклі гвазьдзікі, хаця куплялі іх досыць ашчадна — па дзьве на клясу.

Праходка з абыякавымі тварамі каля труны, сьмешкі й штурханіна ў чарзе, зрэдзьчасу зацікаўленасьць — так выглядала збоку разьвітальная чарга да Шамякіна. (Генэрал Мікалай Чаргінец потым у сваім разьвітальным слове скажа, што да Шамякіна прыйшла маладая зьмена, маладая Беларусь.) Ня ведаю, як пачуваліся шамякінскія сваякі, а мне было няёмка ад гэтай афіцыйнай хлусьні.

Апрача школьнікаў, былі дэлегацыі ад розных устаноў і арганізацый: ад Мінкульту, ад савету рэспублікі, асобна ўнесьлі вянок з надпісам «Прэзыдэнт Рэспублікі Беларусь». З афіцыйных асобаў залю наведалі Ўрал Латыпаў і Алег Праляскоўскі.

Не было відаць старых людзей — хатніх гаспадынь, якія лічыліся найбольшымі аматаркамі шамякінскіх твораў. Карэспандэнтка радыё «Свабода» Валянціна Аксак абабегла чаргу, але зь цяжкасьцю знайшла шамякінскіх чытачак толькі сярод тых, хто ведаў Шамякіна асабіста. Пік сваёй папулярнасьці Іван Пятровіч перажыў гадоў на 15. Сёньня ягоныя былыя прыхільнікі чытаюць Даніэлу Стыл і Дар'ю Данцову. Шамякін, нечакана для сябе, стаўся элітарным пісьменьнікам, якога апошнія гады перачытвае інтэлігенцыя.

Па-чынавенску суха гучалі афіцыйныя прамовы каля труны. Дражын у выступе пастаянна казаў, што Шамякін сваімі творамі выхоўваў патрыятызм. Міністар абароны Мальцаў з паперкі чытаў пра намаляваныя Шамякіным вобразы воінаў і партызанаў, выканкамаўскія чыноўнікі з Гомельскай вобласьці з паперкі чыталі словы пра свайго выдатнага земляка…

Бабулек-чытачак я ўбачыў толькі на могілках, куды прывезьлі хаваць Шамякіна. Праўда, і там яны да нябожчыка блізка не дабраліся: прывезьлі яго пад ганаровай вартай, а пасьля жалобнага мітынгу й пахаваньня адпелі й пахавалі. Труну апускалі пад гукі дзяржаўнага гімну і аўтаматныя залпы, пасьля чаго рота ганаровай варты пад бадзёры марш пайшла з могілак.

Камісія сьпяшалася: пахаваньне насуперак традыцыі прызначылі не на трэці дзень пасьля сьмерці (суботу), а на другі. Апошні дзень перад рэфэрэндумам, відаць, не хацелі засмучаць згадкамі пра сьмерць.

Аркадзь Шанскі

На новым параходзе нас няшмат

Славамір Адамовіч: «Маё пакаленьне ня выставіла і ня выставіць пісьменьнікаў, роўных Шамякіну»

Паэт Славамір Адамовіч знаходзіцца ў Нарвэгіі, дзе ён папрасіў палітычнага прытулку. На яго першую просьбу быў дадзены адмоўны адказ, цяпер разглядаецца апэляцыя. Якія ён мае шанцы застацца і што зьбіраецца рабіць у выпадку адмовы?

Славамір Адамовіч: Яшчэ з паўгоду чакаць да вясны, але, на жаль, найхутчэй, што і другі адказ будзе нэгатыўным. Я буду чакаць да канца, хачу праверыць, як ставяцца да эмігрантаў з усходу Эўропы нарвэскія ўлады. Да вясны буду яшчэ ў Рогнане, калі толькі не прыму нейкіх рэзкіх крокаў пратэставага характару, што магчыма. Сёлета адзін грузін спрабаваў сябе спаліць перад Стортынгам, праўда, яго ўратавалі і амаль адразу дэпартавалі.

За апошні час у Осла атрымала прытулак Ірына Громава, а два хлопцы з-пад Берасьця атрымалі нэгатыўны адказ ад Осла. Учора сястра пазваніла мне зь Менску, што там адміністрацыя хоча забраць пакой, у якім я прапісаны з 1994 г. Гэта, думаю, не праз запазычанасьць, бо калі я не пражываю, дык і не абавязаны аплачваць, паводле Жыльлёвага кодэксу. Тут іншае маецца на ўвазе — мо хочуць пазбавіць прапіскі і грамадзянства? Я ў тым пакоі пражыў ад 1991 г. Цікава, дарэчы, я ў Менску з 83-га, а пакой атрымаў толькі праз 8 гадоў, а прапіску яшчэ толькі праз тры, і тое, і тое, калі была наша ўлада. Мне тады моцна дапамагла будучая жонка Пазьняка, Галіна Вашчанка, якая была дэпутаткай гарсавету.

«НН»: Чаго Вам найбольш не стае ў Нарвэгіі?

С.А.: Таго ж, чаго не ставала б і ў Беларусі, як гэта ні скрушна. Літаратуры не хапае — дык і ў Беларусі яе б не хапала. Беларускага жыцьця бракуе — дык і дома яго няма. Правільна будзе толькі сказаць, што не хапае беларускіх жанчын. Тут іх няма, а дома яны ёсьць, нягледзячы на палітычную сытуацыю.

«НН»: Ясна, якія тэндэнцыі беларускага жыцьця Вас найбольш трывожаць. А што найбольш радуе?

С.А.: Што можа цешыць? Неяк думаў пра гэта цэлы дзень і так і не прыдумаў. Апрача выключна прыватных рэчаў, станоўчых момантаў у грамадзкім жыцьці няма. Гэта праблема любой дыктатуры. Прыходзіцца сыходзіць у прыватнасьці, і адчуваеш сябе нармальна толькі ў сям'і.

«НН»: Напэўна, не галасавалі 17-га?

С.А.: Як, калі ў Нарвэгіі няма нават консульства?

«НН»: Якая кніга за апошні год Вам падалася найлепшай?

С.А.: Мала магчымасьці чытаць тутатка. Чытаю толькі ў Інтэрнэце «Arche», «Дзеяслоў». Федарэнку іншы раз пачытаеш, Станкевіча — гэтыя сымпатыі сфармаваліся яшчэ зь беларускіх часоў. Вось чытаю Мудрова ў «Дзеяслове», спадкаемцу Шамякіна, бытапісальніка беларускага жыцьця. Я вырас з «Тутэйшых», дзе мы вялі гарачыя дыскусіі і скідалі з параходу сучаснасьці таго самага Шамякіна, але пры гэтым маё пакаленьне, на жаль, ня выставіла і ня выставіць ужо пісьменьнікаў, роўных Шамякіну, якія б змаглі, як Шамякін савецкую эпоху, зафіксаваць сваю ў творах. Шамякін апісваў у літаратуры беларускае савецкае жыцьцё, жыцьцё намэнклятуры. А з майго пакаленьня Асташонак адышоў, так і не дабраўшы тэкстаў. На новым параходзе нас няшмат, і ня можам мы тэкстамі пахваліцца.

«НН»: Нанава пераацэньваеце Шамякіна?

С.А.: Ды не, асабіста я цяпер, і тады глядзеў на яго не як на героя і не як на нікчэмнасьць, а як на нармальнага беларускага пісьменьніка, прычым граматнага, чаго не пра кожнага зь сёньняшніх скажаш.

«НН»: Тое ж і ў паэзіі?

С.А.: Хадановіч з «НН» запамінаецца. Пасьля Адамовіча гэта другі пясьняр той грамадзка-палітычнай сытуацыі, якая ёсьць у Беларусі. Пра маладзейшых не выпадае гаварыць. Я чакаў, што дзе-дзе, а ў паэзіі павінны зьявіцца яшчэ асобы, выкарыстаць унікальны час — вось як тыя хлопцы ў бізнэсе выкарысталі той час, каб сабраць пачатковы капітал, — не, паэтычныя спробы ёсьць, а імя не зьяўляецца. Пакуль сам не загучыш, ніхто не раскруціць. На жаль, акрамя спэцыфічнага голасу Хадановіча іншых новых пакуль не гучыць. Канкурэнцыі няма, а гэта расслабляе, няма крытэраў для ўласнай самаацэнкі.

Барыс Тумар, Осла

«Arche» пад забаронай

Часопіс «Arche» выціскаюць зь дзяржаўнай сеткі распаўсюду. Цягам некалькіх дзён нумар, прымеркаваны да 10-годзьдзя Лукашэнкавага кіраваньня (№4 за 2004 г.), адна за адной адмовіліся прадаваць менскія кнігарні — «Веды», «Кнігарня пісьменьніка», «Падпісныя выданьні». Разам з «лукашэнкаўскім» нумарам адміністрацыі кнігарняў запатрабавалі забраць і папярэднія выпускі часопісу. На пачатку гэтага тыдня ад распаўсюду нумару адмовілася аб'яднаньне «Белкніга».

2 кастрычніка нумар быў сканфіскаваны на беларуска-польскай мяжы ў Зьмітра М. У цягніку «Менск—Варшава» ў Берасьці пры надглядзе асабістых рэчаў памежнікі зацікавіліся, навошта хлопец вывозіць часопіс за мяжу. Адказ «Пачытаць у дарозе» іх не задаволіў. «Чытаць трэба творы Маркса і Энгельса», — патлумачылі памежнікі й без тлумачэньняў сканфіскавалі нумар, напісаўшы ў пратаколе, што часопіс нельга вывозіць за межы краіны.

АШ

Брыдка

Працяг са старонкі 4.

Потым іх лічылі, разьмяркоўвалі сакратарка камісіі, намесьніца старшыні ды нейкая жанчына ў цывільным, якая прысутнічала ўвесь дзень на ўчастку. Пабачыць, як яны лічылі і колькі налічылі, мы ня здолелі.

Нам было дазволена лічыць бюлетэні кандыдатаў у парлямэнт. На нашым участку вылучаліся тры кандыдаты: два ад улады і адзін ад апазыцыі. Падчас разьмеркаваньня бюлетэняў я зьдзівілася, што кандыдат ад апазыцыі ішоў нароўні з кандыдаткай ад улады. Тады старшыня-дырэктарка пачала ставіць яшчэ адзін знак на бюлетэнях апазыцыянэра, каб перапрацаваць іх у сапсаваныя. Стос сапсаваных такім чынам бюлетэняў быў прыбраны без падліку ў недасягальнае для нас месца.

Нам, простым членам камісіі, заставалася толькі чакаць, калі ж скончаць варажыць над бюлетэнямі з рэфэрэндуму. Каб не было сумна, пачалі накрываць на стол, каб павячэраць, бо ня ведалі, калі нас адпусьцяць дахаты.

Празь некаторы час старшыня паднесла нам пратакол вынікаў галасаваньня, каб мы паставілі подпісы. Цяжка было пераадолець адвечную боязь да ўлады. Але, зьбянтэжаная непрыхаванымі махінацыямі, сабраўшы ўсю сваю волю, я адмовілася падпісацца пад тымі штучнымі лічбамі, у падліку якіх ня брала ўдзелу. Мая адмова выклікала спачатку непаразуменьне, а затым злосьць і нянавісьць старшыні і ейных падпявал.

Так без майго подпісу павезьлі здаваць вынікі. Калегі паспачувалі маёй мажлівай нясьветлай будучыні ў гэтай установе, выпілі (залілі сумленьне) і а другой ночы разышліся па хатах, каб назаўтра пачаць будаваць новаабраную будучыню.

P.S. Ня ведаю, як падпісацца, хай будзе проста «настаўніца, малады спэцыяліст», mail.ru.

Каб заўтра надышло

На мітынг «Сваю будучыню мы выбіраем сёньня», зладжаны апазыцыяй у Гомелі 10 кастрычніка, сабралася няшмат народу: актывісты, студэнты і пэнсіянэры. Слухалі выступы, пазяхалі, выкрыквалі: «Гучней!», «Нічога не чуваць». Выступоўцы прамаўлялі млява, без імпэту. Трохі ажываліся, калі мэгафон у свае рукі ўзяў нейкі мужчына (на жаль, ня ведаю прозьвішча — хтосьці з БНФ ці ПКБ). Але ён і казаў гучней за астатніх, і без паперкі, і «па дзелу». Шмат яскравых «бэтэшных» прыкладаў «на злобу дня». Людзі ажываліся, нават запляскалі, засьмяяліся. Але потым усё зноў сьціхла і павісла ў нейкім чаканьні.

Ва ўлётках з запрашэньнем наведаць імпрэзу было, паміж усяго астатняга, паведамленьне, што будуць раздаваць кніжкі П.Шарамета (суаўтарка не была пазначана) «Выпадковы прэзыдэнт». Пра мастацкія каштоўнасьці канкрэтнага твору я сказаў бы шмат, ды навошта. Кніжка, дзе азначэньне «Беларусь» сустракаецца надзвычай рэдка, часьцей як цытата, а так скрозь ідзе «Белоруссия», і пры чытаньні якой міжволі ўзьнікае думка, якія добрыя ў нас суседзі на ўсходзе — ёсьць на каго пасадзяваецца. Бачылі мы гэтыя спадзяваньні — дэпутаты Дзярждумы на выбарчых участках зь іхнімі «Ў мяне заўваг няма». Не цікава мне ведаць, які кепскі чалавек Лукашэнка ў асабістым жыцьці. А перачытваць тое, што вядома пра яго з расейскіх мэдыяў і перапісанае ў айчынным друку за ўвесь час яго праваньня — навошта? Каб падсумаваць? Хацелася б забыць хутчэй. Але цікавасьць да кніжачкі адчувалася і дагэтуль адчуваецца. Просяць дастаць, каб пачытаць, спадзяюцца даведацца нешта новае. Прычым, што дзіўна, цікавасьць існуе і з боку праціўнікаў, і з боку сяго-таго з прыхільнікаў прэзыдэнта. Дзіўныя для мяне і першыя, і другія. Навошта гэта першым, калі ты і так усё ведаеш, і другім, калі за яго галасуеш ды лаешся, як толькі хто пачне з крытыкай мяшацца. Тое самае было і на плошчы. Актывісты з тых, хто падтрымлівае, але ад актыўнага ўдзелу ўстрымліваецца, і перакананыя прыхільнікі рэжыму — усе аднолькава, зь нецярплівасьцю чакалі, калі нарэшце пачнецца раздача. А раздачы не было. Яно і зразумела. Сярод іншых на плошчы сабралася нейкая колькасьць акуратна апранутых маладых мужчын. Стаяць па аднаму, па два, маўчаць, пазіраюць. За перадвыбарную кампанію кожны, хто хацеў, ужо атрымаў добрую порцыю зносінаў на афіцыйным узроўні. Стаміліся. Пачалавечы можна зразумець хлопцаў і дзяўчат, у якіх пачалося навучаньне, а хутка сэсія. Тым ня менш, абяцалі. І патроху пачалі зьяўляцца на руках першыя экзэмпляры з матрошкай на вокладцы. Але ішло ўсё марудна, і нездаволенасьць нарастала. Таму вырашылі ўсё ж паскорыць справу. І тут пачалося. Наведвальнікі мерапрыемства адразу забыліся на выступоўцаў, і ўвесь невялікі натоўп рынуўся на салодкае. Скончылася. Даюць у другім месцы. Усе туды. Назіраць за гэтым было страшна. Спадары міліцыянты, што сабраліся ўбаку, пачалі сьмяяцца. Алесь Карніенка, зьнясілены перадвыбарнай кампаніяй, толькі і здолеў прамовіць: «Капец». Усё абышлося без хапуноў, але як жа ж было прыкра.

Нельга выкарыстоўваць брудныя і сумнеўныя мэтады. Ці не павінны мы ствараць новых грамадзян новае краіны? Тое, што мы піхаем у галовы людзям, там і застаецца. Бруд і нэгатыў. Тое, што яны маюць магчымасьць бачыць штодзень па ТВ. Мабыць, лепш будзе, калі мы ад гэткіх будзем адрозьнівацца ня толькі пазыцыямі па нейкіх пытаньнях, але і мэтадамі дасягненьня мэтаў.

Андрэй Ананьеў, Гомель

Пра «Панскага Салаўя»

П.Якубовіч у сваёй «Беларуси сегодня» вучыць і вучыць газэтчыкаў: маўляў, ня трэба скажаць факты, блытаць журналістыку з палітычнай дзейнасьцю і г.д. А што ж «спэцвыпуск» «СБ» зь безгустоўнымі партрэтамі Лукашэнкі на кожнай паласе, па ўсіх парамэтрах блізкі да ўлёткі, — не палітычная замова? Дый факты ў ім скажоныя, прынамсі тыя, што тычацца яўрэяў. Сэндэр Урыцкі — галоўны рабін не Беларусі, а адной з суполак, Юдэйскага рэлігійнага аб'яднаньня. Праведнікаў народаў сьвету ў Беларусі ня чвэрць ад «ужо ўнесеных у ганаровыя сьпісы», а саракавая частка (прыкладна 500 чалавек з больш як 20 тысяч, выяўленых у сьвеце). І закон аб друку парушаны: няма пазнакі «Бясплатна» або «Цана дагаварная». Іншая газэта дастала б ужо і папярэджаньне за такое.

Вольф Р., Менск

Südarbeiter на Маладэчаншчыне

Глядзеў на БТ рэпартаж пра тое, што дзякуючы «беларускаму эканамічнаму цуду» падзарабіць у нас імкнуцца нават сяляне з Украіны. Але й наша ўласнае становішча ў некаторых мясцовасьцях не нашмат лепшае...

На «газавых» урачыстасьцях у Паставах прэзыдэнт заявіў: «Беларусь бачыцца ня толькі нам, але і ўсім у Эўропе і сьвеце як некрануты запаведны куток», і гэта лічыцца добрай асновай для разьвіцьця гэтай зямлі, у прыватнасьці — турызму. Можа, некалі так і будзе, але рэаліі сёньняшняга жыцьця выяўляюць пакуль што «турызм» другога кшталту. Да прыкладу, у Маладэчанскі раён прыяжджаюць на сезонныя заробкі жыхары са Століншчыны! А як інакш? Глыбіня адметная ня толькі сваёй рамантычнай некранутасьцю, але і невысокім разьвіцьцём прамысловай часткі эканомікі. Гэта, адпаведна, вымушае палескіх жыхароў катораз год адмяраць паўкраіны дзеля хлеба надзённага...

Сяргей Брадавы, Маладэчна

Пра помнік у Сьвечках

Маем лецішча ў вёсцы Баяры Маладэчанскага раёну. Месцы гэтыя прыгожыя і цікавыя. Паўсюль пагоркі, парослыя лесам, лагчыны з утульнымі вёскамі. З часоў старажытнай Літвы гісторыя пакінула тут гарадзішчы, руіны замкаў, храмы.

Вандравалі мы з жонкай на роварах. Некалькі гадзін — і ты ўжо на ўскраіне мястэчка Гарадок дзівішся на старажытнае гарадзішча, яшчэ паўгадзіны — і ты ў вёсцы Хоўхлава ўяўляеш сабе XVI ст. і Сымона Буднага, які калісьці друкаваў тут кнігі. Трохі ўбок — і ты ў Вязынцы абдымаеш велізарныя дубы і ўглядаешся ў чыстае люстэрка запруды, на беразе якой стаіць хата, дзе нарадзіўся Я.Купала.

Цікавы выпадак адбыўся ў Плябані. Палазіўшы па рыштаваньнях (іх пакінулі рэстаўратары) касьцёлу, збудаванага ў сярэдзіне XIX ст. у эклектычным барока-гатычным стылі, і прыгадаўшы, што ў ім хавалі зброю ўдзельнікі паўстаньня Каліноўскага 1863—1864 г., сядаем на ровар і празь пяць хвілін апынаемся каля невялічкага лесу на ўзгорку. Далей па дарозе вёска Сьвечкі. Тутака ў 1863 г. расейскімі салдатамі быў разьбіты атрад паўстанцаў на чале зь Юлянам Бакшанскім (самаму малодшаму ўдзельніку, гімназісту 7-й клясы Менскай гімназіі, толькі споўнілася 15 гадоў). Лес на пагорку — гэта старыя могілкі, дзе паўстанцы пахаваны. Ад іх тут засталіся толькі камяні зь ледзь бачнымі літарамі. Шыльды па помніку паўстанцам ужо даўно няма. Замест яе тут аб'явіўся драўляны шчыт з надпісам, які нас вельмі зьдзівіў: «Паўстанцам Тадэвуша Касьцюшкі».

Помнім добра, што рабілі, —
Як нас дзёрлі, як нас білі.
Дакуль будзем так маўчаці?!
Годзе нам сядзець у хаце!

Упрыгожыўшы кветнік вакол помніка, мы пакінулі яго з суперэчлівым уражаньнем. Добра, што ў нас памятаюць імя Касьцюшкі, але блага, што для бальшыні з нас тыя 80 гадоў, што аддзяляюць яго паўстаньне ад паўстаньня Кастуся Каліноўскага, ужо нічога ня значаць.

Зьміцер Зінкавецкі, Менск

СВОЙ СЛОЎНІЧАК

Ніна Мацяш, Нівы

Дарагія «нашаніўцы»! («Нашы Ніўляне», сказалі б у нас, па аналёгіі з тым, як называюць жыхароў маёй роднае вёскі Нівы — ніўляне, як лісічане (в.Лісічыцы), пясчане (в.Пескі), але — хрышакі (в.Хрыса), беразьлюкі (г.Бяроза), але — маняўцы (в.Манявічы), ярцаўцы (в.Ярцавічы) і г.д.

Ваша прапанова даслаць жменьку дыялектных словаў, не зафіксаваных у беларускіх слоўніках, падалася цікавай. Адгукаюся, дасылаю тое, што адразу, безвысільна ўзгадалася. Падаю ў альфавітным парадку і ў нарматыўна адаптаваным выглядзе, бо ў нашай мясцовасьці маўленьне даволі адметнае. Да прыкладу, ня *конь*, а *кунь*, ня *кот*, а *кут*.

Беляхцець — мільгацець, прасьвечвацца, пераліявацца: «Нацягнула ажурную кофту на голае цела, а яна аж беляхціць уся, дзірок процьма, ды вялікія, аж беляхціць».

Вошалап, ошалап (пагардл.) — тупы, някемны, няўвішны чалавек: «От, вошалап, ня мог дадумацца, як галіну падвязаць».

Гільгітаць — казытаць: «Ой, толькі не гільгіч мяне, бо я аж слабну ад сьмеху». «Глянь, што там у мяне на шыі, нешта гільгіча».

Дахна — зваротак, сярэдняе між дачкой і дачушкай, дочухна: «Схадзі, дахна, у склеп, набяры буракоў».

Жыткі — наготкі, календула: «А я ніякіх кветак у гародчыку больш ня сею, адны жыткі, гэтак я іх люблю».

Заразом — за адным разам, увадначас, адначасна: «Пойдзем па хлеб, то заразом і алею купі, бо выйшла (няма, скарысталі)».

Заранёў — вельмі рана; загодзь: «Нешта ты сягонь заранёў зьявіўся, і паснедаць яшчэ ня ўсьпеў». «Я заранёў дам яму грошы, каб ня думаў, што задарма рабіцьме».

Згопалу — зьнянацку, раптоўна, нечакана: «Індык як наляціць ззаду на плечы, дык я згопалу ледзь ня ўмлела».

Змаяваць, як май змаяваць — зьнікаць, зьнікнуць бясьсьледна, прапасьці: «Думала, знайду яго, гада, то ўжо дастане на ўсю катушку за сваю пакасьць, а яго як май змаяваў, анідзе».

Зумысна — спэцыяльна, назнарок: «Ён зумысна прыехаў, каб пагаварыць са мною». «Ты што гэта, зумысна падстроіў, каб я на цягнік ня ўсьпела?»

Зялепуха — насьпелая садавіна; малое, падлетак, звычайна дзяўчынка: «Ня рвіце яблыкаў, яны ж яшчэ зусім зялепухі, жываты балецьмуць». «Зараз тым, каму пад васямнаццаць, на тых танцах і рабіць няма чаго, там адна зялепуха боўедзь што вычварае».

Кацярынка, кацярынкі — астры: «Сяголецьця ўсю маю кацярынку сьлімакі панішчылі, усё лісьце пааб'ядалі, адны ражэнчыкі тырчаць. Другіх кветак не чапілі, а кацярынкі аніводненькай не мінулі».

Кузака, кузакі — насякомае, -ыя, кузуркі: «Глянь, што гэта за кузака па лістку паўзе?»

Кялецаць, скялецаць — зрабіць нешта абы-як, сяк-так, неахайна, непрыгожа: «Ну й варэнікаў ты накялецала! І два разы не ўкусіць, і за раз у рот ня ўціснуць».

Нагабаць — напаткаць, знайсьці: «Пайшла на базар, ды толькі бяду сабе нагабала: гэта ж усе мае грошы з сумкі выразалі…»

Нататэе — назло, наўмысна, знарок: «Ты мне хіба нататэе робіш, каб я зьлуўся, спакою ня меў».

Нацякнуць — намякнуць: «Ты б хоць нацякнуў мне, каб я не казала ім пра гэта».

На цырлах хадзіць — моцна дагаджаць, на дыбачках, на пальчыках хадзіць: «Як нагаравалася за першым, дык цяпер на цырлах ходзіць перад новым мужыком, ды яшчэ і нашмат маладзейшым за яе».

Перапарэць — быць па часе, запазьніцца, быць запозьненым: «Перапарэла мне ўжо пра замуж думаць, мае равесьніцы ўжо ўнукаў калышуць».

Пляга — бяда, хвароба: «А то ж і плягі на цябе няма ніякай, алкаш няшчасны!»

Прагапіць — прамаргаць, упусьціць шанец: «Трэба было яшчэ ўчора тое сянко згрэбсьці, а я прагапіў, а цяпер вось чакай, пакуль зноў прасохне. Гэткая лева ўляпіла, вады па калена!»

Прызялeньваць, прызеляніць — прычароўваць, прычараваць: «Ты хіба прызеляніла свайго ненагляднага, і на крок цябе ад сябе не адпускае, вачэй ня зводзіш!»

Прыстойкацца, прыстойквацца — прыпыніцца, спыняцца, запыняцца: «Думала, прыстойкаюся на хвілінку, а бач, ужо цэлую яму тут з табою выстаяла, так доўга балакаем».

Рызанка, рызачка — рэзі ў жываце, колікі: «Мабыць, зьеў нешта ня тое на тым вясельлі, як зарэзала ў жываце, то хоць было на сцэны лезь, такая рызанка схапіла». «Гэта ж залез нехта ў склеп і ўсю маю закатку забраў, каб яго рызачка ўзяла».

Сьсякнуць — рэзкім рухам зрушыць шыйныя пазванкі, траўмаваць: «Ты ж глядзі, не сьсякні мне дзіця, галоўку рукою падтрымвай!»

Цьвёрда заснуць — моцна заснуць: «А мы пасьля дарогі намучаныя і гэтак цьвёрда заснулі, што й нават ня чулі, што ў хаце робіцца, што людзі б'юцца».

Шухля — трасца, ліхаманка: «Якая цябе шухля тут носіць, чаго ты калоцішся і нас калоціш, чаго ты хочаш ад нас?» «А каб цябе шухля трэсла, як ты мае апошнія ўжо грошыкі вытрас!»

Ятрыць — нэрваваць, нэрвавацца, злаваць, злавацца: «Ты зьмілуйся, перастань ужо ятрыць мяне, бо і ў мяне нервы не залезныя!».

Ніна Мацяш, Белаазерск

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

«Прозьвішча «Рамашчанка» я запомню назаўсёды»

Перад футбольным матчам Італія—Беларусь (4:3) галкіпэр гаспадароў Джанлюіджы Буфон паабяцаў, што ягоная зборная ня толькі пераможа беларусаў, але і «парве» іх. Маўляў, пасьля паразы ад славенцаў італьянцам мусова рэабілітавацца перад сваімі заўзятарамі.

WWW.IT.SPORTS.YAHOO.COM

Італьянцы радуюцца нялёгкай перамозе над беларусамі. Вынік матчу Беларусь—Італія быў адной з галоўных спартовых сэнсацыяў дня.

Пасьля матчу Буфон заявіў: «Я і да серады ведаў, хто такі Рамашчанка. Але цяпер запомню гэтае прозьвішча надоўга». Паўабаронца маскоўскага «Дынама» забіў два галы-прыгажуны ў вароты аднаго з найлепшых галкіпераў сьвету.

Вынік матчу мог прэтэндаваць на галоўную сэнсацыю 13 кастрычніка (беларусы выйгралі другі тайм — 3:2), каб ня зборная Расеі, якую заасфальтавалі партугальцы — 1:7. На расейскіх сайтах журналісты і аматары ўшчувалі сваіх: «Ну, можна ж па-людзку і прыгожа прайграць, як, напрыклад, беларусы». А сёй-той задаўся пытаньнем: «Ці дазваляе саюзная дамова перацягнуць колькі беларускіх футбалістаў пад расейскі трыкалёр?»

Галоўны вынік матчу Італія—Беларусь таксама і ў тым, што наша зборная падарыла нам надзею як мінімум да сакавіцкага двубою са славенцамі. Прынамсі, у нас ёсьць гульцы, якія ўмеюць і, галоўнае, жадаюць гуляць!

Іншыя нашы суседзі, літоўцы, стварылі маленькі цуд у Вільні, згуляўшы ўнічыю з гішпанцамі — 0:0. У Літве мала хто верыў у посьпех свае дружыны. Славуты баскетбаліст Арвідас Сабоніс заявіў журналістам: «Мяркую, лік будзе 3:1 на карысьць гішпанцаў. Я літоўскі патрыёт, але не ідыёт». Палякі выйгралі ў трох матчах запар.

Не абышлося і без палітыкі. 9 кастрычніка ў Сараеве зборная Босьніі гуляла адборачны матч з Сэрбіяй. Паліцыяй былі зроблены беспрэцэдэнтныя захады бясьпекі. Перад уваходам на стадыён забіралі парасоны і нават мабільныя тэлефоны. Нягледзячы на гэта, паўсюль узьнікалі бойкі паміж басьнійскімі і сэрбскімі заўзятарамі, што прыехалі і зь Белграду, і з Сэрбскае краіны. Пасьля матчу аўтобусы з сэрбамі ад'ехалі ад стадыёнаў пад узмоцненым канвоем і бяз шкла. Ім яшчэ пашанцавала, што матч адбыўся 9 кастрычніка. Бо 14-га басьнійскія сэрбы афіцыйна прызналі, што на іх сумленьні 7 тысяч забітых з мусульманскага анкляву ў Срэбраніцы. На колькі дзён раней гэтыя зьвесткі — і заўзятарам-сэрбам на трыбунах мала не падалося б. А футбалісты разышліся мірам — 0:0.

І напрыканцы пра рэфэрэндум.

У пачатку мінулага тыдня БелТА бадзёра адрапартавала: «Беларускія хакеісты прагаласавалі за сваю краіну». Напярэдадні ад'езду ў Латвію на матчы 1/4 фіналу Кантынэнтальнага кубку (15—17 кастрычніка) хакеісты чэмпіёну Беларусі «Юнацтва» на чале з галоўным трэнэрам Міхаілам Захаравым узялі ўдзел у датэрміновым галасаваньні на рэфэрэндуме і выбарах. Трэнэр заявіў: «Мы з чыстым сумленьнем едзем на гэтыя прэстыжныя спаборніцтвы, на якіх пацьвердзім высокую спартовую рэпутацыю Беларусі. Мы прагаласавалі за сваю краіну, у якой жывём, якая дае нам усе ўмовы для далейшага разьвіцьця беларускага спорту».

Ня выйшла. У паядынку са сваімі асноўнымі канкурэнтамі за выхад у паўфінал, «Казцынк-Тарпэда», беларусы саступілі. На лістападаўскі паўфінал у Нарвэгію едуць казахі.

Так што — тут ці на рэфэрэндум датэрміновa ходзіш, ці ў хакей гуляеш. Трэцяга ня дадзена.

Алег Раявец

Прэзыдэнту Рэспублікі Польшчы
Маршалку Сойму Польшчы
Міністру замежных спраў Польшчы
У амбасаду Польшчы ў Рэспубліцы Беларусь

Захавайце «Ніву»

Зварот прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі

Падзеі апошняга часу на Беласточчыне ўсхвалявалі беларускую грамадзкасьць. Пасьля ўваходжаньня Польшчы ў Эўразьвяз здавалася, што разьвіцьцё нацыянальных меншасьцяў у краіне стане адным з прыярытэтных кірункаў унутранай палітыкі дзяржавы. Важным кірункам такой падтрымкі ёсьць спрыяньне беларускім дэмакратычным колам у Польшчы. Такой плыньню на Беласточчыне ўжо шмат гадоў зьяўляецца асяродак, які склаўся вакол штотыднёвіка «Ніва». Гэтая газэта — праваднік эўрапейскай дэмакратыі ня толькі сярод беларусаў Польшчы, яе існаваньне — гэта значная маральная падтрымка беларусам мэтраполіі, дзе сёньня ўсялякімі спосабамі нішчыцца незалежны дэмакратычны друк.

Замест гэтага на Беласточчыне знайшліся сілы, якія распачалі дзеяньні дыскрымінацыйнага характару ў дачыненьні да беларускай меншасьці ў Польшчы. Па сутнасьці, ідзе зьнішчэньне штотыднёвіка «Ніва» і праз гэта — праяў нацыянальнага самавыяўленьня беларусаў у Польшчы. Тое, што такія дзеяньні супалі з момантам абвастрэньня перасьледу дэмакратычных сілаў у Беларусі і маючымі адбыцца выбарамі ў Польшчы, прыводзіць да думкі, што адбываецца выкананьне палітычнага заказу. Зыходзячы з гэтага, заклікаем грамадзкасьць Польшчы і вярхоўныя ўлады краіны зьвярнуць увагу на сытуацыю, якая склалася вакол тыднёвіка «Ніва». Мы перакананыя, што ў палітычных колах польскай дзяржавы дастаткова шмат здаровых сілаў, якія разумеюць недапушчальнасьць такой дыскрымінацыі і перасьледу людзей паводле нацыянальнай прыналежнасьці. Спадзяёмся, што здаровы сэнс возьме верх і беларуская меншасьць у Польшчы будзе мець права на сваё нацыянальнае выяўленьне.

Зварот падпісалі наступныя асобы:
Лявон Баршчэўскі, старшыня Беларускага ПЭН-Цэнтру, Адам Глёбус, пісьменьнік, Уладзімер Арлоў, пісьменьнік, Уладзімер Хільмановіч, Фонд імя Сапегі, Пётра Садоўскі, пасол Беларусі ў Нямеччыне (1992—1994), Сяргей Антусевіч, дэпутат Гарадзенскага гарсавету, Валеры Булгакаў, рэдактар часопісу «ARCHE», Андрэй Казакевіч, палітолаг, Анатоль Сідарэвіч, гісторык, Андрэй Дынько, рэдактар «Нашай Нівы», Юры Станкевіч, пісьменьнік, Усевалад Рагойша, дацэнт БДУ, Юры Пацюпа, паэт, Дзьмітры Бугаёў, прафэсар БДУ, Уладзімір Сіўчыкаў, выдавец, Зьміцер Бартосік, бард, Андрэй Скурко, намесьнік рэдактара «НН», Сяргей Сматрычэнка, першы намесьнік старшыні Беларускага ПЭН-Цэнтру, Мікола Маркевіч, рэдактар зачыненай «Пагоні», Алесь Бяляцкі, кіраўнік зачыненага праваабарончага цэнтру «Вясна», Валянцін Стэфановіч, праваабаронца, Віктар Сазонаў, журналіст, Алесь Астроўскі, прафэсар Гарадзенскага ўнівэрсытэту, Тадэвуш Гавін, дзяяч Саюзу палякаў Беларусі, Валянцін Тарас, літаратар, перакладчык, Пятро Васючэнка, загадчык катэдры беларусістыкі МДЛУ, Арцём Лява, Зьміцер Дзядзенка, Наста Бакшанская, Ірына Дарафейчук, Сяргей Лескець, Вераніка Дзядок і яшчэ каля ста чалавек.

НА ПРАВОХ РЭКЛЯМЫ

Плюсы Эўразьвязу для гаспадаркі

1 траўня Польшча стала паўнапраўным сябрам ЭЭ. Гэтая дата зьяўляецца толькі сымбалічнай ці яна пацягнула за сабой заўважныя зьмены? На гэтае пытаньне адказвае дырэктар Бюро супрацоўніцтва з замежжам Агульнапольскай эканамічнай палаты **Ірэнэюш Ужасьнеўскі**:

— У той галіне, якой мы займаемся, зьмены відаць: могуць свабодна перамяшчацца бізнэсоўцы са шматлікіх краін. Няма прастояў, няма камунікацыйных праблем. Зь дзяржавамі Эўразьвязу мы даўно супрацоўнічаем, і цяпер я ня бачу асаблівых зьмен у самім супрацоўніцтве. Эканоміка цягам нейкага часу мусіць прызвычаіцца да новай сытуацыі, новага заканадаўства ці новых правілаў. Польская эканоміка разьвіваецца нармальна. Павялічваецца экспарт: упершыню за доўгі час Польшча мае дадатны балянс у гандлёвым абмене.

— Але ж у Польшчы вырасьлі цэны — гэта такое ж наступства інтэграцыі з ЭЭ, як і дадатны балянс.

— Гэтага нельга палічыць. У эканоміцы кожны эфэкт ёсьць сумай шэрагу элемэнтаў — і разьвіцьця эканомікі, і разьвіцьця прадукцыі, і падбору прадуктаў, і якасьці гэтых прадуктаў, і ўраджайнасьці канкрэтнага году, і мытных ставак. Такім чынам, нельга дакладна акрэсьліць, ці тут 1% тае прычыны, а 2% іншай.

Наступны наш суразмоўца — **сп.Рафал Длужнеўскі**, начальнік аддзелу замежных інвэстыцый у дэпартамэнце замежных інвэстыцый і падтрымкі экспарту Міністэрства эканомікі Польшчы.

— Дэпартамэнт займаецца найперш фармаваньнем палітыкі ўраду ў галіне стымуляцыі наплыву непасрэдных замежных інвэстыцый у Польшчу.

Сам факт далучэньня да ЭЭ няшмат памяняў у нашай працы. Дзяржаўная дапамога павінна адбывацца ў рамках т.зв. дапаможных праграм, таму дэпартамэнт выпрацаваў шэраг распараджэньняў, каб дапамога экспарцёрам адбывалася на падставе настрыфікаваных і ўзгодненых з Эўрапейскай Камісіяй праграм дапамогі.

— Як збоку выглядае Беларусь і яе эканоміка?

— Калі зірнуць на эканамічныя паказчыкі, то можна прыйсьці да высновы, што беларуская эканоміка расьце. Ад 1996 г. Беларусь адзначае эканамічны рост: у 1996—1997-м гадох на ўзроўні 10% у год, а ад 1997-га — на ўзроўні 7% у год. Расейскі эканамічны крызіс спрычыніўся да запаволеньня эканамічнага росту Беларусі. Аднак розныя паказчыкі сьведчаць, што беларуская эканоміка цудоўна разьвіваецца. Праўда, гэта ніяк не адлюстроўваецца ў рэчаіснасьці, якую мы добра ведаем зь неафіцыйных польска-беларускіх кантактаў, і не адбіваецца на стандарце жыцьця краіны.

— Ці можна зь Беларусяй супрацоўнічаць?

— Вядома, так. Беларусь прапануе шэраг інвэстыцыйных прэфэрэнцый: напрыклад, фірмы, замежны капітал у якіх перавышае 30%, на 3 гады вызваляюцца ад падаходнага падатку. Гэта вельмі сур'ёзны элемэнт заахвочваньня да супрацы. Аднак польскія прадпрымальнікі інфармуюць пра шэраг цяжкасьцяў на беларускім рынку. Асабліва гэта датычыць адміністрацыі, у прыватнасьці фінансава-падатковых і мытных органаў. Ёсьць скаргі і на бюракратыю, якая пануе ў краіне. Але ў цэлым сыстэма выглядае прывабна.

— Якім чынам вы заахвочваеце польскіх прадпрымальнікаў да прысутнасьці на замежных рынках?

— Каб польскі экспарт быў больш прывабны і польскія прадпрыемствы мелі магчымасьць дзейнічаць на рынках іншых дзяржаў, мы карыстаемся інструмэнтамі фінансавага і нефінансавага характару. Мы канцэнтруем увагу ў першую чаргу на сыстэме пакрыцьця затрат на экспартныя сэртыфікаты ці рэгістрацыю таварных брэндаў і марак за мяжой.

Другім істотным элемэнтам для экспартэраў ёсьць сыстэма датацый для ўдзелу ў эканамічных місіях і выставах-кірмашох. Мы вядзём сьпіс гандлёва-выставачных імпрэзаў за мяжой і прапануем датацыі прадпрымальнікам, якія жадаюць у іх удзельнічаць.

Апрача таго, мы суфінансуем місіі польскіх прадпрымальнікаў на гандлёва-выставачныя імпрэзы ў замежжы з мэтай навязаньня экспартных кантактаў і эканамічнага супрацоўніцтва з замежнымі фірмамі.

Варта таксама падкрэсьліць, што нашы эканамічна-гандлёвыя аддзяленьні пры польскіх амбасадах вядуць пастаянную прамацыйную дзейнасьць у напрамку прапаганды польскіх тавараў і прадпрыемстваў. Яны дапамагаюць навязаць супрацоўніцтва паміж бізнэсоўцамі, дапамагаюць польскім фірмам у дзейнасьці на замежных рынках ці арганізацыі і ўдзеле ў гандлёва-выставачных імпрэзах.

Паводле радыё «Палёнія»
http://www.radio.com.pl/polonia

Аляксандар Кулінковіч: «За год я не напісаў ніводнай песьні па-расейску»

Кулінковіч ня мае канцэртаў, падманвае цэнзуру і Вольскага, а таксама чакае новага альбому. Перад прэзэнтацыяй дыску «Танкі» лідэр «Нэйра Дзюбелю» сустракаўся з фанатамі на пункце БМА пры клюбе філяфаністаў. Справаздача з пытаньняў фэнаў і адказаў.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

— Як вы зрэагавалі на адключэньне сьвятла падчас вашага выступленьня на плошчы Бангалор 21 ліпеня?

— Хто быў — той чуў. Аднак усе гэтыя забароны ня змогуць патапіць ні «N.R.M.», ні «Дзюбель», ні «Drum extasy». Гэта людзі ў гадах і з сувязямі. Не патонуць. Хранова, што з маладымі музыкантамі пачнецца тое ж пасьля закрыцьця «N.C.» ды ўсіх гэтых забарон. Цяпер паслухаеш дэма нейкай групы, а пасьля ідзеш і як у хосьпісе спрабуеш суцешыць. Бо як музыкантам ім жыць засталося максымум год: няма ні пунктаў для рэпэтыцый, ні пляцовак для выступаў. Шанцы на посьпех ёсьць толькі ў тых, хто мае сувязі. Я задарма магу зрабіць тое, чаго маладыя ня могуць і за грошы. Нават спрабавалі адкрыць «Гангрэну прадакшн» для падтрымкі моладзі, але нічога на выйшла. У саміх апошні канцэрт быў 21 ліпеня. У жніўні адмянілі пяць канцэртаў «Нэйра Дзюбелю» ў краіне. Ніхто за нас не бярэцца — баяцца. Кожнага ж ёсьць за што звольніць.

— А што з цэнзурай на канцэртах? Ці прымушаюць прадстаўляць папярэдне тэксты песень, рабіць праслухоўваньні?

— Пакуль не, аднак чаго не бывае… Я магу даць тэкстоўку, выдраўшы вершы з падручніка за шостую клясу, а на праслухоўваньні ні «Нэйра Дзюбель», ні «Палац», ні «N.R.M.» ніхто не зразумее. Такія праслухоўваньні прыніжаюць.

— Чаму ўсе апошнія рок-канцэрты адбываюцца ў «Рэактары»?

— А дзе ж яшчэ? «N.C.» зачынілі ўвесну, а ў к/з «Менск» ніхто ня хоча лезьці. Не ў арэнднай плаце прычына, а ў нежаданьні граць канцэрт у прысутнасьці пяцідзесяці міліцыянтаў у залі, якія ўсаджваюць народ. Адыграў песьню, а табе аплядзіруюць седзячы. Лепш бы ўжо памідорам запусьцілі — натуральная рэакцыя!

Пра «Танкі»

— Калі зьявіцца альбом?

— Спадзяюся, на прэзэнтацыі. Аднак тут мусяць супасьці дзьве рэчы: трэба пасьпець аддрукаваць наклад і ўрэгуляваць адносіны з «West-records» — выдаўцамі кампакту. Наагул, з друкаваньнем дыскаў цяпер складана — замест звычайных пары дзён кружэлкі штампуюцца тыднямі. Так ва ўсіх: во, Лявон нядаўна казаў, што сам ніяк ня можа дачакацца свайго дыску. А з «Вэстам» сытуацыя наступная: на кожным альбоме ў нас ёсьць кавэр, сёлета гэта будзе песьня на верш Аркадзя Куляшова. Аднак каб выдаць кружэлку на афіцыйным лэйбле, трэба ўрэгуляваць аўтарскія правы са сваякамі. Пакуль яны не сьпяшаюцца даваць свой дазвол: «Нейкі жарт, а ня песьня!» Калі нічога ня выйдзе — будзем выдавацца падпольна: «West-records» без дазволу родных Куляшова ня будзе выпускаць дыск.

— Папярэднія альбомы вы называлі цэлай фразай, а гэты — толькі адным словам. Фантазіі бракуе?

— У слове «Танкі», у адносінах да гэтага альбому з боку «Нэйра Дзюбелю» шмат чаго заключана. Галоўнае, што слова на многіх мовах абазначае тое самае. Наагул, «Танкі» — гэта першы беларускамоўны альбом расейскамоўнага гурту. Мы ўсе размаўляем па-расейску, аднак любім сваю Радзіму. Узьнікла нацыянальная ідэя. Нават вокладка альбому, выкананая ў японскім стылі, аказалася бел-чырвона-белай. Я прыфігеў ад усяго, што атрымалася шматзначным у слове «Танкі». А яшчэ, папярэджваючы пытаньне «Чаму так доўга робіцца ўсё?», раскажу прычыну: у апошнія дні дапісваліся новыя песьні. Пасьля «Басовішча» я напісаў дзьве. А яшчэ прымаюць удзел Гюнэш Абасава, Алег Хаменка, Лявон Вольскі. Альбом — найлепшы ў гісторыі «Дзюбелю», а калі казаць па п'янцы — найлепшы альбом у гісторыі краіны. Але ж я цьвярозы, таму не скажу так.

— Ці будуць нейкія бонусы на дыску?

— Анягож! Анечка Вольская прапанавала закінуць туды ўсе беларускамоўныя песьні гурту. У выніку — 17 «танкавых» песень, 5 з ранейшага рэпэртуару («Забі амэрыканца», «Скрыпка», «TUT.BY», «Марскі чалавек» з «Крамбамбулі», «Папараць-кветка»), 5—6 вершыкаў. Яшчэ кліп, фоткі, тэксты песень, поліфанія для мабіл. Дарэчы, на дыску ёсьць песьня, якая мусіць замяніць «Рызінавы дом». Гэта «Жыцьцё маё не фабрычнае», якую мы прымушалі выконваць усіх, хто ўдзельнічаў у запісе.

— Ці зьбіраецеся здымаць кліп?

— Няма сэнсу. «Першы музычны» цяпер прынцыпова ня ставіць у этэр беларускіх камандаў. Толькі не кажыце мне пра «Пераехала камбайнам» — гэта ўжо ня песьня.

— Тады атрымліваецца, што пакуль «НД» «небеларускамоўная» каманда, то і праход у этэр адкрыты…

— Так, а наагул лёс «Першага музычнага» — «J_МОРС». А зьняць чагосьці ўсё ж хочацца…

«Саш, калі кніжкі вернеш?» — «Лявон, не вярну!»

— А з чаго гэта вы так пачалі па-беларуску пісацца?

— Гэта ўсё з часоў «Скрыпкі дрыгвы» на вершы Караткевіча пачалося, аднак праект на выйшаў. Мне тады патэлефанаваў Алесь Суша і сказаў, што ёсьць песьня, якую я мог бы сьпець. У выніку нарадзілася «Папараць-кветка», дзе пяюць Лявон, Корань, Вайцюшкевіч і я. А пасьля прасьпявалі загалоўны трэк. Лявон даў мне тады дзьве кніжкі Караткевіча, якія я яму не вярнуў. Ён мне нават тэлефанаваў, кажа: «Саш, калі кніжкі вернеш?» А я Лявону так і сказаў: «Напрамілы божа, прабач, Лявон, не магу больш цябе падманваць. Не вярну!» Вось так і пачалося. Пасьля знаёмыя людзі выкідвалі з маіх тэкстаў русізмы, цяпер сам змагаюся з гэтым. Ды што змагаюся: за год не напісаў ніводнай песьні па-расейску! Усе разумныя думкі неяк на «мове» прыходзяць.

Наагул, беларускасьць — гэта ня патас, бо я чытаў інтэрвію маладых гуртоў, што казалі: «Дзюбелі» сьпяваюць па-беларуску, а чаму б не паспрабаваць і нам?

«Сьцяг брыгады» па ўкурцы

— У якім стане ваш праект з гуртом «Сівер»?

— Я запісаў песьню для «Сьцяга брыгады» на вершы Куляшова. Мне прыцягнулі ажно 30 вершаў, ад якіх я проста афігеў. Там такія нечаканыя рыфмы! Здаецца, напісана па канкрэтнай укурцы. «Сьцяг» у школе па сёньня выкладаюць, праўда, я яго не чытаў.

— Сёньня Джону Лэнану 64 гады (Сустрэча адбылася 9 кастрычніка. — **С.Т.**). **Што вы будзеце рабіць, калі Вам будзе шэсьцьдзясят чатыры?**

— Ёсьць такая показка: «Пытаньне на мяжы мілініюму: «Вашы пляны на новае тысячагодзьдзе?» — «Большую яго частку я пляную быць мёртвым». Мае асабістыя пляны, калі буду жыць, — займацца тым жа самым. Прынамсі, засталося яшчэ трыццаць два гады.

Запісаў Сяргей Трафілаў

22 кастрычніка ў клюбе «Рэактар» — прэзэнтацыя беларускамоўнай праграмы «Нэйра Дзюбелю» «Танкі». Канцэрт таксама прымеркаваны да 15-годзьдзя гурту. Кулінковіч абяцае шмат сюрпрызаў, прыемнасьцяў і нечаканасьцяў. Некалькі песьняў гурт выканае пад дуду. Сярод гасьцей імпрэзы — музыкі, што ўзялі ўдзел у запісе «Танкаў», — Лявон Вольскі, Алег Хаменка, Гюнэш Абасава. Пачатак у 19.00. Квіткі па 8000 руб. (танцпол), 10000 руб. (столік).

Пра «Нэйра Дзюбель»

«Нэйра Дзюбель» пачаўся раніцай 17 кастрычніка 1989 г., калі мы з шваграм вырашылі заняцца музыкай. Ён умеў іграць на гітары, а я хацеў пасьпяваць. Узяў мікрафончык ад магнітафона бабіннага за 10 рублёў і пачаў галасіць зраньня: «Спать ложусь, никого не боюсь». Як цяпер памятаю, аднак запіс не захаваўся. Дарэчы, на першых часах гурт называлі «Чарапная каробка».

Назву «Нэйра Дзюбель» я ненавіджу. Пару год таму нават насіўся з ідэяй адшукаць новую назву. Вельмі спадабалася «Дзьве на элеватары». Загадкава. Наагул, назоў «НД» узьнік як фалічны сымбаль для гурту. «Сэкс-дзюбель» — пошла, а «НД» — самае тое. Я ж тады з арміяй заяваў, праз гэта часта ляжаў у Навінках. Слова «нэйра» проста перасьледавала мяне! А тут якраз першы гітарыст гурту Агейчык прыходзіць з апэльсінамі, а яму: «Слухай, Чык, а давай назавёмся «Нэйра Дзюбель». Добрая будзе назва». Цяпер я люблю назовы прыгожыя: «Сваякі нябожчыка», «Родныя і блізкія», «Вэлясыпэдыстаў». А «Нэйра Дзюбель» — гэта прымітыўна.

●ДЫСКАГРАФІЯ●

Наша музыка. Крок два

Наша музыка-2, Arlo music, 2004

Хоць хіт-парад «Наша музыка» ўжо каторы месяц знаходзіцца на вакацыях, дыскі пад гэтым даволі ўдалым слоганам выходзяць спраўна. Дык што ж уяўляе зь сябе «Наша музыка»? Гэта траціна беларускамоўных кампазыцыяў (астатнія — па-расейску), гэта на 90% рэпрэзэнтанты попс-рок кірунку. Трэкі падбіраліся з прынцыпу іх радыёфарматнасьці, хоць цяжка ўявіць грувасткія песьні «Таксі», «Стокс» ці гімн заўзятараў салігорскага ФК «Шахцёр» ад «Iq-48» у FM-этэры. На дыску — найлепшыя прадстаўнікі «лёгкага музычнага кірунку»: «J-Морс», «Чэхаў», «Нэо», «Харлі». Прычым усе прэзэнтуюць новыя песьні.

З гледзішча сьвежасьці складанка будзе цікавая яшчэ з паўгоду. Менавіта тут можна пачуць досыць нечаканы твор «Кола» ад «Палацу», які цьмяна нагадвае кагосьці з прадстаўнікоў музычнага нэарамантызму 80-х. Тутсама «Так-цік-так» — чарговая беларускамоўная ад «J-Морс», «Адчыні дзьверы» — звышшлягерная кампазыцыя «Імпэту» ды яшчэ сёе-тое. Такая «Попс-рокманія: чаду!» выйшла.

СБ

Алег Скрыпка. «Відрада»

«Лавіна М'юзык», 2004.

Шматмоўны і разнастайны — ад народных песень, стылізаваных пад рэгі й румбу, да блюзу і рамансу — гэты альбом зьяўляецца своеасаблівым зборнікам улюбёных Скрыпкавых песень. Альбом атрымаў сваю назву «Відрада» («Уцеха») ня толькі дзякуючы аднайменнай аўтарскай песьні з «Хвилей Амуру» (2000), выкананай на дыску ў стылі суфійскай імправізацыі. Уцеха, лічыць сьпявак, — гэта тая мясьціна, дзе не зьнікаюць і не сьціраюцца найлепшыя мэлёдыі, не старэюць самыя прывычныя словы.

У веры адраджэньня гучаць і 11 трэкаў з новага альбому. У ім можна знайсьці французка-цыганскі раманс «Tombe la neige» Сальватора Адамо ды рэгі паводле матываў «Rien de rien» Эдыт Піяф, як і савецкі блюз «Ромашки спрятались». Скрыпкавы інтэрпрэтацыі выходзяць за межы так званых «кавэрвэрсій»: у яго выкананьні вядомыя кампазыцыі набываюць, з аднаго боку, зацятую экспрэсію, уласьцівую яму як рок-музыку, а з другога — унікальную мэлядыйнасьць і пачуцьцёвасьць.

Шчасьлівае слухацкае вуха радуюць «Черемшина», засьпяваная ў стылі блюзу, украінская народная песьня «Ой, у вишневому саду» — у стылі румбы (супэр!) і вядомыя ВэВэшна-народныя «Горіла сосна, палала», «Таємні сфери», «Стривай, паровозе, не грюкайте, колеса» ды новы хіт усіх часоў і народаў «California/Каліфорнія».

І ўмомант паварочвае назад час, вяртаюцца забытыя рытмы, адраджаюцца ў памяці забытыя мэлёды і ўлюбёныя песьні.

Pravda.com.ua

Тэатры

Опэра
23 (сб) — «Баль-маскарад».
24 (ндз) — «Сэвільскі цырульнік».
26 (аўт) — «Аіда».
28 (чц) — «Чароўная флейта».
30 (сб) — «Багема».
31 (ндз) — «Травіята».

Балет
22 (пт) — «Дон Кіхот».
24 (ндз) — «Лебядзінае возера».
27 (ср) — «Эсмэральда».
29 (пт) — «Спартак».
31 (ндз) — «Марная перасьцярога».

Тэатар імя М.Горкага
22 (пт) — «Анджэла і іншыя».
23 (сб) — «Дэтэктар хлусьні».
24 (ндз) — «Амфітрыён».
26 (аўт) — «Вольны шлюб».
30 (сб), **31** (ндз) — «Сунічная паляна».

Новы драматычны тэатар
22 (пт) — «Квадратура кола».

Тэатар эстрады
22 (пт) — «Танцы ў чырвоным».
23 (сб), **30** (сб) — «Клоўны і лялькі».
24 (ндз), **31** (ндз) — «Уся справа ў капелюшы».
28 (чц) — «Эстрадны кактэйль».
29 (пт) — «Белы голуб».
30 (сб) — «Фэст эстраднага танцу».

«Беларускія сэзоны»
25 (пн) — «Танга ўтраіх».
27 (ср) — «Карусэль».

Сучасны мастацкі тэатар
29 (пт) — «Мяшчанскае вясельле».
30 (сб) — «Мы паехалі...».

Тэатар беларускай драматургіі
22 (пт), **23** (сб), **31** (ндз) — «Містэр розыгрыш».
24 (ндз) — «Жанчыны Бэргмана».
26 (аўт) — «Понцій Пілат».
27 (ср), **29** (пт) — «Адэль».
28 (чц) — «Чорны квадрат».
30 (сб) — «П'емонцкі зьвер».

Імпрэзы

Беларускі будаўнічы рынак прапануе
26—29 кастрычніка ў выставачным павільёне на вул.Я.Купалы, 27 адбудзецца 1-я Міжнародная спэцыялізаваная выстава «Будэкспа — восень-2004. Беларускі будаўнічы рынак прапануе».

10 гадоў у Беларусі
З 21 кастрычніка да 15 лістапада ў Музэі гісторыі беларускай літаратуры працуе выстава «10 гадоў у Беларусі». На ёй прадстаўлены працы Польскага інстытуту, паляністыка ў Беларусі, беларусістыка ў Польшчы.

Цяжар сноў Герцага
У кінатэатры «Перамога» да **27 кастрычніка** экспануецца выстава рэстраспэктыўных фатаздымкаў Вэрнэра Герцага «Цяжар сноў». Т.: 223-77-66.

«Indiga»
23 кастрычніка а 12-й гадзіне ў клюбе філяфаністаў у ДК МТЗ (ст.м. «Трактарны завод») адбудзецца сустрэча з гуртом «Indiga».

«Легенды» ў Доме Літаратара
29 (пт), 19.00 — у межах праекту «Легенды Вялікага Княства» адбудзецца канцэрт гурту «Lituus» з праграмай «Полацкі сшытак», «Віленскі сшытак» і іншае». Квіткі: 5000.

Фэст аўтарскай песьні
З 29 да 31 кастрычніка ў Віцебску пройдзе фэст аўтарскай песьні «Акторства старога гораду». Фэст адбудзецца ў кінатэатры «Брыганціна». Т.: (0212) 22-34-97.

Клюбнае жыцьцё

Рэактар (288-61-60, 286-71-07)
22 (пт), 19.00 — канцэрт гурту «Нэйра Дзюбель». Квіткі: 8000 (танцпол), 10000 (столік).

Bronx (288-10-61, «Velcom»: 103 і 105)
21 (чц), 22.00 — D'Jane Uma Junior (Night life laboratories, Kiev).
22 (пт), 22.00 — жывая музыка: Atava.
23 (сб), 23.00 — dj Top, dj Bergamo.

Белая Вежа (284-69-22, 239-16-00)
21 (чц), 22.00 — «White Tower Party»: dj Dee, dj Top, dj Bergamo.
22 (пт), 22.00 — «Дзікае радэо «JetSounds»: dj Arsenti Tchouprina, dj Конь (Кіеў), dj Partyphone (Масква), Юма, U.V.
23 (сб), 22.00 — дыскатэка «Euroclub».
24 (ндз), 22.00 — дыскатэка «Europop»: dj Alex.

Гудвін (226-13-06)
21 (чц), 21.00 — жывая музыка.
22 (пт), 21.00 — жывая музыка: джазтрыё «N.C.».
23 (сб), 21.00 — канцэрт гурту «Маральны кодэкс».

Бліндаж (219-00-10, 671-58-65)
21 (чц), 23.00 — resident dj Egor.
23 (сб), 23.00 — resident dj Egor.
24 (ндз), 23.00 — resident dj Egor.

X-Ray (223-93-55)
22 (пт), 22.00 — dj Noche.
23 (сб), 22.00 — dj Top.

Менская кінаафіша з 22 да 24 кастрычніка

«Аўрора» (253-33-60)
«Хронікі Рыдыка»*** (прэм'ера): **22** (пт) 16.20, 18.40, 20.50.
«Тата»: **22** (пт) 17.00; **23, 24** (сб, ндз) 15.00, 17.00.
«Жыцьцё як цуд»*** («Кінафармат 4х4»): **22** (пт) 18.50, 21.20.
«Самарыцянка»**** («Кінафармат 4х4»): **23** (сб) 19.00, 21.00.
«Фарэнгейт 9/11»*** («Кінафармат 4х4»): **24** (ндз) 19.00, 21.10.
«Берасьце» (272-87-91)
«Кіроўца для Веры»***: **22** (пт) 17.10 (іл); **23, 24** (сб, ндз) 17.10.
«Дзевяць ярдаў-2»: **22** (пт) 19.10 (іл), 21.10; **23, 24** (сб, ндз) 13.10, 15.10, 19.10, 21.10.
«Дружба» (240-90-13)
«Прынц і я»: **22** (пт) 18.00 (іл); **23, 24** (сб, ндз) 18.00.
«Каханьне паводле правілаў... і без»: **22, 23** (пт, сб) 20.00; **24** (ндз) 20.00 (іл).
«Кастрычнік» (232-93-25)
«Хронікі Рыдыка»*** (прэм'ера): **22** (пт) 16.00, 18.30, 21.00; **23, 24** (сб, ндз) 13.40 (іл), 16.00, 18.30, 21.00.
«Масква» (223-27-10)
«Хронікі Рыдыка»*** (прэм'ера): **22** (пт) 16.30, 18.40 (пд), 21.00 (пд); **23, 24** (сб, ндз) 14.20 (іл), 16.30, 18.40 (пд), 21.00 (пд).
«Мір» (284-37-71)
«Паляўнічыя на розум»***: **22** (пт) 18.10, 20.20; **23, 24** (сб, ндз) 16.00, 18.10, 20.20.
«Дунечка»: **22** (пт) 15.00 (сустрэча з творчай групай).
«Адзін прапушчаны званок»*** («Кінафармат 4х4»): **22** (пт) 16.40, 18.50, 21.00.
«Фарэнгейт 9/11»*** («Кінафармат 4х4»): **23** (сб) 16.40, 18.50, 21.00.
«Жыцьцё як цуд»*** («Кінафармат 4х4»): **24** (ндз) 16.40, 18.50, 21.00.
«Перамога» (223-77-66)
«Паляўнічыя на розум»***: **24** (ндз) 13.40.
«Самарыцянка»**** («Кінафармат 4х4»): **22** (пт) 16.20, 18.40, 21.00.
«Жыцьцё як цуд»*** («Кінафармат 4х4»): **23** (сб) 15.10 (іл), 18.00, 21.00.
«Адзін прапушчаны званок»*** («Кінафармат 4х4»): **24** (ндз) 16.20 (іл), 18.40, 21.00.
«Піянер» (227-64-87)
«Вакол сьвету за 80 дзён»: **22** (пт) 12.40, 18.40, 21.00; **23, 24** (сб, ндз) 14.00, 16.20, 18.40, 21.00.
«Цэнтральны» (220-34-16)
«Дзевяць ярдаў-2»: **22** (пт) 11.00, 13.30, 21.00; **24** (ндз) 11.00 (іл), 13.00, 15.10.
«Фарэнгейт 9/11»*** («Кінафармат 4х4»): **22** (пт) 15.50, 18.30.
«Адзін прапушчаны званок»*** («Кінафармат 4х4»): **23** (сб) 11.00 (іл), 13.30, 16.00, 18.30, 21.00.

30 КАСТРЫЧНІКА 19.00
Дом літаратара
Вул. Фрунзе, 5 (пл. Перамогі)
КАСЯ КАМОЦКАЯ
(Новае Неба)
У канцэрце бярэ ўдзел
Алесь Камоцкі
Кошт 7000

«Самарыцянка»**** («Кінафармат 4х4»): **24** (ндз) 17.20, 19.10, 21.00.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)
(пд) — падоўжаны сэанс
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

Для дзяцей

Тэатар юнага гледача
30 (сб), **31** (ндз) — «Папялушка».

Новы драматычны тэатар
23 (сб) — «Новыя прыгоды старых знаёмых».

Сучасны мастацкі тэатар
31 (ндз) — «Усе хлопчыкі — дурні».

Тэатар беларускай драматургіі
23 (сб), **24** (ндз), **30** (сб), **31** (ндз) — «Крышталёвы туфлік».

Кіно
«Аўрора»
«Тайна блакітнай даліны»: **22** (пт) 14.30; **23, 24** (сб, ндз) 13.00.
«Берасьце»
«Чумавая пятніца»: **22** (пт) 15.00 (кіналекторый «Пераходны ўзрост»).
«Ліла і Стыч»: **23, 24** (сб, ндз) 11.30.
«Дружба»
«Зачараваная Эла»: **22** (пт) 14.00; **23, 24** (ндз) 13.00.
«Кевін у краіне Драконаў»: **22** (пт) 12.00; **23, 24** (сб, ндз) 11.00.
«Мір»
«Легенда пра рыцара»: **23, 24** (сб, ндз) 13.00.
«Піянер»
«Плянэта скарбаў»: **22** (пт) 11.00; **23, 24** (сб, ндз) 10.30.
«Скарб»: **22** (пт) 15.00.
«Цімур і яго камандас»: **23, 24** (сб, ндз) 12.15.

КІНАФАРМАТ «4Х4»

Замуруйце Джорджа Буша!

Славутая карціна Майкла Мура зьдзівіць беларускіх гледачоў ня столькі сваімі мастацкімі вартасьцямі і палітычнымі нечаканкамі, колькі Канскай узнагародай. Фільм значна слабейшы за «Боўлінг для Калумбіны», лірычны герой, які прыгадвае сваё дзяцінства й абірае зброю, амаль што адсутнічае. Майкл Мур зьдзекуецца й выкрывае, але выглядае гэта ня так выразна й цікава.

Ладную частку карціны займаюць нудныя фінансавыя пратаколы пра сувязі істэблішмэнту ЗША і Саўдаўскай Арабіі. Нафтавыя спружыны вайны ў Іраку, бадай, будуць адкрыцьцём толькі для амэрыканцаў. Да таго ж, Мур заглыбляецца ў такія падрабязнасьці, якія пасуюць доўгім журналісцкім вышукам, а зусім не кіно, якое было, ёсьць і будзе відовішчам. Выкрыцьці гучаць ня вельмі пераканаўча, але эмацыйна — і эмоцыі гэтыя бедныя ў сваім мастацкім выражэньні.

Джордж Буш-малодшы па праве названы найлепшым камічным акторам: Мур з асалодаю смакуе кадры, дзе Буш — у адсутнасьць дарадцаў — выглядае недасьведчаным дурнем, але назваць гэтыя сцэны вялікай аўтарскай вынаходкай нельга. Мур быццам бы скраў галоўны антыбушаўскі эпізод з сатырычнай перадачы расейца Шандаровіча, дзе Ельцын трымае мхатаўскую паўзу.

Моцныя бакі карціны — расповеды людзей, якія сталі ахвярамі вайны ў Іраку, гарматным мясам: параненыя жаўнеры, маці, якая страціла сына. Чалавечы боль ня можа не працінаць. Мур зьнітоўвае гэтыя споведзі, па-майстэрску пераходзіць ад адной гісторыі да другой.

І ўсё ж такі ў гэтай дакумэнтальнай карціне няма анічога, чаго б раней гледачы ня бачылі ў фільмах Дашука, Рома і Хашчавацкага, — ёсьць толькі актуальная тэма іракцкай вайны і антыбушаўскі імпэт перадвыбарнай кампаніі.

Але вайна калісьці закончыцца, кампанія пройдзе — і фільм Майкла Мура застанецца дакумэнтам у сховішчах гісторыі з цэтлікам ад Канскага фэстывалю.

Андрэй Расінскі

«11 верасьня паводле Фарэнгейта» («Fahrenheit 9/11»)

ЗША, 2004, каляровы, 110 хв.

Жанр: Дакумэнтальны палітычны памфлет

Адзнака: 6 (з 10)

Дзесяць бітваў

Віленскае выдавецтва «Наша будучыня» выпусьціла накладам у 3000 ас. кнігу Міхася Чарняўскага «Дзесяць бітваў». У кнігу ўвайшлі апісаньні найбольш вядомых бітваў з гісторыі Беларусі, у тым ліку Грунвальдзкай, Клецкай, Аршанскай, Хоцінскай і г.д. Кніга багата ілюстраваная выявамі вайскаводцаў, старажытных вояў, схемамі бітваў.

Новая кніга Міхася Чарняўскага

Ашчаджай грошы!

«Нашу Ніву» зь мінімальнай нацэнкай за **550 рублёў** можна купіць у краме УП «Марат». Менск, вуліца Інтэрнацыянальная, 11А, 2-гі паверх. Ад 9 да 17, перапынак ад 13 да 14, тэл. 226-87-99.

КОШТЫ

На платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў) на стар. 16

Рэклямныя расцэнкі:
— да 20 словаў (тэкставы модуль) — 4100 руб.
За кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль)— 4000 руб. Афармленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 кв. см. — 650 руб.
Абвесткі палітычнага характару і ад грамадзкіх арганізацыяў аплачваюцца паводле рэклямных расцэнак для камэрцыйных абвестак.
Каб замовіць платную прыватную абвестку, трэба пераказаць грошы праз пошту на разьліковы рахунак: УНП 101115521. Рэдакцыя газэты «Наша Ніва», вул.Калекатарная, 11. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвэстбанк», код 764.
На зваротным баку блянку паштовага пераказу ў сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» запісваецца дакладна й чытэльна тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і абавязкова дадаецца сказ: «За рэклямныя паслугі».
Даведкі праз т. (017) 284-73-29

Тупая праца

Большасьць новых імігрантаў пачынаюць свой шлях у Канадзе зь цяжкай і некваліфікаванай працы. Мы папрасілі некалькіх чалавек расказаць пра пачатак іх канадзкай біяграфіі. Кожнаму мы задавалі пытаньне: што дапамагала вытрымліваць фізычныя нагрузкі і захоўваць унутраны спакой у цяжкіх або нават невыносных умовах?

Натальля Колас (у Беларусі выкладала ва ўнівэрсытэце ангельскую мову і паралельна працавала мэнэджэрам у офісе):

— На заводзе «Celestica International», дзе я пачала працаваць, вырабляюць пляты памяці для кампутараў. Усе, хто прыходзіў туды, пачыналі з апэрацыі, якая не патрабавала асаблівых ведаў (хаця мінімальны трэнінг быў). Гэта была начная праца, па 12 гадзін, для мяне асабліва цяжкая, бо я раней не працавала на вытворчасьці. Першыя некалькі месяцаў прайшлі ў поўным кашмары, я ледзь разумела, што адбываецца. Работа заключалася ў тым, што нам давалі пляты і мы павінны былі разглядаць іх на працягу 12 гадзін, спрабуючы знайсьці дэфэкты, — і пад мікраскопам, і безь мікраскопа. Гэта вельмі стамляла, некаторыя засыналі, падалі галавой у павелічальнае шкло. Бо праца манатонная, вочы зьліпаюцца, а трэба цэлую ноч сядзець і кудысьці ўглядацца… Мы бавіліся размовамі, сьпявалі песьні, пілі шмат кавы, выходзілі на сьвежае паветра. А ў канцы працоўнае ночы, калі, здаецца, ты павінен хацець спаць найбольш, — усё было наадварот: ты ўжо разагнаў сон канчаткова і таму дома, прыйшоўшы з заводу, зь цяжкасьцю мог заснуць. Ненармальны графік вельмі моцна выбіваў з каляіны, я часам прачыналася ўдзень і не разумела, якая пара сутак, куды мне ісьці і дзе я наагул.

У кожнага былі, напэўна, свае стымулы, каб сябе маральна падтрымліваць. У мяне было жаданьне ўтрымацца ў гэтым жыцьці і дапамагчы маёй дачцэ атрымаць адукацыю тут, каб у яе была пэрспэктыўная будучыня. Я ўвесь час думала пра гэта. І потым, я ведала, што цяжкія часы некалі мінаюць і ня ўсё так кепска. Ня ў самым горшым месцы я працавала, калі разабрацца. Я не падымала цяжараў, працавала не на будоўлі, ня ў брудзе, вакол былі нармалёвыя людзі, мы адно аднаго падбадзёрвалі, і гэта дадавала сіл.

У начной зьмене я працавала 2 гады, але самымі цяжкімі былі першыя месяцаў 6—7. Праз два гады я перайшла ў дзённую зьмену.

Цяпер я тэхноляг вытворчасьці, праца больш цікавая, але ўсё роўна — 12 гадзін у дзень, вельмі дэталёвая работа і вельмі вялікая адказнасьць. Безумоўна, гэта ня тое, чым я марыла б займацца да канца жыцьця. Але я спадзяюся яшчэ нешта зьмяніць у ім.

Вольга Манькоўская (па адукацыі біяхімік, у Менску працавала навуковым супрацоўнікам, потым перайшла ў фірму, дзе «даслужылася» да камэрцыйнага дырэктара):

— Аднойчы агенцтва па працаўладкаваньні накіравала мяне на фабрыку, дзе выпускаюць поліэтыленавыя бутэлечкі. Там мяне прымушалі пазногцем сашкрабаць лішнія кавалачкі плястмасы, што часам наліпалі на горлышка бутэлькі. Пакуль гэтыя «завусеніцы» яшчэ гарачыя, іх можна адкалупаць, і тады бутэлечка становіцца кандыцыйнай. Я адмовілася рабіць гэта пазногцем — сказала, хай мне дадуць нож ці які іншы інструмэнт. Яны пабеглі паклікалі дырэктара, дырэктар таксама крычаў, махаў рукамі, а я сказала, што гэта парушэньне правоў чалавека. На перапынку я пайшла ў прыбіральню — перапынак пяць хвілін, а цэх вельмі доўгі. За пяць хвілін можна толькі дабегчы да дзьвярэй і вярнуцца назад. Натуральна, я трошкі спазьнілася. Яны зноў на мяне наехалі, зноў выклікалі дырэктара…

Карацей, працаваць там было вельмі цяжка. Такі прэсінг увесь час… Як я гэта трывала? Прыедзеш дадому, паплачаш, а назаўтра зноў на працу. А сышла я адтуль таму, што там вельмі шкодная для здароўя вытворчасьць. Яны гэтыя некандыцыйныя бутэлечкі проста ў цэху малацілі, здрабнялі. А калі поліэтыленавы пыл трапляе ў арганізм, ён асабліва шкодна ўзьдзейнічае на ныркі, і праз паўгоду ты ўжо інвалід. Так што я сышла сьвядома, хаця плацілі яны няблага — 10 з паловай даляраў, тады гэта былі шалёныя грошы.

Яшчэ было адно жудаснае месца, я там толькі палову дня вытрымала. Прадпрыемства называлася «Кашэрная ежа». Мы там сасіскі ў цеста загортвалі. Сасіскі даставалі зь лядоўні, яны качаліся па ўсёй бэтоннай падлозе, потым іх палівалі вадой у нейкіх брудных тазіках, каб яны хутчэй адталі, і давалі нам. Трэба было іх хутка-хутка загортваць у цеста і кудысьці там складаць. А ў памяшканьні халадэча, градусаў 5. Нас не папярэдзілі, што працаваць будзем у лядоўні, мы не апрануліся адпаведна. А я замярзаю вельмі хутка, нос імгненна пацёк, даводзілася яго разпораз выціраць тыльным бокам далоні. Прыбегла гаспадыня — як яна скакала, як на мяне раўла! Я кажу: не падабаецца — еж свае брудныя сасіскі сама. І пайшла. Потым усе адтуль пасыходзілі, бо гаспадыня паводзіла сябе мярзотна, усіх абражала. А на наступны дзень у яе не было работнікаў, і агенцтва пачало ўсіх абзвоньваць, усіх клікалі назад, але ніхто ўжо не хацеў да яе ісьці.

> Я кажу: не падабаецца — еж свае брудныя сасіскі сама. І пайшла. Потым усе адтуль пасыходзілі, бо гаспадыня паводзілася мярзотна. А на наступны дзень у яе не было работнікаў, і агенцтва пачало ўсіх клікаць назад.

Ужо забыліся дэталі, на шчасьце…

Такая праца ў мяне доўжылася году паўтара.

Мяне падтрымлівала думка, што гэта ўсё часова. А больш за ўсё мяне падтрымлівала тое, што я ведала: у любы момант, калі я вырашу, я ўсё кіну, забяру дзяцей і паеду ў Беларусь. Але мне трэба было штосьці сабе даказаць… На паўдарозе я спыніцца не магла, трэба было цераз гэта пераступіць.

А цяпер я працую ў аптэцы. Калі на касе, калі таблеткі раскладаю па палічках альбо з пакупнікамі хаджу, паказваю, дзе што знайсьці. У параўнаньні з фабрыкамі і заводамі гэта рай на зямлі…

Напэўна, буду шукаць штосьці па спэцыяльнасьці. Тут вельмі шмат прадпрыемстваў па распрацоўцы і выпуску лекаў. Там, кажуць, умовы добрыя, работа цікавая. Калі б у мяне было моцнае жаданьне, я б, напэўна, даўно паспрабавала. Уся праблема, што жаданьня няма. Усё неяк сіламоц. Маленькую мэту ставіш, дапаўзаеш да яе — што там наперадзе? Фішку перасунулі — і далей папаўзьлі…

Юры Шаўчэнка (па адукацыі інжынэр-электрамэханік, скончыў БІМСГ (Беларускі інстытут мэханізацыі сельскай гаспадаркі, цяперашні БАТУ), у Менску працаваў начальнікам аддзелу ў Аграпраме, потым у камэрцыйных структурах):

— Год і тры месяцы я працаваў у польскай пякарні. Я быў на лініі, дзе вырабляілі круасаны. Праца чаргавалася празь дзень. Спачатку працуеш на ўчастку, дзе цеста месяць: там трэба ўвесь час падымаць і перасоўваць цяжкія чаны на колцах, прычым вельмі хутка, бо цеста месіцца 2—3 хвіліны і адразу ў двух чанах. А кожны другі дзень мы стаялі на канвэеры. Здаравенныя ляпёшкі трэба было класьці на паддон, потым ставіць паддоны на стэляж, а калі ён поўны (а ён вышэйшы за чалавечы рост), — запіхваць яго ў лядоўню.

Працоўны дзень быў з 6 раніцы да 2 дня, а начныя зьмены — з 10 вечара да 6 раніцы. Улетку працаваць даводзілася толькі ў начныя зьмены.

Фізычна я вельмі стамляўся. Я пасьля пякарні паўгоду не працаваў, уставаў раніцай з ложка і ня мог ісьці. Адтаптаў усе пяткі сабе.

А так, у прынцыпе, калектыў быў неблагі. Расейцы, палякі жылі мірна, дружна. Гаспадары нішто сабе былі, яны нам на сьвяты рабілі застольлі, на Каляды падарункі нейкія, улетку часта барбэкю на вуліцы.

Мы прыехалі ў Канаду ў сакавіку, а ў пякарню я трапіў у кастрычніку. Да гэтага часу памяняў дзьве ці тры працы — на адной мяне падманулі, на другой грошы не хацелі аддаваць. А ў пякарні, прынамсі, плацілі рэгулярна. І мне даволі хутка падымалі зарплату — магчыма, таму што я добра працаваў. Я пачаў зь дзевяці даляраў у гадзіну, а сышоў, калі меў дзесяць з паловай. У начныя зьмены плацілі на даляр больш. Пасьля пякарні я зьмяніў яшчэ некалькі месцаў працы, потым набыў маленькі грузавічок і зараз развожу па Канадзе грузы.

Зьміцер Ільяшэвіч (скончыў у Менску Інстытут замежных моваў, выкладаў ангельскую ў школе і мэдінстытуце, потым працаваў у Горадні прадстаўніком амэрыканскай фірмы):

— Я з раніцы вучыўся на курсах, і мне трэба было кудысьці ўладкавацца пасьля абеду, бо грошы надта хутка сплывалі. Па абедзе працы заўсёды менш, так што выбар невялікі. Работа была — упакоўка замарожаных курэй. Гэтыя паўфабрыкаты, што вырабляліся на фабрыцы, трэба было запакоўваць у скрыні. Тэмпэратура на працоўным месцы была як у лядоўні — градусаў 5. Працоўны дзень — восем гадзін, паўгадзіны на абед, 15 хвілін на перапынак. Трэба было вельмі цёпла апранацца, але ўсё роўна за пару гадзін да перапынку замярзаў. На перапынку выйдзеш на вуліцу, сядзеш на лавачку — о-о, як добра! Якраз была вясна, потым лета. Трошкі адагрэешся — і назад у лядоўню. У колькі гэтая праца ацэньвалася, я ня памятаю. Напэўна, трошкі больш, чым мінімалка, — можа, даляраў 8 у гадзіну.

> Работа была — упакоўка замарожаных курэй. Тэмпэратура на працоўным месцы — градусаў 5. Працоўны дзень — восем гадзін, паўгадзіны на абед, 15 хвілін на перапынак. Гэтая праца ацэньвалася трошкі больш, чым мінімалка, — можа, даляраў 8 у гадзіну.

У прынцыпе, гэтая праца надта моцна на мяне ня ціснула. Я такі чалавек, што магу сказаць сабе: я мушу сёньня адпрацаваць 8 гадзін — і працую. У стратэгічным пляне я ведаў, што работа часовая, грошы патрэбныя цяпер, таму трэба брацца за любую працу…

Складана было размаўляць з брыгадзірамі. Яны ўсе былі зь Ямайкі, і мова ў іх спэцыфічная, ямайская — яны гавораць, напрыклад, «aks» замест «ask» і г.д. Нібыта ў мяне і ангельская ня самая кепская, але даводзілася перапытваць увесь час.

У той лядоўні я працаваў месяцы 3—4. Усё скончылася, калі я знайшоў іншую працу — у аэрапорце, выдаваў для новых імігрантаў буклеты, дзе напісана, куды ім ісьці і што рабіць. Праца была і цяплейшая, і аплачвалася нашмат лепей, толькі што нестабільная…

Альбіна Валынец (мае вышэйшую філялягічную адукацыю, працавала ў Чарнігаве бібліятэкаркай):

— Для мяне ўзорам «тупой працы» была праца на канвэеры, на гароднінай базе, дзе я перабірала моркву. Майго мужа звольнілі, я таксама была бяз працы. Пасьля безвыніковых спробаў кудысьці ўладкавацца пачала званіць у расейскія агенцтвы. Толькі ў пятнаццатым, здаецца, сказалі, што ёсьць месца на «моркве». Я была вельмі шчасьлівая, бо грошы ў нас амаль скончыліся.

Праца аказалася цяжэйшай, чым я думала. Канвэер дужа нязручнай вышыні, увесь час стаіш з напалову сагнутай сьпінай, і яна хутка пачынае ныць. Трэба вельмі шпарка сартаваць моркву, адкідаць завялікую, замалую і папсаваную. Сьпіна мучыла жахліва, пра яе нельга было забыцца ні на момант.

Са мной працавалі жанчыны і мужчыны з Украіны і Расеі. Амаль усе яны прыехалі ў Канаду па гасьцявых візах, каб падзарабіць, працавалі нелегальна і таму, натуральна, ня мелі вялікага выбару. Але былі там і сталыя працаўнікі, амаль усе з Альбаніі. Відаць было, што яны там прыжыліся. Яны жартавалі, сьмяяліся — відаць, гэтая праца нейкім чынам ім адпавядала? Я ім у пэўнай ступені зайздросьціла, бо сама адчувала сябе вельмі кепска. Ня памятаю, пра што я думала, стоячы над канвэерам. Здаецца, ні пра што. Спрабавала ўспамінаць вершы, але не пайшло. Тупая праца спараджае тупыя думкі: як пасьпець выхапіць бракаваную моркву ды як ямчэй паставіць нагу, каб менш балела сьпіна.

Тупая праца спараджае тупыя думкі: як пасьпець выхапіць бракаваную моркву ды як ямчэй паставіць нагу, каб менш балела сьпіна.

Я ведала, што праца на канвэеры ня будзе доўгай, і гэтае веданьне пэўным чынам дапамагала мне яе трываць. Але мая «морква» скончылася раней, чым я спадзявалася. Праз два тыдні ў мяне пачалося абвастрэньне артрыту — пачалі балець суставы рук, бо нават у гумовых пальчатках рукі заўсёды мокрыя, а ў памяшканьні базы дзьверы на вуліцу былі ўвесь час адчыненыя, празь іх тудысюды езьдзілі пагрузчыкі. Быў сакавік, ляжаў сьнег…

Празь некалькі дзён пасьля таго, як я кінула «моркву», выпадкова ўладкавалася ў рэстаран мыць посуд. Пасьля канвэеру гэта здалося раем…

Паводле газэты «Беларускае слова» (Таронта)

Жанчыны ў форме

Па тэлевізіі паказвалі Ізраіль, апавядалі пра абавязковую вайсковую службу як для мужчын, так і для жанчын. Праглядаючы рэпартаж, я міжволі лавіў сябе на думцы, як шмат апошнім часам на вуліцах роднага Барысава заўважаў жанчынак у вайсковай форме. І тыя зусім не падобныя на кабет-вайскоўцаў, дакладней, на стэрэатып, што склаўся пра іх. Гэта яшчэ зусім маладыя дзяўчаты, 20—30 гадоў з выгляду, з доўгімі пышнымі валасамі, прыгожай фігурай і добрым манікюрам. Што прымушае гэтых прыгажунь ісьці ў войска? Пэўна, неблагія заробкі. Аднаклясьніца казала мне, што, калі ня знойдзе працы, пойдзе ў армію мэдсястрой. Думаецца, ёй форма была б да твару куды больш, чым некаторым мужчынам-генэралам.

Маю на ўвазе барысаўскага дэпутата палаты прадстаўнікоў Віктара Гумінскага, якога ўсяго некалькі дзён таму бачыў на плошчы 900-годзьдзя Барысава. Ён пазіраваў перад фотаапаратамі мясцовых журналістаў на фоне помніка заснавальніку гораду князю Барысу і Ўваскрасенскага сабору. Пэўна, фатаграфіі пойдуць на перадвыбарныя ўлёткі тав.Гумінскага. Фатографы надзвычай доўга прыводзілі яго ў належную позу, а ў дэпутата ніяк не выходзіла яе прыняць. Добра было відаць, што генэрал ня звыкся пазіраваць перад аб'ектывамі фатакамэр. Тое і ня дзіва: ніводзін дэпутат палаты (апроч знакамітых галадоўнікаў) не надзелены ўвагаю журналістаў. Дый форма на ім неяк ня дужа зграбна сядзіць, заўважыла сяброўка. Людзі на плошчы відавочна не пазнавалі народнага абраньніка. Ня ведаю, ці хацеў бы гэтага сам Гумінскі, бо яшчэ пачнуць чаго прасіць для сябе… А зусім побач ад дэптата, за нейкіх крокаў пяцьдзясят, на лаве сядзіць старая жабрачка — у сваім цэляфанавым пакеце яна перабірае адкіды, каб знайсьці што пад'есьці на сёньня. Дэпутат не зьвяртае на яе ніякай увагі, і мясцовыя «папарацы» пачынаюць рабіць «фота на памяць» для сябе. Маўляў, раскажу ўнукам, як я фатаграфаваўся/фатаграфавалася з дэпутатам.

На гэтай жа плошчы летам бачыў яшчэ аднаго ўплывовага барысаўскага палітыка — Зьмітра Бародку. Мяне заўжды цікавіла, як у яго атрымліваецца сумяшчаць дзейнасьць і ў «Свабоднай Беларусі», і ў «Пяцёрцы+». Як добра ўсім вядома, палітыка — мастацтва кампрамісу. І Бародка гэтае мастацтва засвоіў добра. Яшчэ ў сярэдзіне лета ў Кастрыцы на калодзежах, платах і дзьвярах магазынаў зьявіліся плякаты зь яго выявай і надпісам: «Дмитрий Бародко». Калі ўпершыню я іх убачыў здалёк, то падумалася, што гэта плякаты накшталт «Выйшаў з дому і далейшае месцазнаходжаньне невядомае» або «Ў вышуку асабліва небясьпечны злачынец». Аказался ж — усяго датэрміновая агітацыя. На гэтай падставе акруговая выбарчая камісія і адмовілася рэгістраваць сп.Бародку ў якасьці кандыдата ад Барысаўскай сельскай округі. А ў той сонечны летні дзень Зьміцер выглядаў заклапочаным і відавочна нэрваваўся, чакаючы некага і матляючы кругі па плошчы.

Іншы вядомы барысаўскі апазыцыянэр, у мінулым чэмпіён Беларусі па тэрмінах зьняволеньня ў спэцпрыёмніках з палітычных прычын Аляксандар Абрамовіч вярнуўся ў Барысаў з далёкай эміграцыі, дзе прабыў колькі гадоў. Па шчырасьці, ня ведаю, што там, у Амэрыцы, у яго ня склалася і якія былі прычыны вяртаньня, але відавочна адно — Беларусь вярнула сабе аднаго з самых зацятых ворагаў рэжыму. Артыкулы сп.Абрамовіча з зайдроснай рэгулярнасьцю зьяўляюцца цяпер на старонках «Барысаўскіх навін».

Другая незалежная барысаўская газэта, «Курьер из Борисова», перайшла на выхад з пэрыядычнасьцю два разы на тыдзень замест ранейшага аднаго. Пэўна, да такіх зьмен падштурхнула чытацкая папулярнасьць: калі газэту набываюць, чаму б не пачаць выходзіць часьцей. Афіцыйнае «Адзінства» на сваіх старонках заводзіць трэнас аб тым, што кіяскёры гораду адмыслова не прадаюць іх газэту ахвотным. Пасьля той публікацыі заўважаю, што на шапіках «Белсаюздруку» зьяўляюцца рэклямныя ўлёткі «Адзінства» з анонсам найцікавейшых матэрыялаў нумару. Падобныя рэклямкі «Кур'еру» і «Навін» вісяць па ўсім Барысаве.

Што яшчэ да «Адзінства», то ў будынку гэтай газэты сёлетняй вясной адкрылася першая і пакуль адзіная ў нашым горадзе букмейкерская кантора «Маратон». Філіі «Маратону» зьмешчаны звыш як у 400 гарадох СНД, так там напісана. Барысаўцы, дакладней іх пэўная катэгорыя, зь вялікай ахвотай ставяць свае грошы ў канторы. Натуральна, што часьцей прайграюць, бо немэтазгодна трымаць «кропку», якая не прыносіць дывідэндаў. Хоць, вядома ж, ёсьць і выключэньні — нейкі празорлівы месьціч выйграў на таталізатары 13 млн рублёў. А другі дужа ўдалы гулец пры ўваходзе ў кантору, дзе і напісана БК «Маратон», надрапаў з роспаччу: «Х…ня».

Вось на каго ў тым «Маратоне» можна ставіць з заплюшчанымі вачыма, дык гэта на БАТЭ. Наша каманда з траўня ня ведае горычы паразы і ўпэўнена ідзе на першым месцы. Канкурэнцыю барысаўцам сёлета можа скласьці хіба толькі менскае «Дынама», якое пад кіраўніцтвам гуляючага трэнэра Юр'я Шуканава набрала прыстойны ход. Менавіта на іх дэрбі сабраўся паўнюткі стадыён, тады як на іншыя матчы любімай каманды стадыён запаўняецца добра калі на палову. Яшчэ б некалькі камандаў такога ўзроўню, як БАТЭ і «Дынама», — і народ зноў дружна пайшоў бы на стадыёны.

На Алімпійскіх гульнях у Атэнах сярод 150 нашых атлетаў ад Барысава былі толькі 2 спартоўцы. Адна зь іх — Юлія Аліпава ў кулявой стральбе, якую «Белорусская газета» несправядліва залічыла ў стан легіянэраў; прычынай тут, мабыць, тое, што Юліін муж у Атэнах выступаў за Расею ў стэндавай стральбе і нават узяў першы залаты мэдаль усходніх суседзяў на Алімпіядзе. Другі ж прадстаўнік Барысава — Міхаіл Аўдзееў, які выступаў у спаборніцтвах цяжкаатлетаў у супэрцяжкай вазе. І Аліпава, і Аўдзееў засталіся далёка ад п'едэсталу, але, у прынцыпе, на іхнія мэдалі ніхто і не разьлічваў, апроч, вядома ж, саміх спартоўцаў і іх родных.

Хацелася яшчэ напісаць шмат пра што — пра вар'ятку Рыту і пра бесхацінца Сену, пра цыганоў, азэрбайджанцаў, якія жывуць у самых старых будынках Старога гораду, — але пра тое як-небудзь пасьля.

Зьміцер Панкавец, Кастрыца

P.S. А жанчына ў вайсковай форме — гэта ж так эратычна!

Жыцьцё Барысава — з прысмакам мілітарнасьці. І ня толькі з-за блізкіх Печаў. На здымку: танк Т-72 вяртаецца на плятформу пасьля ваеннага параду на цэнтральнай плошчы Барысава.

Аляксандар Ворвуль

Слоўнік скептыка

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Гадаваньне — выхаваўчы працэс, на пачатку якога дзіця вучаць гаварыць, а напрыканцы — маўчаць.

Гадзіньнік — рэч, на якую даводзіцца глядзець кожны раз, калі няма калі.

Газаправод «Саюз» — месца, празь якое Расея выпускае газ.

Галоўнакамандуючы — чалавек, гатовы ахвяраваць вашым жыцьцём дзеля бацькаўшчыны.

Галянтнасьць — гэта калі помніш дзень нараджэньня жанчыны, але ня помніш яе ўзросту.

Гамбургер — сумесь мяса, хлеба, гародніны і сурвэтак, мала адрозных на смак.

Гарантыя міру — гэта калі сякера вайны закопваецца разам з ворагам.

Гарбата — суп вэгетарыянца.

Гармата — мэханізм удакладненьня дзяржаўных межаў.

Гармонія — гэта калі пажаданае супадае зь непазьбежным.

Гарэлка — вадкасьць, якая можа ператварыць чорны сум у белую гарачку.

Гаспадыня хатняя — доказ існаваньня дзікай.

Гасьціннасьць — здольнасьць затрымліваць госьця так, каб не перашкодзіць яму сысьці.

Гемарой — хвароба, вартая сьвечак.

Генэратар выпадковых лічбаў — адзіны спаборнік жаночай лёгкі.

Генэтык — чалавек, які марыць зрабіць з мухі слана.

Герой — самая кароткая прафэсія ў сьвеце.

Герой Савецкага Саюзу — чалавек, які можа лячыцца бясплатна.

Гінэколяг — чалавек, які ня можа жыць без жанчын.

Гіпапатам — доказ таго, што і ў бога ёсьць пачуцьцё гумару.

Гісторык — фантаст, які апісвае мінулае.

Глёбус — магчымасьць ахапіць увесь сьвет.

Глюк — гэта калі кампутар гуляе з вамі, а не наадварот.

Гоншчык — чалавек, якому адной машыны можа хапіць да канца жыцьця.

Госьці — гэта калі мама сьмяецца з жартаў таты.

Граблі — самая недарэчная з прычын сьмерці.

Грамадзтва — калектыўная няшчырасьць.

Грошы — зло тым большае, чым іх менш.

Грэх — учынак, які дапамагае заснуць сном праведніка.

Густ дрэнны — найлепшы спосаб абыходжаньня з драпежнікамі.

СУЧАСНЫЯ САГІ

Дзікі і вайскоўцы

На тактычных вучэньнях салдаты Н-скай часьці выкапалі ў лесе акопы-засады і чакалі гадзіны Х, калі раптам у акоп бухнулася дзікае парасё! Перапалохалася само і напужала засаднікаў. А найбольш іх настрашыла сьвіньня, што кідалася вакол акопу. Адзін зь іх не зьбянтэжыўся і стрэліў па ёй з ракетніцы. Але сыгнальная ракета, ударыўшыся аб шчэць, адскочыла. Другі здагадаўся: злавіў рукамі парсючка ды проста шпурляну таго ўпрочкі. Дзічынае сямейства рушыла прэч.

Любяць беларусы дзікоў!

Тэлехваляваньне

Адной старой цётцы ў непагодлівую ноч нехта патэлефанаваў. У слухаўцы ёй чуліся енкі ды стогны, прычым голас быў вельмі падобны на мужаў. А муж акурат нядаўна як памёр. Удава кінула слухаўку. Тэлефон зазваніў зноў, і там ізноў той голас. Пасьля яшчэ раз… Удава цэлую ночку ня спала, а на раніцу паехала на могілкі. І што вы думаеце? Тэлефонныя драты ад моцнага ветру абарваліся і апалі на магільны курганок мужа.

Гісторыі аб прывідах абнаўляюцца: сучасныя прывіды ня толькі зьяўляюцца перад чалавекам, але і выкарыстоўваюць найнавейшыя дасягненьні тэхнікі.

Бабулін падарунак

На гомельскі паштамт завітала старая. Ейны ўнучак акурат сьвяткаваў у Гародні свае народзіны, а яна забылася загадзя адправіць яму віншавальны ліст. Бабуля прынесла з сабою заклееную капэрту і спытала ў апэратарак, ці магчыма, каб унучак атрымаў пасланьне яшчэ сёньня. Ёй растлумачылі, што гэта немагчыма. Але пры гэтым прапанавалі дастаць ліст з капэрты і перадаць яго ў Гародню пры дапамозе факсімільнай сувязі. Старая пагадзілася. Калі апэратарка ўставіла ліст у факс, бабуля дастала з капэрты і 50 даляраў, якія меркавала падарыць унуку. Апэратарка за грошы і прапускае купюру праз факс. «Паглядзіце, — сьмяецца з бабулі, — ваш унук ня хоча браць грошы: банкнота вяртаецца назад!» А старая на тое: «Такі ён у мяне сьціплы!.. Але засунь ты, дзетачка, яе зноўку. Няхай возьме бабін падарунак!»

«Пасьмейся зь няўмекі, ды не чыні зьдзекі», — цьвердзіць беларуская прымаўка.

Спужанасьць Парыжам

Два віцебскія падлеткі паехалі ў «Эўрадыснэй», селі ў вагончык атракцыёну «Чыгунка прывідаў» і больш іх ніхто ня бачыў. Жахоцьце!

Раней царкоўнікі дэманізавалі скамарохаў, сёньня жахі прадукуюць Мікі Маўс з Дональдам Дакам. Глябалізацыя!

Сяргей Балахонаў

ФЭЛЬЕТОН

Навука паважаць

Надышоў час дакладна вызначыць паняцьце «дэмакратыя» і нашы арыенціры ў яе будаўніцтве. Гавораць, што «дэмакратыя ёсьць улада народу, для народу і праз народ». Але хто можа прадстаўляць народ? Зразумела, ня кожны з нас, які можа аказацца філіяй замежных выведак. Увасабленьнем народу можа быць толькі выключная асоба, якой у Беларусі зьяўляецца наш прэзыдэнт. Толькі ён можа агучваць нашы імкненьні, толькі выказваючы падтрымку яму, мы можам насіць гордае імя народу. Мы ня можам, зразумела, узьняцца да ягонай велічы, але можна навучыцца паважаць свайго лідэра. Каб стаць вартымі яго, трэба засвоіць наступнае:

1) прэзыдэнт — не прыватная асоба, а калектыўны розум народу, таму зь ім не сумяшчальнае паняцьце «культ асобы»;

2) ня меншай павагі заслугоўваюць прызначаныя прэзыдэнтам начальнікі. Нельга думаць, што прэзыдэнт можа быць добрым, а прызначаны ім начальнік — дрэнным. Абражаць начальнікаў — хоць у думках — усё роўна, што абразіць Самога! Асабліва трэба пазьбягаць так званых «анэкдотаў», якія могуць быць атрутнай зброяй замежных цэнтраў. Нельга забываць, што празьмерная цярплівасьць да анэкдотчыкаў загубіла Савецкі Саюз;

3) звычайнай прычынай незадаволенасьці зьяўляюцца так званыя «эканамічныя праблемы». Найлепшы сродак ад іх — яшчэ больш згуртавацца вакол кіраўніка дзяржавы. Ня варта забывацца, што празьмерная эканамічная заклапочанасьць сэрбаў загубіла братні рэжым Мілошавіча, у той час як народам Паўночнай Карэі і Кубы любоў да правадыроў дапамагае пераадольваць часовыя эканамічныя цяжкасьці. Таму трэба адкідаць усялякія чуткі, быццам мы дрэнна жывём. Зусім нядрэнна! І гэта могуць засьведчыць і наш прэзыдэнт, і блізкія яму людзі.

Улічваючы ўсё вышэйсказанае, прапануем:

1) замяніць сыстэму выбараў у нашай рэспубліцы сыстэмай прызначэньняў. Паколькі відавочна, што народ хоча бачыць на пасадзе прэзыдэнта толькі дзейнага кіраўніка дзяржавы, трэба даць кіраваць яму столькі, колькі яму будуць дазваляць здароўе і сілы. Толькі прэзыдэнт можа назваць свайго будучага пераемніка. Толькі ён можа прызначаць на ўсе пасады — ад акадэміка да старшыні сельсавету;

2) партыі і так званыя «незалежныя грамадзкія арганізацыі» калі і могуць існаваць у нас, то толькі на ўзроўні аб'яднаньняў філятэлістаў і аматараў кветак;

3) усялякія не арганізаваныя законнымі ўладамі мерапрыемствы трэба адразу спыняць, а да іх арганізатараў ставіцца як да крымінальных злачынцаў;

4) ні ў якім разе нельга даваць слова так званаму «сумленьню нацыі» — народным пісьменьнікам і акадэмікам. Гэта, урэшце, недэмакратычна. Чым яны лепшыя за простых калгасьнікаў?

5) неабходна радыкальная перабудова сыстэмы абароны. Павінна быць выпрацавана наступальная сыстэма. Нельга чакаць, пакуль агрэсары з NATO самі прыйдуць да нас. Але нельга абмяжоўваць паняцьце «дзяржаўнай абароны» толькі ваенным аспэктам. Неабходна стварэньне шматлікіх прапагандысцкіх службаў, якія будуць тлумачыць насельніцтву палітыку дзяржавы. Іх утрыманьне, як і супрацоўніцтва з органамі дзяржбясьпекі, павінна стаць ганаровым абавязкам кожнага грамадзяніна.

Прафэсар Вагулаў, дацэнт Карчмар, журналіст Качка
Пераклаў Усяслаў Шатэрнік



У часе тэлетрансьляцыі паўфіналу Кубку Дэвіса, дзе беларусы змагаліся з амэрыканцамі, многія гледачы заўважылі на трыбунах стадыёну бел-чырвона-белы сьцяг. Узьнялі яго ў Чарлстане маладыя эмігранты Андрэй Благаў і Алесь Зайцаў. Пад тым самым сьцягам хлопцы зьняліся зь беларускімі тэнісістамі, пра што й распавялі ў перадачы радыё «Свабода». Праз яго супрацоўнікаў мы выйшлі на сувязь з суайчыньнікамі і атрымалі фатаздымкі.

КАІСА

«Вясьнянка» ў дзясятцы

Гэта было пад Ізьмірам, у Турцыі. У першых чыслах кастрычніка тры тузіны шахматных клюбаў змагаліся за гонар звацца наймацнейшымі ў Эўропе. Менская «Вясьнянка» ў складзе Сяргея Азарава, братоў Жыгалак, Юр'я Ціханава, Андрэя Малюша і Міхаіла Гінзбурга заняла 10-е месца. У параўнаньні зь леташнім клюбным першынством Эўропы — прагрэс у некалькі пазыцый. На жаль, ня выехала ў Турцыю другая па сіле беларуская каманда «Вэктар». Дый на падарожжа вясьнянкаўцаў грошы было знайсьці няпроста. Кіраўніцтва Беларускай фэдэрацыі шахмат у роспачы з прычыны абвешчанага сыходу старшыні суполкі, бізнэсоўца Канстанціна Іванова — «хто ж будзе нас фінансаваць?» Трэба аддаць належнае імпэтнаму дзядзьку Ўладзімеру Гінзбургу, адказнаму за работу з клюбамі, — безь яго клопату наўрад ці «Вясьнянка» дабралася б да Турцыі. Цяпер у Ізьміры ведаюць пра піва «Аліварыя», балазе яго жывой рэклямай папрацавалі нашы шахматысты (былі адзеты ў майкі з адпаведным надпісам).

Усе вясьнянкаўцы набралі мінімум 50% ачкоў у сваіх гульнях, а Андрэй Жыгалка стаў бронзавым прызэрам на сваёй дошцы (5 ачкоў з 7). Неўзабаве ён атрымае ад ФІДЭ званьне міжнароднага гросмайстра. Вынік нашай зборнай мог аказацца яшчэ лепшым, калі б да яе далучыліся гульцы накшталт выхаванца кобрынскай шахматнай школы, гросмайстра Аляксея Аляксандрава. Апошні, аднак, выступае ўсё часьцей за пэрыфэрыйныя расейскія клубы. У слове «пэрыфэрыйнасьць» няма зьнявагі: за каманду Екацерынбургу, напрыклад, поруч з Аляксандравым выступаў сам Гары Каспараў.

* * *

Зь Ліды прыйшла сумная навіна: памёр Андрэй Сяргей. Цягам некалькіх гадоў на яго энтузіязьме трымаліся шахматныя спаборніцтвы ў Шчучыне дый на ўсёй Гарадзеншчыне. Марыў пра адкрыцьцё ў Шчучыне шахматнага клюбу, хадзіў з гэтай ідэяй па «высокіх кабінэтах», спрабаваў балятавацца ў мясцовы савет. Калі яго мара зьдзейсьніцца, няма сумневу, што шчучынскі клюб будзе насіць імя А.Сяргея.

Як бы вы згулялі?

С.Азараў — Г.Каспараў, Турцыя, 2004.

Коштам трох пешак белыя дабіліся актыўнай пазыцыі. Як скончыцца гульня?



Адказ: унічыю. У партыі было 1. Фf7 Фd1+ 2. Крf2 Фс2+ 3. Крe3 Сc5+, і чорныя могуць вечна пераследаваць белага караля.

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

Падарожжа для чытачоў

«НН» запрашае ў вандроўку па Астравеччыне 24 кастрычніка. Бясплатнае месца ў турыстычным аўтобусе атрымае чытач, які першы затэлефануе ў Рэдакцыю між 9.00 і 10.00 у пятніцу. Выезд зь Менску. Т.: 284-73-29, 613-32-32, 707-73-29.

ФУТБОЛ

ДЮСШ «Тарпэда» па футболе (Менск, вул.Украінская, 5, ст.м. «Аўтазаводзкая») праводзіць набор хлопчыкаў 1992/93 і 1996/97 г.н. Трэнэр Кушнер Алесь. Даведкі па тэлефоне: 8-029-756-81-99, 253-88-02 (з 20.30 да 21.30)

КАМПУТАР

Прадаю кампутар Cyrix-200/128/4Gb/2Mb/52x/FDD/K/m+USB-85, манітор 14'-40. Т.: 8-029-553-97-34

ПАКОЙ

Здыму пакой (пажадана ў Чыжоўцы). Т. (у Барысаве): (8-01777) 576-69

Беларускамоўны студэнт БДУ здыме пакой у Менску. Т.: (8-02235) 298-46

ПРАЦА

Прыстойны, сумленны хлопец 16 гадоў шукае падпрацоўку. Разгледжу ўсе прапановы. Калі ласка, патэлефануйце: 8-029-557-28-83, Сяргей

Павал Севярынец шукае працу ў Менску. Грамадзкі мэнэджмэнт. Адукацыя. Публіцыстыка. Т.: (8-0212) 21-45-31

Ангельская мова: рэпэтытарства, кантрольныя й пераклады. Зьвяртайцеся на тэл.: 765-46-07 альбо 216-81-76. Раман (4 курс МДЛУ)

Запрашаем у вандроўку

Варшава часоў «Салідарнасьці»

Т.: 661-30-38, 202-23-38 (Алена), 755-03-70 (Зьміцер).
Кошт: 25 у.а. + віза.

Запрашаем у падарожжа

24 кастрычніка: «Па Астравеччыне»

Міхалішкі — касьцёл XVII ст.
Быстрыца — касьцёл XVIII ст.
Тракенікі — сядзіба мастака М.Богуша-Шышкі.
Варняны — касьцёл XVIII ст., вежа на востраве, адзіны ў Беларусі помнік Чапаеву.
Астравец — касьцёл XVIII ст.
Цана — 25000.
Т.: 222-88-76.

Запрашаем у падарожжа

24 кастрычніка (нядзеля)
па маршруце: Менск—Сынкавічы—Слонім—Альбярцін—Ружаны—Косава—Менск. Цана 21000 руб.

31 кастрычніка (нядзеля)
Полацак—Лагойск. Цана 20000 руб.

Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер), 264-12-38, 776-24-35 (Павал).

30 кастрычніка



Мір—Навагрудак

Раніцай 30 кастрычніка мы запрашаем Вас у **лягер рыцараў**, дзе Вы зможаце ўбачыць двубоі і адчуць сябе вояром ці чароўнай пані.
Навагрудак, дзе на працягу стагодзьдзяў жылі людзі розных веравызнаньняў.
Увечары 30 кастрычніка запрашаем на **габрэйскае сьвята** праводаў суботы, дзе Вы дакранецеся да тысячагадовае габрэйскае традыцыі.
Самыя цікавыя і таемныя скарбы былое сталіцы Вялікага Княства.
Кошт вандроўкі: 35000.
Т.: 222-88-76.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

В.Г-бу-Я-аму зь Менску. Аналіз заявлікі і занадта глябальны для газэты. Такія тэксты трэба публікаваць у часопісах і сабранымі ў асобную кніжку. Прапануйце ў часопіс. Натуральна, з Вашымі высновамі можна спрачацца.

Асмадэю К. зь Менску. Хлёсткі, цікавы погляд, зь якім яшчэ трэба працаваць — прыбраць залішнюю эмацыйнасьць, уласьцівую інтэрнэт-форумам, школьніцкае перадражніваньне імёнаў уласных і г.д., каб выказаныя Вамі думкі выразьней прачыталіся. Чакаем перапрацаванага.

Івану Ф. з Мухаўца. Такіх, як Вы, каму недаспадобы акварыюмнае існаваньне, большасьць. Вы пабачыце гэта, калі ў краіне ўзьнікне рэвалюцыйная сытуацыя і Вы таксама выйдзеце на плошчу сталіцы.

НЯ РЭЖЦЕ ГАЗЭТУ!

Увага! Цяпер прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
галоўны рэдактар Андрэй Дынько
фотарэдактар Арцём Лява
карэктарка Настасься Мацяш
нам. галоўнага рэдактара Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар Андрэй Чык
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Менск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.
E-mail: nn@promedia.by
On-line: www.nn.by

© **НАША НІВА**.

Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 3489. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 21.00 20.10.2004.
Замова № 6434.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а